А. М. Змушко С. У. Тарноўская

# Беларуская мова
# Літаратурнае чытанне 7

Частка 1



А. М. Змушко
С. У. Тарноўская

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

# ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ

**Вучэбны дапаможнік для 7 класа
першага аддзялення дапаможнай школы
з рускай мовай навучання**

**У дзвюх частках**

**Частка 1**

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2016

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

УДК 811.161.3(075.3)
ББК 81.411.3я72
З-69

Рэцэнзенты:
кафедра сучаснай беларускай мовы
філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры *З. І. Бадзевіч*);
настаўнік беларускай мовы вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы
адукацыі «Дапаможная школа-інтэрнат № 5 г. Гомеля» *Л. І. Данільчанка*

## Умоўныя абазначэнні

‖ — правіла

?! — пытанні і заданні

* — заданні павышанай складанасці

— вучыцеся весці размову

— тлумачэнне слоў

— пераклад

— дамашняе заданне

*утýльна* — слоўнікавае слова

*Папярэдняе выданне выйшла ў выдавецтве «Народная асвета» ў 2002 годзе.*

**ISBN 978-985-553-369-7 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-553-368-0**

© Змушко А. М., 2002
© Змушко А. М., Тарноўская С. У., 2016, са змяненнямі
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2016

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## ПАЎТАРЭННЕ

### *Урок 1. Мовы-сёстры*




**1.** Выразна прачытайце верш.

**За навуку**

Скончыліся, дзеці, вашы гульні
Каля светлай рэчкі, каля пуні,
І на жоўценькім пясочку,
І ў зялёненькім лужочку.

Пахавайце вуды, стрэлы, лукі,
Прыступайце, дзеці, да навукі,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Каб было ўсё акуратна,
Каб вучыцца на «выдатна».
*(Паводле Якуба Коласа)*

**Пу́ня** — вялікая халодная будыніна для захоўвання сена.
**Лук** — ручная зброя ў выглядзе гнуткай дугі, сцягнутай цецівой, прызначаная для пуску стрэл.

?! Пра што нагадвае дзецям Якуб Колас? Знайдзіце ў вершы і прачытайце, якія парады дае народны паэт Беларусі.
Які з радкоў верша з'яўляецца яго асноўнай думкай? Чаму? Запішыце другі слупок у сшытак.
* Які знак прыпынку вы паставіце ў канцы выказвання? Абгрунтуйце свой адказ.
Якія дзве мовы вы вывучаеце ў школе? Назавіце словы з гэтага верша, што падобна гучаць і ў рускай, і ў беларускай мовах.

**2.** Прачытайце тэкст.

## Першы ўрок

Прыйшоў верасень. Вучні сабраліся ў школу. Яны ўзрадаваліся пачатку навучальнага года.

Вось дзеці спяшаюцца ў клас. Як тут светла і ўтульна! Звініць званок. Уваходзіць любімая настаўніца. Пачынаецца першы ўрок.

***уту́льна***

**Уту́льна** — *рус.* уютно.

?! У які дзень адбываецца дзеянне? Які настрой у вучняў? Чаму?
Запішыце тэкст у сшытку. Звярніце ўвагу на тое, пасля якіх літар (зычных ці галосных) пішацца ***ў*** , а пасля якіх ***у***.
Прачытайце правіла. Вымаўляйце словы з ***ў*** адпаведным чынам.
Ці ёсць такі гук у рускай мове? Знайдзіце іншыя гукі ў тэксце, якіх у рускай мове няма.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Успомніце!*
У беларускай мове ёсць літара **ў**, якая пішацца толькі пасля галосных. Гук **[ў]** вымаўляецца скарочана: *падарав**аў** пашт**оў**ку, пачак**аў** сябр**оў**ку, намаляв**аў** **аў**тобус.*

**3.** Уважліва прачытайце спалучэнні слоў. Адзначце і запішыце толькі тыя з іх, якія спатрэбяцца вам пры стварэнні дыялога пра летні адпачынак.

Купаўся ў возеры, катаўся на лыжах, гуляў у футбол, чытаў кнігі, збіраў грыбы і ягады, хадзіў па лесе, ездзіў да бабулі ў вёску, адпачываў у лагеры.

?! Карыстаючыся правілам, праверце, ці правільна вы запісалі словы з **ў**. Растлумачце, чаму запісалі менавіта так.

Перакладзіце спалучэнні слоў на рускую мову. Якія словы гучаць амаль аднолькава?

Раскажыце адзін аднаму паводле ўзору пра тое, чым вы займаліся летам, ужываючы выразы, якія запісалі ў сшытак.
Звярніце ўвагу на абавязковае ўжыванне ў дыялогу этыкетных слоў, што выдзелены ва ўзоры.

Узор.

— ***Прывітанне***, ... ! *Я вельмі рады (рада) бачыць цябе зноў. Раскажы мне,* ***калі ласка***, *як ты правёў (правяла) летнія канікулы.*

— ***Дзень добры***, ... ! *Я таксама рады (рада) бачыць цябе. На канікулах я ..., ..., ... .*

— *О, як добра! А я ўсё лета ..., ..., ... .*

— *Гэта вельмі цудоўна!*

**4.** Прачытайце верш, звяртаючы ўвагу на вымаўленне выдзеленых спалучэнняў літар.

Раніцою зала**ці**стай
У клас мы радасна і**дзё**м.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Там утульна, светла, **чы**ста...
Школа — наш любімы дом.
*(Янка Журба)*

?! Прачытайце пераклад верша на рускую мову. Якія словы ў рускай і беларускай мовах гучаць па-рознаму, а якія — падобна?



Этим утром золо**ти**стым
В класс мы радостно идём.
Там светло, уютно, **чи**сто...
Школа — наш любимый дом.

Выпішыце з верша словы з выдзеленымі спалучэннямі літар. Падбярыце да кожнага слова пару ў вершы, перакладзеным на рускую мову, паводле ўзору. Параўнайце гучанне і напісанне гэтых слоў у рускай і беларускай мовах.

Узор. *Залацістай — золотистым, ... .*

**5.** Прачытайце тэкст.

## У школу

Сёння Паўлік прачнуўся рана. Яснае вераснёўскае сонца глядзела ў акно. Хлопчык паснедаў, сабраўся ў школу і выйшаў з дому. Па вуліцы з кветкамі крочылі вучні. Родная школа зноў паклікала іх за парты.

?! Спішыце, звяртаючы ўвагу на правапіс ***ў***.
Падкрэсліце ***ў*** разам з папярэдняй галоснай літарай.

Узор. *Сёння Паўлік прачнуўся рана.*

* Знайдзіце ў гэтым тэксце адметныя рысы беларускай мовы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 2. Зычныя дж, дз, спалучэнне зычных шч*

**6.** Прачытайце тэкст. Растлумачце сэнс слова *Радзіма*.



Радзіма — гэта месца, дзе мы нарадзіліся і жывём. Кожны чалавек шануе тое месца, дзе ён з’явіўся на свет. Любіць родныя лясы і палі, рэкі і азёры. Любіць свой народ, яго дзівосныя песні, казкі, легенды.

**Леге́нда** — народнае апавяданне аб якой-небудзь гістарычнай падзеі, асобе, якое выдаецца і ўспрымаецца як верагоднае.

?! Звярніце ўвагу на тое, як вымаўляецца спалучэнне ***дз***. Назавіце галосныя літары, што пішуцца пасля яго.

* Прыдумайце працяг сказа і запішыце яго ў сшытак.

Узор. *Я ўдзячны сваёй краіне і свайму народу за тое, што ..., ..., ... .*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**7.** Прачытайце верш. Што мае на ўвазе аўтар пад словамі «багацці Радзімы»? Падумайце, як вы можаце памножыць багацці нашай роднай Беларусі.



***здзіўля́ць***

Багацці Радзімы народ памнажае:
Будуе дамы і алеі саджае,
Увосень здзіўляе буйным ураджаем
Ды звонкаю песняю свет абуджае.

*(Святлана Рыжкова)*

**Абуджа́ць** — напаўняць гукамі, галасамі, парушаць спакой.

***ураджа́й***

?! Правільна вымаўляйце склады з зычнымі гукамі **[дж]** і **[дз]**. Які з іх гучыць цвёрда, а які — мякка? Ці ёсць такія гукі ў рускай мове? Якія галосныя надаюць мяккасць зычным гукам? Назавіце іх. Успомніце правіла пераносу слоў з ***дж*** і ***дз***. Запішыце верш, падзяляючы словы з зычнымі ***дж*** і ***дз*** на склады для пераносу.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**8.** Прачытайце спалучэнні слоў. Звярніце ўвагу на вымаўленне складоў са спалучэннем ***шч***.

**Шч**аслівае дзяцінства, Белавежская пу**шч**а, пло**шч**а Перамогі, радзіма нашых пра**шч**ураў.

**Пра́шчуры** — далёкія продкі, родапачынальнікі.

Перакладзіце словазлучэнні на рускую мову паводле ўзору.

Узор. *Шчасліваε дзяцінства* — *счастливое детство*, … .

Якія літары ў рускай мове пішуцца замест беларускага спалучэння ***шч***? Якія са слоў сугучныя з перакладам на рускую мову, а якія гучаць зусім інакш?

Карыстаючыся правілам, падзяліце на склады для пераносу словы з зычным ***дз*** і спалучэннем зычных ***шч***. Падбярыце да слова *радзіма* падобныя па значэнні словы.

*Успомніце!*

Словы пераносяцца з аднаго радка на другі па складах.

Слова з аднаго склада нельга падзяліць для пераносу: *суп, рыс*.

Адну літару не пакідаюць на радку і не пераносяць на другі радок: *ма-люю, агу-рок.*

Літары ***й, ў, ь***, а таксама апостраф застаюцца на радку з папярэдняй літарай: *лаў-ка, зай-ка, буль-ба, аб’-езд.*

Словы з дзвюма аднолькавымі літарамі, што размешчаны побач, пераносяцца так: *ноч-чу, мяк-кі, на-сен-не, мо-лад-дзю,* або так: *но-ччу, мя-ккі, на-се-нне, мо-ла-ддзю.*

***Дз, дж*** пры пераносе не раздзяляюцца: *мя-дзведзь, ура-джай.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**9.** Прачытайце верш. Спішыце тэкст, падзяляючы словы на склады для пераносу.

**Я жыву ў Беларусі, дзе азёры і лясы.**
**Тут у нас гняздзяцца гусі і гамоняць верасы.**
*(Паводле Еўдакіі Лось)*

?! Да выдзеленага слова падбярыце роднасныя словы і запішыце ў сшытак паводле ўзору.

**гняздзíцца**

Узор. *Беларусь* — ..., ... .

З якой літары (малой ці вялікай) вы напісалі слова *Беларусь*? Чаму менавіта так?
Як падзяляюцца на склады для пераносу словы з верша са спалучэннем літар ***дз***?
Які месяц восені нагадвае вам назву гэтай расліны?

**Ве́рас** — нізкая вечназялёная кустовая расліна з дробным лісцем і лілова-ружовымі кветкамі.



**10.** Прачытайце тэкст.

## Дарога ў космас

Яшчэ школьнікамі нашы землякі, касманаўты Пётр Ільіч Клімук, Уладзімір Васільевіч Кавалёнак і Алег Віктаравіч Навіцкі, навучыліся перамагаць цяжкасці, загартоўвалі волю. Яны старанна вучыліся, любілі працаваць. Гэта дапамагло ім дасягнуць мэты — пабываць у космасе.

?! Пра што цікавае вы даведаліся? А ці старанна вы вучыцеся, ці любіце працаваць?

Прачытайце імёны, імёны па бацьку і прозвішчы касманаўтаў-беларусаў. Як яны будуць гучаць па-руску? Запішыце ў сшытак імёны,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

  

імёны па бацьку і прозвішчы касманаўтаў на беларускай і рускай мовах паводле ўзору.

Узор. *Пётр Ілыіч Клімук — Пётр Ильич Климук, ..., ...,* .

**11.** Выразна прачытайце дыялог касманаўта Уладзіміра Кавалёнка з вучнямі.

***касмана́ўт***

**Якая зямля з космасу**

Хлопчыкі і дзяўчынкі пытаюцца ў касманаўта:

— Якая наша краіна з космасу? Блакітная? Чырвоная? Зялёная?

Ён з годнасцю адказвае:

— Яна родная! Родная таму, што тут наша Беларусь — ваша і мая Бацькаўшчына!

Што адчувае касманаўт, калі адказвае на пытанні дзяцей? Пры дапамозе якіх знакаў прыпынку перадаюцца такія пачуцці?

Папрактыкуйце ролевае чытанне. Паспрабуйце як мага больш выразна выказаць усе эмоцыі ўдзельнікаў дыялога.

**12.** Прачытайце тэкст.

***зві́лісты***

**Радзіма!** З малых **дзён** мы захапляемся прыгажосцю яе неабдымных прастораў, звілістых рачулак, блакітных азёр.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Бярозавыя гаі ўсё лета гамоняць пад павевамі ветрыку і спяваюць птушынымі галасамі. Бясконцыя палі каласяцца залацістым жытам. Нам пашчасціла **нарадзіцца** на зямлі нашых прашчураў. Таму і завецца яна Бацькаўшчынай.

?! Спішыце, падзяляючы выдзеленыя словы на склады для пераносу. Праверце сябе з дапамогай правіла.

⇄ Вусна перакладзіце выдзеленыя словы на рускую мову. Раскажыце, чым яны адрозніваюцца.

### *Урок 3. Зычныя д, т, р, ч, ж, дж, ш і галосныя пасля іх*

**13.** Прачытайце жартоўны верш.

Косіць сена **кашалот,**
Паляцеў да зор янот.
Гэта **праўда,** ты мне вер,
А не **верыш** — дык **правер.**
Калі я сказаў не тое,
Пасмяёмся мы абое...
*(Уладзімір Мацвеенка)*



?! Запішыце выдзеленыя словы, падзяляючы іх на склады для пераносу.
Якія галосныя пішуцца пасля ***ш, р*** у выдзеленых словах?

**14.** Прачытайце тэкст. Звярніце ўвагу на выдзеленыя літары ***р, ш, т, ж***. Якія галосныя пішуцца пасля іх?

Беларусь — родная зямля не толькі для людзей, што **ж**ывуць **т**ут. Гэта п**р**ытулак для многіх звя**р**оў і птушак. У на**ш**ым краі любяць сяліцца буслы. Іх у Беларусі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

вельмі шмат. Пісьменнік Уладзімір Караткевіч вобразна і паэтычна назваў нашу Радзіму «зямлёю пад белымі крыламі».

**Прыту́лак** — месца, дзе можна схавацца ад каго-небудзь ці чаго-небудзь, адпачыць, прабыць патрэбны час.

Перакладзіце словы з выдзеленымі зычнымі на рускую мову. Запішыце іх парамі паводле ўзору.

Узор. *Жывуць(бел.) — живут(рус.), ... .*

Параўнайце гучанне слоў у рускай і беларускай мовах.

*Успомніце!*
У беларускай мове зычныя гукі **[р], [ч], [ж], [дж], [ш]** зацвярдзелыя. Пасля літар, што абазначаюць гэтыя гукі, ніколі не пішуцца галосныя ***е, ё, ю, я, і***: *Айчына, рака, жыта, джала, шына.*
Пасля зычных літар ***д, т*** таксама ніколі не пішуцца галосныя ***е, ё, ю, я, і***.

**15.** Прачытайце верш. Якія пачуцці ён выклікае?

Кранае неба неабсяжнаю
сінечай,
Урачыстасць помнікаў
у квецені садоў.
Няхай спакойна засынае
кожны вечар
Зямля любімая пад
крыламі буслоў.
*(Святлана Рыжкова)*





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Урачы́сты** — *рус.* торжественный.

?! Знайдзіце ў вершы словы з зычнымі, пра якія вы чыталі правіла. Выпішыце такія словы. Падкрэсліце галосныя літары, якія стаяць пасля гэтых зычных.

Якое пажаданне выказвае аўтар у апошнім сказе? Падумайце, як можна сказаць інакш. Запішыце свае варыянты ў сшытак.

**16.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх з дапамогай выдзеленых слоў так, каб атрымаўся тэкст. Запішыце яго.



Ці **шмат** на Беларусі **буслоў**?
Гэта **пералётныя птушкі** ці не?
Калі буслы **прылятаюць з выраю**?
Дзе яны **будуюць свае гнёзды**?
Хто выводзіцца ў **гнёздах**?
Чым кормяцца **малыя бусляняты**?
Дзе **маладыя буслікі вучацца** лятаць?
Калі **буслы адлятаюць у вырай**?

У нас на Беларусі … … . Гэта … … . Буслы … … … ў красавіку. Яны … … … на высокіх дрэвах паблізу чалавечага жылля. У … выводзяцца птушаняты. Кормяцца … … жабамі і змеямі, якіх прыносяць у дзюбе бацькі. Лятаць … … … ля гнязда. У канцы жніўня … … … … .

?! Падкрэсліце галосныя літары, якія стаяць пасля ***р, ч, ж, ш, д, т***. Знайдзіце словы з падоўжанымі зычнымі. Правільна іх вымаўляйце. Падкрэсліце іх у тэксце. Успомніце, як пераносяцца словы з падоўжанымі зычнымі.

**17.** Прачытайце тэкст. Правільна вымаўляйце склады з зацвярдзелымі зычнымі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Буслы — птушкі разумныя і назіральныя. Заўважаюць, калі ч..лавек да іх пр..хільны. Тады выбіраюць у вёсцы высокае др..ва для гнязда. Ж..вуць белыя буслы амаль ва ўсім свеце. Але найбольш любяць мясціны ціхія і балоцістыя. Вось ч..му ў нас у Беларусі ч..ста сустр..каюцца буслянкі — бусліныя гнёзды. *(Паводле Алеся Якімовіча)*

***чалаве́к***

**Прыхі́льны** — які выказвае сімпатыі, спагаду, спачувае; добразычлівы.

Спішыце. Карыстаючыся правілам, устаўце замест кропак прапушчаныя галосныя літары.

* Як называюць бусліныя гнёзды ў Беларусі?

**18.** Прачытайце верш. Знайдзіце словы з зацвярдзелымі зычнымі.

Ветрык з поля дыхну..,
каласкі скалыхну.. .
Ён па тра..цы паплы..
І .. гаёчк.. засты.. .

Пры спісванні ўстаўце прапушчаныя літары ***у*** або ***ў***. Падкрэсліце літары, што абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі.

* Параўнайце выразы: *чалавек дыхнуў* і *ветрык дыхнуў.* Калі так гавораць пра ветрык?

## *Урок 4. Правапіс о, э — а, е, ё — я*

**19.** Выразна прачытайце верш. Якія пачуцці да роднага краю ён выклікае? Якія знакі прыпынку дапамагаюць аўтару іх выказаць?

**Захапленне**

Беларускія сады і рэчкі,
Ціхі гай і в**о**зера лясное



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Безліч шчырых думак чалавечых
Назаўжды прывабілі сабою!

У захапленні гэтай прыгажосцю
Колькі песень спета і санетаў!
Колькі вершаў аб спатканні просяць
У бяроз, алешынаў і вербаў!

*(Святлана Рыжкова)*

**Бе́зліч** — вельмі шмат; вялікая колькасць, незлічонае мноства.
**Сане́т** — лірычны верш з асаблівым размяшчэннем рыфмаў.

**Прыва́біць** — *рус.* привлечь.

Успомніце, калі ў беларускай мове пішуцца галосныя ***о, э***, а калі — ***а***. Выпішыце з верша словы з выдзеленымі галоснымі, што адпавядаюць узгаданаму правілу. Падбярыце да іх пару такім чынам, каб у слове змяніўся націск. Паназірайце, што змянілася ў слове. Пастаўце націск у абодвух словах і падкрэсліце ненаціскную галосную.

Узор. *Рэ́чка — рака́, ...* .

*Успомніце!*
У беларускай мове галосныя ***о, э*** вымаўляюцца і пішуцца толькі пад націскам. У ненаціскных складах замест ***о, э*** пішацца ***а***: *до́м — дамы́, стрэ́хі — страха́.*

**20.** Прачытайце тэкст. Запішыце яго ў сшытку. Замест кропак у адпаведнасці з правілам устаўляйце галосныя ***о, э*** або ***а***.

## Родныя мясціны

Вёска Крынкі стаіць у прыгожым маляўнічым кутку Беларусі. За вёскай пачынаюцца п..лі. За п..лямі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

цягнецца невялікі лес. Недалёка ад вёскі працякае р..ка Сэрвач. Яна ўпадае ў Нёман. Летам каля р..чкі збіраецца мн..га людзей. Яны купаюцца або л..вяць рыбу. Недалёка ад нашай вёскі знах..дзіцца г..рад Навагрудак.

**Маляўні́чы** — вельмі прыгожы; які захапляе прыгажосцю.

?! Ці ёсць у тэксце словы, якія заўсёды пішуцца з вялікай літары? Назавіце іх. Чаму вы напісалі з вялікай літары менавіта гэтыя словы? Падбярыце да кожнага з іх паясняльнае слова і запішыце.

Узор. *Краіна Беларусь, вёска* ..., ... .

З якой літары пішуцца паясняльныя словы? Чаму слова *краіна* вы напісалі з вялікай літары?





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**21.** Прачытайце прыказкі. Якой думкай яны аб’яднаны?

Чалавек без Радзімы, як птушка без п**е**сні.
Родная з**я**мля мякчэй за чужую п**я**рыну.
Усякай птушцы сваё гн**я**здо міла.

**Пяры́на** — вялікая насыпка, напоўненая пер’ем, на якой спяць або якой накрываюцца.

Запішыце прыказкі ў сшытак. Карыстаючыся правілам, пастаўце націск у словах з выдзеленымі галоснымі і растлумачце іх правапіс. Знайдзіце словы, у якіх ёсць зацвярдзелыя зычныя.
Вусна падбярыце да гэтых слоў пару такім чынам, каб змянілася націскная галосная.

**_далягля́д_**

Узор. *Пе́сня — пясня́р, ... .*

*Успомніце!*
У першым складзе перад націскам ***е, ё*** пераходзяць у ***я***: *ле́с — лясы́, гнёзды — гняздо́, вёска — вяско́вы, зе́млі — зямля́, сёлы — сяло́, вецер — вятры́.*

**22.** Прачытайце. Падумайце, адкуль паходзяць назвы *Палессе, Паазер’е.*

Астраўкамі зелянеюць рэдкія перал**е**скі. А на далягл**я**дзе віднеецца зубчастая сц**я**на вялікага л**е**су. Гэта Палессе.

Разумна прыдумвае народ назвы для родных мясцін. Палессе — край л**я**соў. Паазер’е — край азёр.

*(Віталь Вольскі)*

Спішыце тэкст. Пастаўце націск у словах з выдзеленымі галоснымі. Растлумачце іх правапіс.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**23.** Прачытайце верш-загадку. Адгадайце яе з дапамогай малюнка.

Сіні-сіні матыл..к
Вам відзён яшчэ здал..к.
Па яго вы не б..жыце,
Ён стаіць, чакае ў **жыце.**
Так і просіцца ў в..нок
Сіні-сіні ... .
*(Надзея Сторажава)*



?! Якую пару года апісвае аўтар? Падмацуйце свой адказ словамі з верша. Запішыце верш разам з адгадкай у сшытак, устаўляючы прапушчаныя літары.

**24.** Прачытайце. Дайце тэксту назву.

Ёсць на св..це краіна шчаслівых людзей. Жыве ў той краіне дз..ўчынка Ал..ся. Такая в..сёлая! Хату падм..тае — сп..вае песні. Абед гатуе — таксама сп..вае. Паб..жыць на луг пагуляць ды кв..так назбіраць — ізноў сп..вае. З самай раніцы ўсё сп..вае ды сп..вае, як птушка-заранка. *(Паводле Алены Кобец-Філімонавай)*

?! Спішыце тэкст. Карыстаючыся правілам, устаўляйце прапушчаныя галосныя літары ***е*** або ***я***.

### *Урок 5. Змякчальны мяккі знак*

**25.** Выразна прачытайце верш.

Спытайся ў сонца і зямлі,
Спытайся ў чыстых рэк:
— Хто пачынае новы **дзень?**
— Рабочы чалавек!
*(Эдзі Агняцвет)*





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Якія віды інтанацыі ёсць у вершы? З якім пачуццём вы будзеце чытаць апошні радок?
Падлічыце колькасць складоў і колькасць гукаў у выдзеленым слове. Звярніце ўвагу на вымаўленне зычнага гука **[н’]**.
Як вы разумееце сэнс такога сказа: «Рабочы чалавек пачынае новы дзень»?

**26.** Прачытайце. Да слоў з левага слупка падбярыце па сэнсе спалучэнні слоў з правага. Запішыце сказы, якія ў вас атрымаліся, у сшытак.

| | |
|---|---|
| Садоўнік ... ... | вырошчвае гародніну. |
| Каваль ... ... ... | доіць кароў. |
| Даярка ... ... | працуе ў кузні. |
| Палявод ... ... | даглядае сад. |

Падкрэсліце назвы прафесій. Што вы можаце расказаць пра кожную з іх?
Знайдзіце словы, у якіх мяккі знак змякчае папярэдні зычны гук.

Уявіце, што вы сустрэліся з сябрам на вуліцы. Паразважайце аб тым, якую прафесію вы хацелі б атрымаць пасля заканчэння школы.

У з о р.
— *Добры дзень, ... ! Сёння мы з настаўніцай хадзілі на экскурсію ... .*
*Мне вельмі падабаецца праца ... .*
— *Прывітанне, ... ! А я, калі падрасту, мару стаць ..., таму што ... .*

Назавіце прафесію чалавека, які праводзіць экскурсіі па горадзе, музеі, батанічным садзе.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**27.** Прачытайце загадку і адгадайце яе.



У грудзях **гарыць агонь,**
А бяжыць, нібыта **конь.**
Без аброці, без дугі
Цягне ў полі ён плугі.

**Абро́ць** — прадмет вупражы, які надзяецца каню на галаву.

?! Прачытайце выдзеленыя словы. Звярніце ўвагу на тое, як у канцы іх вымаўляюцца зычныя гукі. Назавіце прафесію чалавека, які працуе на трактары.

*Успомніце!*
Мяккасць зычных на канцы слоў абазначаецца літарай **ь** (мяккі знак): *вугал* — *вуга**ль**, стол* — *сто**ль**, рыс* — *ры**сь***.

**28.** Прачытайце тэкст.

**Пчальнік**

Гудзе і звініць калгасны пчальнік. Колькі тут руху ў цёплы сонечны дзень! Маленькі Міхаська паважна пахаджае па казачным пчаліным гарадку, як сапраўдны пчаляр. Бацька яшчэ на досвітку паехаў у горад па новыя вуллі, а хлопчыка пакінуў даглядаць пчол разам з дзядзькам Антосем. Сёння Міхаська і дзядзька Антось будуць гаспадарыць у пчальніку аж да самага вечара.

?! Выпішыце з тэксту словы, дзе літара **ь** знаходзіцца ў канцы слова.

Узор. *Звініць*, ..., ... .

Якую ролю ў іх выконвае мяккі знак?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Якую назву мае прафесія дзядзькі Антося? Ад якога слова яна ўтварылася? Ці ёсць у тэксце яшчэ словы, якія ўтварыліся ад слова *пчала*?
Запішыце ланцужок з роднасных слоў. Абазначце ў іх корань.

**29.** Прачытайце, выразна вымаўляючы кожны сказ.

**Рабочыя рукі**

Хто ўзвядзе заводы і школы Рабочыя рукі
Хто вырасціць багаты ўраджай Рабочыя рукі
Хто пабудуе касмічныя караблі Рабочыя рукі
Хто зробіць жыццё лепшым Рабочыя рукі
Слава людзям працы Слава іх залатым рукам

?! Запішыце тэкст, расстаўляючы знакі прыпынку адпаведна інтанацыі. Як вы разумееце значэнне выразу «залатыя рукі»?
Знайдзіце ў тэксце словы са змякчальным мяккім знакам. Падкрэсліце мяккі знак і літару перад ім.

**30.** Прачытайце. Знайдзіце ў тэксце словы са змякчальным мяккім знакам.

Пеця Клімук **любіў майстраваць з дрэва**. Ён пераняў гэту любоў да працы ад бацькі. Спачатку **цацкі** сабе майстраваў. Потым сам зрабіў **палічку**, і **шпакоўню**, і **скрыначку для цвікоў**.

Аднойчы прынёс у школу **лінейку**. Яе ён таксама зрабіў сам.

?! Які занятак любіў Пеця Клімук? Што ён змайстраваў? Запішыце адказы на пытанні паводле ўзору. Для адказаў выкарыстайце выдзеленыя словы.

Узор. *Пеця Клімук … . Ён змайстраваў …, …, … .*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

  

Назавіце інструменты на малюнках. Запішыце іх назвы праз коску. Людзям якой прафесіі яны спатрэбяцца? Якіх інструментаў не хапае на малюнку? Дапішыце іх назвы ў сшытак.

Успомніце, кім стаў Пеця Клімук, калі вырас.

**31.** Прачытайце прыказкі. Вызначце іх агульную тэму. Растлумачце іх сэнс.

Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы.
Лепей крышку зрабіць, чым багата нагаварыць.
Праца славіць чалавека.
Словам працы не заменіш.

Запішыце прыказкі ў сшытак, падзяляючы на склады для пераносу. Падкрэсліце словы са змякчальным мяккім знакам.

## *Урок 6. Раздзяляльны мяккі знак і апостраф*

**32.** Выразна прачытайце верш. Звярніце ўвагу на знак прыпынку *працяжнік (—)*. Якую інтанацыйную ролю ён выконвае менавіта ў гэтым вершы?

***до́жджык***

З неба **льецца** дождж зялёны —
зелянеюць вербы, клёны.
Ходзіць дожджык залаты —
спеюць жоўтыя жыты.
Шэры дожджык сыпле, сыпле —
ні лісточка ўжо на ліпе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Бела ўсё, дажджоў няма —
гэта ж зноў прыйшла зіма.
*(Паводле Аляксея Пысіна)*

?! Якой пары года адпавядае кожны з радкоў верша? Раскажыце, што за колер у дожджыка бывае летам, зімой, увесну і ўвосень.
Папрактыкуйцеся вымаўляць выдзеленае слова. Як вымаўляюцца гукі **[л]** і **[е]?**
Запішыце і прачытайце: *лью, льеш, лье, льём.* Падкрэсліце тыя літары, паміж якімі стаіць раздзяляльны **ь**.

*Успомніце!*
Раздзяляльны ***ь*** (мяккі знак) пішацца ў некаторых словах пасля ***л*** перад галоснымі ***е, ё, ю, я, і***: *паль**ю**, Уль**я**на, Іл**ь**іч.*

**33.** Прачытайце.

Бывае так. Пойдзе чалавек у лес, спыніцца ля прыдарожнай сасны, сякеру спрабуе. **Увап’ецца** вострае лязо ў сасну, і пабягуць па шурпатай кары бурштынавыя слёзы. Гэтымі застылымі слязьмі смычок націраюць. Ён шэпча пра пякучую крыўду сасны струнам. А тыя голасна людзям даводзяць. Вось чаму плача скрыпка.
*(Паводле Міколы Янчанкі)*

**Буршты́н** — скамянелая жоўтая празрыстая смала хвойных дрэў, з якой вырабляюць розныя ўпрыгажэнні.

?! Назавіце тэму тэксту, прыдумайце яму назву. Вусна падзяліце яго на часткі. З якой мэтай аўтар напісаў гэты тэкст?
Звярніце ўвагу на правапіс і вымаўленне выдзеленага слова з апострафам. Назавіце яшчэ 4—5 слоў з апострафам і запішыце ў сшытак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Успомніце!*
Зычныя гукі **[б], [п], [м], [р]** з галоснымі гукамі ў некаторых словах вымаўляюцца паасобку. Пры напісанні паміж імі і галоснымі літарамі ***е, ё, ю, я, і*** ў такіх выпадках ставіцца апостраф ***(’)***: *пер’е, вераб’і, сям’я*.

**34.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Запішыце.

У снегіра прыгожае … .
З хваста паўліна выпала … .
Гэтай яблыньцы  яшчэ няма … гадоў.
У кастрычніку ля шпакоўні ўжо не чуваць галасоў вясёлай птушынай … .

Словы для выбару: *пяро, пер’е, сям’і, сямі.*

?! Параўнайце, як вымаўляюцца апошнія зычныя з галосным у словах *пяро і пер’е, сямі і сям’і.*

**35.** Прачытайце загадкі і адгадайце іх. Запішыце загадкі разам з адгадкамі ў сшытак.



Ваду п’е, а не глытае,
пер’е ёсць, а не лятае.



Яго б’юць, а ён не плача,
весялей ён толькі скача.

?! Падкрэсліце словы з апострафам.

**36.** Прачытайце тэкст. Параўнайце вымаўленне выдзеленых слоў: дзе ***ь*** служыць для змякчэння папярэдняга зычнага, а дзе раздзяляе зычны і галосны гукі?

**Ілья** ідзе знаёмай сцяжынкай да вёскі. **Стаіць** цёплы сонечны **дзень.** Недзе высока ў небе **льецца** песня жаваранка. Весела цвыркаюць на бярозе вераб’і. На полі **зеля-**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**неюць** сакавітыя ўсходы. Уздоўж дарогі растуць маладыя ліпкі. Іх **летась** пасадзіў хлопчык са сваімі школьнымі сябрамі. Праз шмат гадоў яны **вырастуць.** Прыемна будзе **адпачыць** у спякотны **дзень** пад дрэвамі.

?! Спішыце тэкст. Падкрэсліце толькі тыя словы, дзе мяккі знак — раздзяляльны.

### *Урок 7. Корань слова. Роднасныя словы*

**37.** Прачытайце тэкст. Спішыце. Замест кропак устаўце тыя словы, якія падыходзяць па сэнсе.

Дуб — самае ... дрэва ў нашым краі. У дуба разгалістая ... крона. Ён ... ў час цвіцення і восенню пры даспяванні жалудоў. Густая, ... дуброва не баіцца летняй буры. Дубовы лес ... і ў зімовыя завеі.

**Дубро́ва** — дубовы лес.

***цвіце́нне***

С л о в ы  д л я  в ы б а р у: *магутная, велічнае, непахісны, прыгожы, цяністая.*

?! Ці даводзілася вам бываць у дубовым лесе? Як называюць яго ў Беларусі? А як называюць сасновы лес, бярозавы лес?
Падбярыце з тэксту аднакаранёвыя словы да слова *дуб* і запішыце ў сшытак. Назавіце і дадайце да гэтых слоў яшчэ 2—3 словы. Абазначце ў словах агульную частку — корань.

**38.** Прачытайце верш. Якую пару года мае на ўвазе аўтар? Пацвердзіце свой адказ словамі з верша.

**Пра Яніка і Янку**

Янік бэзу тры галінкі
Ранкам зрэзаў для Янінкі.
Янік падышоў да ганка,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дзе яго спаткала Янка:
— Ты нашто ў наш **сад** залез
Без дазволу **р**эзаць бэз?
Адказаў на гэта Янка:
— На мяне не злуйся, Янка!
Зрэзаў толькі **тр**ы галінкі
Я для хворае дзяў**ч**ынкі.
Будуць леп**ш** яны за лекі,
**Ш**то прынеслі ёй з аптэкі.

*(Уладзімір Мацвеенка)*



?! Вусна ахарактарызуйце выдзеленыя літары. Якія гукі яны ўтвараюць: цвёрдыя або мяккія? Успомніце агульную назву гэтых гукаў. Падбярыце да выдзеленага слова аднакаранёвыя, запішыце іх у сшытак.

**39.** Прачытайце. Адкажыце, чаму асеннія месяцы называюцца менавіта так. Дайце тэксту назву. Спішыце яго. Падкрэсліце назвы асенніх месяцаў.

У восені тры месяцы: верасень, кастрычнік і лістапад. У верасні верасы цвітуць. У кастрычніку кастрыца ляціць ад ільну, калі яго трэплюць. У лістападзе апошняе лісце ападае.

**Кастры́ца** — адходы, якія атрымліваюцца ў выніку пераціранання саламянай часткі сцябла пры мяцці і трапанні лёну.

?! Знайдзіце ў тэксце роднасныя словы, запішыце іх парамі і абазначце агульную частку — корань.

Узор. *Верасень — верасы, ... .*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**40.** Прачытайце верш. Растлумачце, чаму адно выдзеленае слова пішацца з вялікай літары, а другое — з малой.

На берагах **Бярэзіны**
Раскінуліся ў золаце
Асеннія лясы.
Там ліпы і **бярэзіны**,
Дубы там, быццам волаты,
Там водзяцца ласі.

**Во́лат** — *рус.* богатырь.



Успомніце і запішыце ў сшытак некалькі назваў беларускіх рэк.

Узор. *Бярэзіна, ..., ... .*

Як вы разумееце выраз: «Раскінуліся ў золаце асеннія лясы»?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Скажыце тое ж самае, але па-іншаму.
Ці з’яўляюцца словы *Бярэзіна* і *бярэзіны* роднаснымі, аднакаранёвымі?



**41.** Прачытайце і адгадайце загадку.

З-пад м**о**хавай схов**ы**
Павысоўвалі хл**о**пцы гал**о**вы.
Хто ні ідзе — іх вітае,
З сабой забірае.

*(Уладзімір Карызна)*

?! Падбярыце да слоў з выдзеленымі галоснымі такія роднасныя словы, каб націск у іх падаў на іншы склад. Запішыце словы парамі паводле ўзору.

Узор. ***Мо́хавай — махаві́к, ... .***

Ці збіралі вы грыбы? Успомніце і запішыце ў сшытак 5—6 назваў грыбоў.

**42.** Прачытайце тэкст. Дайце яму назву. Запішыце ў сшытак.

Паспелі ў лесе **арэхі**. Усе лясныя жыхары ахвотна наведваюць **арэхавыя** зараснікі. Звяры і птушкі любяць смачныя дары лесу. Трашчаць спелыя арэхі ў моцных птушыных дзюбах і на вострых звярыных зубах.

Гэтак за восень птушкі са звярамі так **арэшнік** ачысцяць, што рэдка пад якім кустом арэх знойдзеш.

*(Паводле Рыгора Ігнаценкі)*

?! Падкрэсліце выдзеленыя словы і абазначце ў іх агульную частку — корань.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 8. Падзел слоў на склады. Перанос слоў*

**43.** Прачытайце.

### Летам у лузе

Ці бачылі вы летні луг? Тры колеры пераважаюць на ім: чырвоны, жоўты, зялёны.

Чырвоны — кветкі канюшыны. Жоўты — дзьмухавец. Зялёны — трава і дрэвы.

Калі паглядзець больш уважліва, можна заўважыць і іншыя кветкі: рамонак, чабор, званочак.

*(Паводле Рыгора Ігнаценкі)*

?! Назавіце кветкі на малюнках. Якія падказкі ёсць для вас у тэксце? Знайдзіце іх і прачытайце. Вызначце колькасць складоў у кожнай назве. Назавіце колер кожнай з кветак.
Запішыце ў сшытак назвы кветак і іх колеры паводле ўзору.

Узор. *Званочак сіні, чабор ..., ... .*







Выразна прачытайце загадкі пра кветкі. Адгадайце іх.

У траве ў зялёнай свіце  
Да ўзыходу сонца спіць ён.  
А як сонейка вітае —  
Золатам кашуля ззяе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Жоўтае сонейка ў белых пялёстках —
Кожны з нас ведае кветачку простую.
П'ём з ёй гарбату — прастуда міне,
З ёю варожым: кахае ці не.
*(Паводле Алены Церашковай)*

**44.** Прачытайце. Назавіце прыметы бабінага лета. Падумайце, якія словы могуць стаць загалоўкам да тэксту.

У пачатку кастрычніка часам бываюць **ясныя, сонечныя** дні. Зноў зацвітаюць **некаторыя** расліны. Удзень з-пад кары дрэў вылазяць **насякомыя**, якія ўжо схаваліся на зіму. Дзе-нідзе лятаюць матылькі і стракозы.

«Бабіна лета» — так называюць у народзе гэтыя **цудоўныя** дні. *(Паводле Віталя Вольскага)*

***павуці́нне***

?! Падумайце, якая ўсім вядомая прымета бабінага лета не названа ў тэксце.
Запішыце выдзеленыя словы, а таксама слова ў рамачцы, падзяляючы іх спачатку на склады, затым для пераносу.

*Успомніце!*
Склад з адной літары нельга пакідаць на адным радку або пераносіць на другі радок. На склады трэба дзяліць так: *я-лі-на, пры-го-жы-я,* а пераносіць так: *ялі-на, пры-го-жыя*.

**45.** Адкажыце на пытанні з левага слупка, падбіраючы адказы з правага. Змяніце словы ў дужках па сэнсе і запішыце іх у сшытак.

| | |
|---|---|
| Дзе сядзіць птушка? | У (вада). |
| Дзе плавае рыба? | У (агарод). |
| Дзе працуюць дзеці? | У (гняздо). |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дзе спеюць яблыкі? — На (града).
Дзе расце морква? — У (сад).

**я́блык**

?! Паразважайце: чаму літара ***д*** перайшла ў ***дз***? Выпішыце ў радок усе словы са спалучэннем ***дз***, падзяляючы на склады для пераносу. Памятайце, што ***дз*** пры пераносе не раздзяляецца.

**46.** Прачытайце верш. Разгледзьце малюнак. Якія грыбы знайшлі дзеці?



Дзень добры вам, лясы-дубровы,
І гулкі бор, і хмызнячок!
Паклон табе, рудагаловы
Крамяны друг — баравічок!
*(Кастусь Кірэнка)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Спішыце верш, падзяляючы словы на склады для пераносу. Знайдзіце ў вершы роднасныя словы. Абазначце ў іх агульную частку — корань.

Запрасіце свайго суседа або суседку па парце пайсці ў грыбы. Стварыце дыялог паводле ўзору.

Узор.
— ... ! *Запрашаю цябе ў нядзелю ... .*
— *Дзякую, ... ! Я ... .*

**47.** Прачытайце тэкст. Дайце яму назву.

Колькі на свеце цудоўных мясцін! **Усюды** жывуць **добрыя** і **працавітыя** людзі. Аднак самае лепшае месца — тое, дзе вы нарадзіліся. Прыгадайце кожны куточак, **кожную** сцяжынку, узгорачак, лагчынку. Дзе яшчэ можа быць **такое** хараство? *(Паводле Міколы Хведаровіча)*

Запішыце ў сшытак выдзеленыя словы, падзяляючы іх на склады для пераносу. Карыстайцеся правілам.

## МАЎЛЕННЕ

### *Урок 1. Маўленне і яго роля ў нашым жыцці*

**48.** Прачытайце тэкст. Спішыце яго.

Што такое маўленне? Адзін чалавек гаворыць, а другі слухае і разумее яго. Мы чытаем кнігу, часопіс і таксама разумеем, што там напісана. З дапамогай слоў чалавек выказвае свае думкі і перадае іх іншым людзям. Усё гэта адбываецца дзякуючы маўленню.

Раскажыце, якое значэнне мае маўленне. Як мы выкарыстоўваем маўленне ў зносінах?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Запомніце!*
**Маўленне** — перадача інфармацыі пры дапамозе слоў. Яно патрэбна, каб выказваць свае думкі, пачуцці, мець зносіны адзін з адным. Маўленнем валодае толькі чалавек. У жывёл яго няма.

**49.** Выразна прачытайце верш.

Маўленне... **Безліч** розных **фраз**
**Гаворым** у шчасці і ў журбе...
**Да нас звяртаюцца** штораз
**З пытаннем, каб пачуць адказ.**
**У маўленні пазнаём сябе,**
**Суседзяў, блізкіх і сяброў,**
Жаданне верыць, жыць, любіць,
Адчуць сумленнасць, шчырасць слоў
На роднай мове. Потым зноў
Адчуць — і паўтарыць...
*(Святлана Рыжкова)*

**Журба́** — пачуццё смутку, душэўнай прыгнечанасці; туга, маркота.

**Сумле́ннасць** — *рус.* честность.

Прачытайце толькі выдзеленыя фразы. Запішыце іх. Правільна пастаўце знакі прыпынку там, дзе яны патрэбны. Ці можна назваць гэтыя сказы тэкстам? Ці зразумелі вы з гэтага тэксту, што такое маўленне?
* Якую інтанацыйную ролю ў вершы выконваюць такія знакі прыпынку, як шматкроп'е і працяжнік?

**50.** Прачытайце наступныя пытанні і адкажыце на іх.

Як называецца наша Радзіма?
Якая мова з'яўляецца роднай для нашага народа?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ці падабаецца вам яе гучанне? Чаму?

Ці ўсе словы беларускай мовы для вас зразумелыя?

Ці хочаце вы навучыцца добра размаўляць на беларускай мове? Што трэба для гэтага рабіць?

**51.** Прачытайце ўрыўкі з вершаў. Якія пачуцці да роднай мовы выказваюць паэты?

Адкрываю, як свет, нанова
Беларускае роднае слова,
Пераліўістае — як каменьчык,
Вясёлкавае — як ручай.
*(Анатоль Канапелька)*

Якія знаёмыя назвы і словы,
Якая цудоўная родная мова!
І ўсё мілагучна для слыху майго:
І звонкае «дзе», і густое «чаго»...
*(Пімен Панчанка)*

Сонца ў лісцях бяроз, на мурожнай у росах траве,
Жаўруковаю песняй злятае на колас жытнёвы,
А ў матуліным сэрцы найвялікшае сонца жыве,
Найвялікшае сонца — мая беларуская мова.
*(Яўген Крупенька)*

**Муро́г**— сухадольная сакавітая трава высокай кармавой якасці, а таксама сена з такой травы.

Які з урыўкаў вам спадабаўся найбольш? Запішыце яго ў сшытак і вывучыце на памяць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**52.** Прачытайце загадкі. Пра якую цікавую з’яву прыроды ідзе гаворка ў абодвух вершах?



Языка не мае,
А крычыць, гукае.
Хоць і гулкае яно,
Ды ніколі не відно.

Само не **гаворыць,**
Ды ўсім адгукнецца,
Наш голас **паўторыць,**
Як мы, засмяецца.
*(Міхась Пазнякоў)*

Запішыце загадкі разам з адгадкай у сшытак, падзяляючы выдзеленыя словы на склады для пераносу.

## *Урок 2. Міміка і жэсты*

**53.** Прачытайце і прыміце да ўвагі.

Каб найбольш ярка і дакладна выказаць свае думкі, у зносінах з іншымі людзьмі мы выкарыстоўваем такія дапаможныя сродкі маўлення, як міміка і жэсты.

Пры дапамозе мімікі мы можам выказаць свой настрой, пачуцці, эмоцыі, што надае маўленню кожнага чалавека асаблівасць і непаўторнасць.

Пры дапамозе рухаў чалавек узмацняе эмацыянальнае ўздзеянне на субяседніка.

Запішыце тэкст у сшытак і падкрэсліце самыя значныя для вас выразы.

*Запомніце!*
**Міміка** — змена выразаў твару, што адлюстроўвае пачуцці чалавека (весялосць, радасць, засмучэнне, роздум).
**Жэсты** — рухі галавы і рук, якія замяшчаюць або суправаджаюць маўленне.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**54.** Разгледзьце малюнкі.







?! Якія пачуцці дзяцей адлюстраваны на малюнках? Назавіце іх. Паспрабуйце выявіць тыя ж самыя пачуцці.

1. Выкарыстоўвайце толькі словы: *мне весела; мне страшна; я мару; я разважаю; я здзіўлены (здзіўлена).*

2. Пакажыце пачуцці пры дапамозе толькі мімікі твару, як на малюнках.

3. Выкарыстоўвайце і міміку, і словы.

У якім выпадку пачуцці дзяцей выяўляліся больш эмацыянальна і зразумела? Ці можна выказаць свае эмоцыі толькі пры дапамозе слоў? Чаму?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**55.** Уважліва разгледзьце малюнкі. Адкажыце, што азначае кожны з гэтых жэстаў.








?! Ці карыстаецеся вы такімі жэстамі ў зносінах з іншымі людзьмі?

**56.** Прачытайце гутарку вучняў.

— Я рашаю, рашаю гэтую задачу, а яна ніяк не рашаецца! Надакучыла!

— Сядзь за парту. Супакойся. Яшчэ раз уважліва прачытай змест задачы і паразважай. Абавязкова рэшыш.

?! Якія адметныя рысы характару мае першы субяседнік? Які характар у другога субяседніка? Як вы гэта зразумелі?

Паспрабуйце «паразмаўляць» са сваім сябрам без слоў.

1. Выкарыстоўвайце толькі міміку твару.
2. Ужывайце толькі жэсты.
3. Выкарыстоўвайце міміку і жэсты.

?! Ці зразумелі вы, пра што ішла «гутарка», калі вы «размаўлялі» толькі пры дапамозе мімікі? Чаму?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ці можна дакладна зразумець сэнс выказанага пры дапамозе толькі жэстаў, пры дапамозе мімікі і жэстаў? Чаму так?

**57.** Паспрабуйце паказаць пры дапамозе жэстаў наступнае выказванне.

— Глядзіце! Глядзіце! Журавы адлятаюць у вырай! Да пабачэння, птушачкі! Хутчэй вяртайцеся назад!

?! А зараз паспрабуйце сумясціць у сваім выказванні і словы, і міміку, і жэсты. Як змяніўся настрой выказвання? Ці стала яно больш дакладным і эмацыянальным?

**58.** Звярніцеся да суседа па парце і пры дапамозе рухаў папрасіце яго выканаць наступныя дзеянні.

1. Звярнуць на вас увагу.
2. Даць вам падручнік.
3. Падысці да дошкі.
4. Узяць крэйду.
5. Запісаць слова «Беларусь».

?! Прааналізуйце дзеянні вашага суседа па парце. З якімі заданнямі ён справіўся з лёгкасцю? Над якім яму трэба было падумаць? З якім ён не справіўся зусім? Чаму так атрымалася?

**59.** Прачытайце верш. Запішыце яго ў сшытак, падзяляючы на склады для пераносу.

Ясным настроем,
Усмешкай сустрэнь
Ясны, бязвоблачны,
Сонечны дзень!
*(Васіль Жуковіч)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Аб чым сведчыць усмешка на твары? Ці можа яна адлюстроўваць настрой чалавека?
Якія пачуцці будзе выказваць у зносінах чалавек з добрым настроем: *сум, раздражнёнасць, радасць, весялосць, ветлівасць, злосць*?
З якой парадай звяртаецца да нас аўтар?

## *Урок 3. Вуснае маўленне*

**60.** Прачытайце народныя выказванні. Растлумачце іх сэнс.

Добрае слова добра і слухаць.
Як напішацца, так і прачытаецца.
Так сказаў, ды не так напісаў.

?! У якім выказванні згадваецца толькі вуснае маўленне? Запішыце яго ў сшытак.

*Запомніце!*
Маўленне бывае вуснае і пісьмовае.
**Вуснае маўленне** — гэта калі мы чуем і разумеем субяседніка, гаворым самі: *адказы на пытанні настаўніка, слуханне радыё, гутарка сяброў, чытанне верша на памяць.* Вуснае маўленне ажыццяўляецца пры дапамозе гукаў. Яно ўспрымаецца на слых: яго можна пачуць з вуснаў чалавека.

**61.** Выразна прачытайце верш.

На роднай мове **размаўляе**
Мой слаўны працавіты люд,
І я заўсёды **ўспамінаю**
Над Нёманам свой родны кут.
*(Віктар Шымук)*

?! Прачытайце ўслых першыя два радкі верша. Звярніце ўвагу на выдзеленае слова. Якое маўленне яно адлюстроўвае? Абгрунтуйце свой адказ.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



* Падумайце аб чым-небудзь прыемным. Раскажыце пра свае пачуцці. Якім маўленнем вы карыстаецеся?
Прачытайце два апошнія радкі верша. Звярніце ўвагу на выдзеленае слова. Паразважайце і запішыце сваё меркаванне ў сшытак паводле ўзору.

Узор. *Успаміны, думкі аб чым-небудзь — гэта ... маўленне.*

**62.** Прачытайце. Паразважайце, ад чаго засцерагаюць нас гэтыя прыказкі. Запішыце іх у сшытак і запомніце.

Пяць разоў падумай — адзін раз скажы.
Слухай многа — гавары мала.
Менш гавары — больш пачуеш.

?! Якое маўленне маецца на ўвазе ў гэтых парадах?
Якую інтанацыйную ролю ў прыказках выконвае працяжнік?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**63.** Прачытайце наступныя выразы.

Слуханне радыё, маляванне, слуханне мелодыі, спяванне калыханкі, прагляд мастацкага фільма, размова па тэлефоне, напісанне ліста бабулі, запісванне практыкавання ў сшытак.

?! Якія з гэтых дзеянняў адлюстроўваюць вуснае маўленне?

**64.** Уявіце, што вы размаўляеце з сябрам па тэлефоне. Гледзячы на малюнак, вазьміце ў рукі ўяўныя тэлефоны і складзіце дыялог паводле ўзору.



— **Добры дзень, ...** ! На жаль, я не паспеў (не паспела) запісаць дамашняе заданне. **Калі ласка, ...** !

— **Прывітанне, ...** ! Канешне, я табе дапамагу. Слухай уважліва: ... !

— Я табе **вельмі ўдзячны (удзячна)**!

?! Выразна прачытайце выдзеленыя словы. Як іх называюць у маўленні і для чаго выкарыстоўваюць?
Якім маўленнем карыстаюцца ўдзельнікі дыялога?

**65.** Прачытайце. На якой мове «размаўляюць» мурашы? Запішыце тэкст у сшытак.

***арыентава́цца***

**«Мова» мурашоў**

Мурашы не бачаць. Але яны выдатна арыентуюцца, адчуваюць адзін аднаго. У іх ёсць свая мова — «мова



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

пахаў». Мурашы, калі патрэбна, выдзяляюць пахучыя рэчывы. Той, хто знайшоў ежу, пазначае зваротны шлях пахам. Па гэтым паху астатнія мурашы адшукваюць месца, дзе яна знаходзіцца.

**Арыентава́цца** — вызначаць сваё месцазнаходжанне.

**Рэ́чывы** — *рус*. вещества.

Успомніце і пакажыце, як рухаюцца і «размаўляюць» такія жывёлы і птушкі, як *кот, воўк, мыш, курыца, верабей, жаба, вожык.*
Пакажыце пры дапамозе мімікі і жэстаў, як людзі выкарыстоўваюць «мову пахаў».

## *Урок 4. Правілы вуснага маўлення*

**66.** Уважліва прачытайце правілы вуснага маўлення і пастарайцеся іх запомніць.

Вуснае маўленне павінна быць выразным і зразумелым для субяседніка.

Гавары спакойна і разборліва. Старайся дакладна выказваць свае думкі.

Уважліва слухай і не перабівай свайго субяседніка. Паважай чужое меркаванне.

Ці цяжка выконваць правілы вуснага маўлення? Ці заўсёды вы прытрымліваецеся гэтых правілаў у размове з таварышамі, дарослымі?

Паспрабуйце пра што-небудзь запытацца ў суседа па парце, напрыклад, пра яго настрой.
Якім голасам (гучным, спакойным або ціхім) вы задавалі пытанне? Ваша маўленне было хуткім або павольным? Чаму?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**67.** Прачытайце прыказкі, растлумачце іх сэнс. Запішыце іх у сшытак, падзяляючы выдзеленыя словы на склады для пераносу.

**Нагаварыў** на мяшок, а справы — на вяршок.
Гавары, што ведаеш, але **ведай**, што гаворыш.
Трымай язык на прывязі.
І шыла, і мыла, і ткала, і прала — і ўсё **языком**.

**Вяршóк** — мера даўжыні, роўная 4,4 см, якой раней карысталіся нашы продкі.

?! Якія з прыказак характарызуюць балбатлівага чалавека, а якія даюць яму парады? Якія з выказванняў мы можам дадаць да правілаў вуснага маўлення?

**68.** Паразважайце, якім голасам (гучным, ціхім, спакойным, раздражнёным) трэба гаварыць у наступных сітуацыях.

1. Вы невялікай кампаніяй ідзяце па вуліцы і размаўляеце.
2. Вы бачыце, што каму-небудзь пагражае небяспека.
3. У тэатры побач з вамі вельмі гучна размаўляюць і перашкаджаюць глядзець цікавы спектакль.
4. Вы хочаце падзяліцца сакрэтам са сваёй сяброўкай ці сваім сябрам.
5. Вы расказваеце верш на памяць.

?! Ці заўсёды вы паводзіце сябе так, як патрэбна? Успомніце і раскажыце, калі вы сябе паводзілі няправільна.

**69.** Прачытайце скорагаворку. Якое з правілаў вуснага маўлення не ведае Рыгорка? Падкажыце яму, як трэба размаўляць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Гаворыць Рыгорка
Шпаркай гаворкай.
Паправім Рыгорку:
— Хутка гавораць скорагаворку.
*(Міхась Пазнякоў)*

**скорагаво́рка**

?! Які з радкоў верша мы можам дадаць да правілаў вуснага маўлення? Чаму?
Прачытайце слова ў рамцы. Ад якіх двух слоў яно ўтворана?

**70.** Прачытайце па ролях жартоўны верш. Сачыце за тым, каб ваша інтанацыя адпавядала зместу.
Запішыце верш у сшытак, уважліва расстаўляючы знакі прыпынку.

**На ўсялякі выпадак**

— Навошта ты, Антось,
Паклаў на лоб кампрэс? —
Спытаўся дома ў брата
Старэйшага Алесь.
— Мо доктара паклікаць?
— Я так... — сказаў Антось. —
Са сходу мама прыйдзе
Бацькоўскага вось-вось...
*(Міхась Пазнякоў)*



?! Як можна ахарактарызаваць маўленне Алеся? Што вы можаце сказаць пра паводзіны Антося? Ці адпавядаюць думкі Антося назве верша?

**71.** Выразна прачытайце тэкст.

**бярло́г**

Усё гатова да зімы. Паляцелі ў вырай птушкі. Звяры пахаваліся ў норах, берлагах, цёплых дуплах. Палі вакол пустыя, лясы бязлістыя.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Толькі магутны дуб не скінуў свайго лісця. Усю зіму стаіць у сваім медным адзенні. Ён скіне яго вясною. І прыхарошыцца ў новае, зялёнае.

*(Паводле Клаўдзіі Каліны)*

?! Як вы чыталі тэкст: гучна, спакойна, ціха?
Запішыце толькі тыя сказы, у якіх паведамляецца пра надыход восені.
Звярніце ўвагу на слова ў рамцы. Правільна яго пішыце і вымаўляйце.

**72.** Прачытайце верш.

Сонца ў вокны **заглядае,**
Будзіць: «Горад! Уставай!»
Пасажыраў **падбірае**
Звонкі ранішні трамвай.

?! З якой інтанацыяй вы прачыталі верш? Які знак прыпынку дапамог вам яе вызначыць?
Запішыце верш у сшытак, падзяляючы на склады для пераносу выдзеленыя словы.

## *Урок 5. Пісьмовае маўленне і яго асаблівасці*

**73.** Разгледзьце малюнкі.


Новы ліст Адасламць
Каму: jana_2016@tut.by
Тэма: Як справы?
Прывітанне, Яна!
Прыязджай да мяне ў госці на летніх канікулах.
Алеся










?! Раскажыце з дапамогай малюнкаў, дзе ўжываецца пісьмовае маўленне. А як вы выкарыстоўваеце яго на ўроках беларускай мовы?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**74.** Прачытайце.

Піша літару Марына,
Піша не адну хвіліну.
«І» спачатку не ўдаецца:
То направа пахіснецца,
То ўстаяць ніяк не можа,
То бывае непрыгожай,
То заходзіць за лінейку,
Быццам бы па справе нейкай.
Не адразу ўсё даецца!
Болей «І» не пахіснецца.
Па лінейцы — па дарожцы —
Крочыць на танклявай ножцы.

*(Паводле Паўлюка Пранузы)*

?! Якім маўленнем (вусным або пісьмовым) карыстаецца Марына? Знайдзіце і прачытайце адказ на пытанне ў вершы.

Назавіце адметныя рысы характару Марыны. Якая яна? Ці хацелі б вы быць падобнымі да яе? Чаму?

Знайдзіце ў вершы выказванне, якое вучыць нас не спяшацца. Спішыце яго. Скажыце тое ж самае па-іншаму. Запішыце ў сшытак і тыя выразы, што ў вас атрымаліся.

*Запомніце!*

**Пісьмовае маўленне** — гэта надрукаванае, напісанае, прачытанае: *спісванне практыкавання, напісанне ліста сябру, чытанне напісанага тэксту «сам сабе»*.

Пры выкарыстанні пісьмовага маўлення мы можам выказваць свае думкі пры дапамозе напісання слоў.

**75.** Прачытайце і адгадайце загадкі з дапамогай малюнкаў.

Не куст, а з лісточкамі, не чалавек, а расказвае.

Белае поле, чорнае насенне. Хто яго сее, той разумнее.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ляжыць паленца — у сярэдзіне сэрца.








?! З якім маўленнем звязаны словы-адгадкі: вусным ці пісьмовым? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
Запішыце загадкі разам з адгадкамі ў сшытак.

**76.** Прачытайце наступныя словы.

Аловак, радыё, камп’ютар, тэлевізар, сшытак, рука, крэйда, газета, паштоўка, ручка, дзённік.

?! Запішыце ў радок словы — назвы прадметаў, якія вы выкарыстоўваеце ў пісьмовым маўленні. Успомніце, як правільна запісаць словы ў радок.

**77.** Прачытайце тэкст. Запішыце яго ў сшытак.

## Чаму мы так гаворым?

Даўней кнігі не друкавалі, а пісалі ад рукі. У радках слова ад слова не аддзялялася. Толькі новую думку пачыналі пісаць з новага радка. У ім першая літара размалёўвалася чырвонай фарбай. Так узнік выраз «пісаць з чырвонага радка».

?! Знайдзіце і падкрэсліце ў тэксце словы або спалучэнні слоў, якія дапамагаюць вызначыць, пра якое маўленне ідзе гаворка: вуснае ці пісьмовае.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Звярніце ўвагу на выраз «пісаць з чырвонага радка». Дапоўніце яго словамі так, каб атрымалася адно з правілаў пісьмовага маўлення. Успомніце астатнія правілы і назавіце іх па чарзе.

**78.** Прачытайце верш. Правільна вымаўляйце словы з ***ў***.

**Доўга** ўрокі Стас **вучыў:**
**Паўтараў, пісаў, лічыў…**
**Замарыўся** так, бядак,
Што **заснуў** на крэсле ўсмак.

?! Выпішыце выдзеленыя словы. Якое правіла правапісу іх аб'ядноўвае? Успомніце, калі пішацца літара ***ў*** у беларускай мове. Падкрэсліце ***ў*** разам з папярэдняй галоснай.
Падкрэсліце тыя з запісаных слоў, якія звязаны з вусным або пісьмовым маўленнем. Чаму вы падкрэслілі тыя ці іншыя словы?

**79.** Прачытайце тэкст.



Францыск Скарына — беларускі першадрукар.

У часы Скарыны кнігі ўжо не **пісалі**, а друкавалі. Рабіць гэта было цяжка, хоць яны атрымліваліся вельмі прыгожыя. Але Скарына марыў, каб людзі маглі **чытаць** на роднай мове. Мала дайшло кніг Скарыны да нашага часу. Цяпер іх можна ўбачыць толькі ў музеях.

Беларускі народ памятае Францыска Скарыну. У Полацку і ў Мінску яму паставілі помнікі.

?! Дайце назву тэксту.
Звярніце ўвагу на выдзеленыя словы. Якое маўленне яны адлюстроўваюць? Абгрунтуйце сваё меркаванне.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ці бачылі вы помнік Францыску Скарыне ў Мінску? Дзе ён знаходзіцца? Адкажыце з дапамогай малюнка.

**80.** Прачытайце і запішыце верш.

### Родны алфавіт

Ён захаваўся як рэлікт,
Людскою мудрасцю спавіты,
Слязамі і крывёй паліты —
Наш неўміручы алфавіт.
Жыве ён, родны алфавіт,
У вершах, казках і загадках.
Каб перадаць яго нашчадкам,
Вучы старанна яго ты!

*(Уладзімір Мацвеенка)*




**Рэлі́кт** — рэч, арганізм або з’ява, якія засталіся як перажыткі ад старажытных эпох.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Чаму, на думку аўтара, патрэбна вучыць алфавіт?
Успомніце, у якіх выпадках ён неабходны.
З дапамогай малюнка паўтарыце беларускі алфавіт і раскажыце яго па памяці.

## *Урок 6. Правілы пісьмовага маўлення*

**81.** Адкажыце на наступныя пытанні.

Як трэба пісаць: акуратна ці неахайна?
Ці добра рабіць на пісьме памылкі?
Што трэба ведаць, каб не рабіць памылак?
Ці стараецеся вы пісаць акуратна і без памылак?

?! Запішыце адказы ў сшытак.

**82.** Прачытайце народныя выказванні.

Як напішацца, так і прачытаецца.
Напісаў, як курыца лапай.

?! Аб чым папярэджваюць нас у першым выказванні?
Як сказаць тое ж самае, але інакш?
Пра якое напісанне гаворыцца ў другім выказванні? Яно з'яўляецца парадай або характарызуе неахайнае пісьмо?

**83.** Прачытайце словы. У адзін слупок запішыце назвы знакаў прыпынку, а ў другі — назвы частак слова.

Корань, працяжнік, кропка, прыстаўка, клічнік, коска, суфікс, пытальнік, канчатак.

Узор. *Працяжнік* *Корань*
... ...

?! Успомніце, як правільна запісаць словы ў слупок.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**84.** Прачытайце тэкст. Запішыце яго ў сшытак.

Азірніся навокал. Колькі дамоў, школ, заводаў! Колькі музыкі, карцін, кніг! І ўсё гэта створана працай чалавека. Без яе немагчыма існаваць.

?! А што вы бачыце вакол сябе? Адкуль гэта ўсё ўзялося?
А ці любіце вы працаваць? Раскажыце, як вы дапамагаеце сваім сябрам і дарослым. Кім марыце стаць у будучым?

**85.** Выразна прачытайце верш. Ці з'яўляецца ён дыялогам? Абгрунтуйце сваё меркаванне.



У ахвоту работу зрабіўшы,
Палюбуйся, як добра ўсё выйшла.
Лепшай радасці ў свеце няма:
— Я зрабіў гэта сам!
— Я зрабіла сама!

*(Васіль Вітка)*

?! Успомніце, як правільна аформіць запіс дыялога. Запішыце верш у сшытак.
З якім пачуццём вы чыталі словы дзяцей? Які знак прыпынку прымушае вас чытаць апошнія радкі верша гучней за іншыя?

**86.** Прачытайце загадку. Адгадайце, гледзячы на малюнак.



З сяброўкай моцна я дружу,
У школу разам з ёй хаджу.
Заўсёды буду я **дружыць**:
Яна на свеце **вучыць жыць**!

*(Нічыпар Парукаў)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Запішыце загадку разам з адгадкай, падзяляючы выдзеленыя словы на склады для пераносу, калі гэта магчыма.
Ці добрую «сяброўку» знайшла дзяўчынка? Якім чынам яна вучыць жыць? А ў вас ёсць такія «сябры»?

## *Урок 7. Дыялог і маналог*

**87.** Прачытайце абодва тэксты. Падумайце і адкажыце, які з іх з'яўляецца маналогам, а які — дыялогам. Па якіх прыметах вы гэта адрознілі?

1. Добрай раніцы, дзеці! Сёння ў нас незвычайны ўрок: мы з вамі пойдзем на экскурсію ў парк. Там будзем назіраць за зменамі ў прыродзе, якія адбыліся з надыходам восені.

2. — Добрай раніцы, дзеці!
— Добрай раніцы!
— Вам цікава паназіраць, якія змены адбыліся ў прыродзе з надыходам восені?
— Вельмі цікава!
— Тады хуценька апранайцеся і пойдзем на экскурсію ў парк.

?! Уявіце сябе ў асеннім парку або паглядзіце ў акно. Раскажыце сваім сябрам, якія змены ў прыродзе адзначылі вы. Чым з'яўляецца ваш расказ: дыялогам ці маналогам? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

> *Успомніце!*
> **Дыялог** — гэта размова двух або некалькіх чалавек.
> **Маналог** — маўленне аднаго чалавека.

**88.** Прачытайце жартоўныя вершы. Які з іх з'яўляецца дыялогам, а які — не? Чаму вы так вырашылі?

— Адкажы, чаму ты, дрозд,
Гэтак здорава падрос?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



— Шмат увосень еў рабіны,
Ну а гэта ж — вітаміны!



**Рак** поўз **паўз** барак.
Сустракае рака грак:
— Здароў, рак, дай **руку**:
У раку завалаку.

*(Васіль Вітка)*

?! Запішыце дыялог у сшытак.
Уважліва прачытайце другі верш. Да выдзеленых слоў падбярыце словы, якія маюць падобнае гучанне. Запішыце ланцужкі слоў паводле ўзору.



Узор. *Рак — грак, ... .*

Падкрэсліце літары, якімі адрозніваюцца гэтыя словы.

**89.** Прачытайце верш. Вызначце, у якой форме ён напісаны: маналога ці дыялога. Як вы гэта зразумелі? Звярніце ўвагу на тое, як афармляецца запіс дыялога.

**Прыметы восені**

— Якія ў восені прыметы?
Вядома вам? Скажыце вы.
— На крылах бабінае лета
Нясуць ў вырай журавы.
— І ўсё?
— Не ўсё.
Нясе ваверка
Арэхі спелыя ў дупло.
Лістамі сцеле вожык норку,
Каб цёпла ў ёй зімой было.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— І ўсё?
— Не ўсё...

*(Антон Бялевіч)*

?! Якія яшчэ ёсць прыметы ў восені? Раскажыце пра іх. Якой формай маўлення вы будзеце карыстацца: дыялогам ці маналогам?

*Успомніце!*
Словы кожнага ўдзельніка дыялога пішуцца з новага радка. Перад імі ставіцца працяжнік.

**90.** Выразна прачытайце верш.

## Лугавая казка

Пытаўся званочак:
— Скажы мне, вятрыска,
Чаму ты няўседа такі?
Лятаеш высока і нізка,
Ля хмар і над поймай ракі...



— У хованкі я не гуляю
Ні ў небе, ні тут, на зямлі:
Я цёмныя хмаркі ганяю,
Каб дожджыкі ўсюды лілі...

*(Мікола Чарняўскі)*

?! Ці з'яўляецца гэты верш дыялогам? Абгрунтуйце сваё меркаванне. Запішыце верш у сшытак, правільна афармляючы дыялог.

**91.** Прачытайце дыялог-жарт і разыграйце яго па ролях.

## Мароз

Убачыла маці — бяжыць Юрка з вуліцы. Спыніўся ля хаты.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Адкуль ты, сынок?
— Ад марозу ўцякаю!
— І ўцёк?
— Уцёк! Раней было холадна, а цяпер аж горача стала! *(Пятро Рунец)*

?! Як вы лічыце, чаму хлопчыку ўдалося «ўцячы» ад марозу? Чым падобны гэты жарт і казка «Два маразы»?

**92.** Прачытайце загадкі. Пра якога ляснога жыхара ідзе гаворка?

Працаўніца шчыравала,
Мех арэхаў назбірала.
І грыбоў шмат насушыла,
Спелых шышак нанасіла...
Прыхавала ўсё ў дупло,
Каб зімой на стол было.
*(Міхась Пазнякоў)*



Я рухавы зварок.
Заўжды весела мне.
Мая хатка — дупло
На высокай сасне.
*(Янка Журба)*

**Шчыраваць** — дбайна, старанна, рупна рабіць што-небудзь.

?! Якую з гэтых загадак можна назваць маналогам? Чаму? Запішыце загадку-маналог разам з адгадкай у сшытак.

*Успомніце!*
**Загадка** — вершаваны або празаічны твор, у якім падаецца сціслае апісанне прадмета або з'явы з мэтаю іх адгадвання.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**93.** Прачытайце тэкст і адкажыце на пытанне ў загалоўку.

## Чыя праўда?

Ваня гаворыць:

— Вавёрка рыжая. Я бачыў яе летам, калі хадзіў з мамай у ягады.

А Міша спрачаецца:

— Не рыжая, а шэрая. Я зімой ездзіў з татам у лес па дровы. Там бачыў ажно дзвюх вавёрак, абедзве шэрыя былі.

?! Хто з хлопчыкаў мае рацыю? Чаму хлопчыкі бачылі вавёрак рознага колеру?

У якой форме пабудаваны тэкст: маналога ці дыялога? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

**94.** Прачытайце верш. У якой форме ён пабудаваны: маналога ці дыялога?

Запішыце верш у сшытак, звяртаючы ўвагу на знакі прыпынку.

## Што такое скарб?

— Што такое скарб, скажы мне, —
Сын аднойчы запытаў.
— Гэта — песні нашы, сыне,
Што народ вякамі склаў.
Гэта — праца, рукі, сэрцы,
Што ствараюць і пяюць.
Гэта — дружба, мір, што ў свеце
Нас з табою берагуць.

*(Міхась Пазнякоў)*

?! Падумайце і адкажыце на пытанне: а што слова *скарб* азначае для вас?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 8. Маўленчы этыкет*

**95.** Выразна прачытайце верш. Якія знакі прыпынку аўтар выкарыстоўвае, каб выказаць свае пачуцці?

У любімай мове, роднай, наскай,
Ах, якія словы: **«Калі ласка!..»**
Як звіняць яны сардэчнаю струною!
Праз усё жыццё ідуць са мною!

*(Пятрусь Броўка)*

Звярніце ўвагу на выдзелены выраз. Як ён называецца ў мове? Калі і для чаго такія выразы выкарыстоўваюцца ў маўленні?
Як вы лічыце, ці часта паэт выкарыстоўваў ветлівыя словы ў сваім жыцці? Знайдзіце адказ на пытанне ў вершы і зачытайце.

Запомніце ветлівыя словы і заўсёды карыстайцеся імі ў жыцці!

**Дзе́нь до́бры** — *здравствуйте.*
**Калі́ ла́ска** — *пожалуйста.*
**Дзя́куй** — *спасибо.*
**Ве́льмі ўдзя́чны** — *очень благодарен.*
**Праба́чце, калі́ ла́ска** — *извините, пожалуйста.*
**Дазво́льце, калі́ ла́ска** — *разрешите, пожалуйста.*
**Да пабачэ́ння** — *до свидания.*
**Дабра́нач** — *спокойной ночи.*

**96.** Уявіце, што сустрэлі сябра і запрашаеце яго на свой дзень нараджэння. Складзіце дыялог паводле ўзору, ужываючы ветлівыя словы.

Узор.

*— ..., ... ! Я хачу запрасіць цябе на ... . ..., прыходзь да мяне заўтра ў ... .*
*— ..., ... ! Абавязкова прыйду.*
*— Буду табе ... .*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Успомніце, як правільна запісаць дыялог. Запішыце яго ў сшытак, звяртаючы ўвагу на знакі прыпынку.

**97.** Прачытайце жартоўны верш. Ці правільна паводзіць сябе за сталом хлопчык? Якія парады вы хацелі б яму даць?

## Саўка за сталом



Ляжаць ля талеркі
відэлец і нож.
Дзве чыстыя лыжкі ляжаць.
— Ну і што ж?
Ляжаць — хай ляжаць,
іх не буду чапаць.
Яны ж не чапаюць мяне і маўчаць.
З талеркі ён сёрбае крупнік —
ой-ой!
Кавалачак мяса хапае рукой.
Ён пальцамі ловіць у шклянцы кампот,
Абрусам ён выцер і шчокі, і рот.

*(Эдзі Агняцвет)*

?! Вызначце, якая форма маўлення прысутнічае ў вершы: дыялог або маналог. Знайдзіце гэты ўрывак у тэксце і зачытайце. Якім маўленнем карыстаецца Саўка: вусным або пісьмовым?

**98.** Прачытайце. Звярніце ўвагу на правільнае вымаўленне гукаў, абазначаных выдзеленымі літарамі.

У шафе стаяла Тоўстая Кніга і выхвалялася:
— Якая я прыгожая ды разумная!
Аднойчы побач пасяліўся новы сусед.
— Ты хто такі? — незадаволена спытала Тоўстая Кніга.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Добры дзень, суседка! Я — Буквар.

— Як ты сюды трапіў? Няўжо ты не бачыш, што тут жывуць толькі прыгожыя і разумныя кнігі?

— Прабачце, калі ласка, але...

?! Як вы лічыце, што адказаў Буквар Тоўстай Кнізе? Дапоўніце дыялог сваімі словамі па сэнсе.

Ці можна лічыць Тоўстую Кнігу ветлівай? Чаму? Якія пачуцці выклікае ў вас яе маўленне? Ці можна па маўленні здагадацца пра характар Тоўстай Кнігі?

Апішыце характар Тоўстай Кнігі і Буквара і запішыце ў сшытак паводле ўзору.

Узор. *Тоўстая Кніга (якая?)* ..., ..., ... .
*Буквар (які?)* ..., ..., ... .

**99.** Выразна прачытайце верш. Якія словы прывітання выкарыстоўвае паэт у сваім вершы? Гэты твор напісаны ў форме дыялога ці маналога? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Няхай сабе здаецца, можа, —
Як прыязджаў дамоў не раз:
— Дзень добры, — я шаптаў бярозам.
— Дзень добры, — чулася ў адказ.
І сэрца білася так гулка,
Нібы даўно ў юначы час.
— Дзень добры! — я вітаў рачулку.
— Дзень добры! — чулася ў адказ.
Я йшоў туды, дзе мог напіцца,
Каб смагі жар сышоў, пагас…
— Дзень добры! — я казаў крыніцы,
— Дзень добры! — чулася ў адказ.
Удзячнасці шукаў я словы,
Казаў іх шчыра, без прыкрас.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Дзень добры вам, гаі, дубровы!
— Дзень добры! — чулася ў адказ.

*(Пятрусь Броўка)*



**Сма́га** — *рус.* жажда.

?! Якія пачуцці выклікае ў вас гэты верш?
Як вы лічыце, чаму паэт звяртаецца да бяроз, рачулкі, крыніцы, як да жывых істот?

**100.** Уявіце, што вы едзеце ў аўтобусе. Побач з вамі сядзіць малады чалавек і чытае газету. На прыпынку зайшла старэнькая бабулька і стала побач з вамі.
Якім чынам вы будзеце сябе паводзіць?

1. Зробіце выгляд, што не прыкмецілі бабульку.
2. Устанеце і саступіце ёй месца.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. Прапануеце маладому чалавеку саступіць месца бабульцы.

?! Чаму вы выбралі той ці іншы варыянт адказу? Раскажыце, як трэба паводзіць сябе ў грамадскім транспарце.

**101.** Прачытайце і растлумачце народныя выказванні.

Ласкавае **слоўка**, як **сонейка**, грэе.
**Добрае** слова — што дзень ясны.
Усяму пачатак — **родная** мова.
Хто **забыў** сваіх продкаў — сябе губляе, хто забыў сваю мову — усё **згубіў**.

?! Запішыце народныя выказванні ў сшытак, падзяляючы на склады для пераносу выдзеленыя словы.

## Праверце сябе

Адкажыце на пытанні.

Што такое маўленне? Для чаго яно патрэбна чалавеку?
Якія дапаможныя сродкі маўлення вам знаёмы?
Якія віды маўлення вы ведаеце?
Што вы ведаеце пра вуснае маўленне?
Раскажыце пра асаблівасці пісьмовага маўлення.
Што такое маналог?
Як называецца маўленне двух чалавек?

Вызначце правільны варыянт адказу.

**1.** а) Маўленне — гэта перадача думак пры дапамозе слоў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

б) Маўленне — гэта слова або некалькі слоў, якія выказваюць закончаную думку.

в) Маўленне — гэта некалькі сказаў, аб'яднаных па сэнсе.

**2.** а) Маўленне бывае цікавым і нецікавым.

б) Маўленне бывае вусным і пісьмовым.

**3.** а) Пры вусным маўленні выкарыстоўваюцца міміка і жэсты.

б) Пры пісьмовым маўленні выкарыстоўваюцца міміка і жэсты.

**4.** а) Пісьмовае маўленне — гэта пачутае і сказанае.

б) Пісьмовае маўленне — гэта надрукаванае, напісанае, прачытанае.

**5.** а) Вуснае маўленне — гэта пачутае і сказанае.

б) Вуснае маўленне — гэта надрукаванае, напісанае, прачытанае.

**6.** а) Дыялог — гэта размова двух або некалькіх чалавек.

б) Дыялог — маўленне аднаго чалавека.

## ТЭКСТ

### *Урок 1. Тэкст як моўная адзінка. Тэма тэксту*

**102.** Прачытайце. Закончыце выказаную думку патрэбным словам. Праверце сябе па правілах, размешчаных на форзацы 1. Запішыце сказы ў сшытак.

Некалькі сказаў, звязаных паміж сабой па сэнсе і размешчаных у пэўнай паслядоўнасці, называюцца ... .

Тое, аб чым гаворыцца ў тэксце, з'яўляецца яго ... .

На тэму тэксту ўказвае яго ... .

... — гэта той, хто напісаў тэкст.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**103.** Прачытайце дзве групы сказаў. Якая з іх з'яўляецца тэкстам, а якая складзена з асобных сказаў?

1. Каля хаты расце высокі дуб. У рацэ водзяцца і акуні, і плоткі, і ляшчы.

Увосень птушкі адлятаюць у вырай. У сад вядзе вузенькая сцежка.

2. **Хвалюецца** спелае **збожжа**. Спелыя каласы **гнуцца** да зямлі. Добра ўрадзіла жыта ў гэтым годзе. Вялікі ўраджай збяруць людзі.

***збо́жжа***

?! Па якіх прыметах вы выявілі тэкст? Ці можна прыдумаць назву да першай групы сказаў? Чаму?

Прыдумайце назву да сказаў другой групы і запішыце тэкст у сшытак, падзяляючы на склады для пераносу выдзеленыя словы.

Успомніце, як вымаўляюцца і пераносяцца на другі радок словы з падоўжанымі зычнымі.

**104.** Прачытайце. Вызначце, ці з'яўляюцца сказы тэкстам.

Вось і канчаецца наша **падарожжа**. Хутка мы з вамі развітаемся, раз'едземся ў розныя бакі.

Шмат чаго пабачылі вы за час нашых вандровак. Пазнаёміліся з мінулым і сучасным краіны беларусаў, з яе прыродай, з яе гарадамі. Але шмат чаго пабачыць і не паспелі.

Хіба можна за такі кароткі час убачыць усю Беларусь? (*Віталь Вольскі*)

?! Якая тэма гэтага тэксту? Якую назву можна яму даць?

Ці ездзілі вы ў вандроўкі па Беларусі?

У якое падарожжа па родным краі вы б хацелі адправіцца?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Якія значныя месцы нашай краіны вам давялося наведаць?

2. Што з пабачанага найбольш вам запомнілася? Чаму?

3. Дзе яшчэ вы хацелі б пабываць?

Звярніце ўвагу на выдзеленае слова. Прачытайце яго спачатку цалкам, а потым па складах для пераносу. Падбярыце з тэксту слова, блізкае па значэнні, і запішыце яго паводле ўзору.

Узор. *Падарожжа* — … .

**105.** Прачытайце тэкст, назавіце яго аўтара. Разгледзьце малюнак.

Звосені пачынае рыхтавацца да зімовай спячкі вожык. Ён выбірае сабе пад кустом зручную ямку. Сюды носіць сухую траву, мох, лісце. З надыходам зімы вожык залазіць у гэтую ямку, засынае і спіць да сакавіка.

*(Паводле Віталя Вольскага)*



?! Назавіце тэму тэксту і тэму малюнка.
Ці можна, гледзячы на малюнак, дакладна вызначыць тэму тэксту? Чаму? Якія назвы можна даць тэксту і малюнку? Запішыце назву тэксту ў сшытак, а потым спішыце тэкст.

**106.** Прачытайце прыказкі. На якую яны тэму? Растлумачце сэнс кожнай з іх. Ці ўтвараюць яны ўсе разам тэкст?

***найсмачне́йшы***

Калі хочаш хлеб мець, трэба зямліцу глядзець.
Хлебароба поле славіць.
Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы.

?! Запішыце прыказкі ў сшытак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**107.** Прачытайце. Ці з'яўляюцца гэтыя сказы тэкстам? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

### Надыход зімы

Адшумелі свой час восеньскія вятры. Нізкія **хмары выплакалі халодныя слёзы.** Падзьмула з поўначы здаровым халадком. Зямля падсыхала і пакрывалася скарынкаю. Пасыпаў сняжок.

Пад вечар снег суняўся. **Пацісну мароз.** Вакол была такая бель, ад якой сляпіла і **адбірала вочы.**

*(Якуб Колас)*

?! Прачытайце і растлумачце сэнс выдзеленых выразаў. Для чаго такія выразы выкарыстоўваюць у маўленні?

**108.** Прачытайце верш. Ці з'яўляецца ён тэкстам? Калі так, то назавіце яго тэму. Ці падобныя тэмы тэкстаў гэтага і папярэдняга практыкаванняў? Што ў іх агульнага і чым яны адрозніваюцца?



Пуста ў лузе. Толькі стогі
Парыжэлыя стаяць,
Ды шпакі каля дарогі
Цэлы дзень адно крычаць.

Грэчка зжата. Гола ў полі.
Жыта звезена даўно.
Толькі плаваюць на волі
Кучы хмар, як валакно.

*(Якуб Колас)*

**Валакно́** — тонкая няпрадзеная нітка, з якой вырабляюць пражу, вату, кудзелю.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Якую назву можна даць гэтаму тэксту? Хто яго аўтар?
З чым аўтар параўноўвае хмары?

З дапамогай малюнка знайдзіце тую частку тэксту, дзе гаворыцца пра восень у полі. Спішыце яе ў сшытак. Ці ўтвараюць гэтыя сказы тэкст? Чаму?

**109.** Прачытайце верш-загадку і адгадайце яе з дапамогай малюнка.

### Браты-памочнікі

На руцэ маёй адной
Пяць братоў жывуць сям'ёй.
Працаваць мне памагаюць,
Лыжку ў час яды трымаюць.
Колькі іх — братоў такіх —
Ёсць на дзвюх руках маіх?

*(Авяр'ян Дзержынскі)*



?! Адкажыце на пытанні загадкі.
Ці з'яўляецца гэтая загадка тэкстам? Чаму?

**110.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце сэнс кожнай з іх.

У родным лесе і кожны куст родны.
У сваёй хаце і вуглы дапамагаюць.
Ад душы працуеш — Радзіму мацуеш.

?! Ці можам мы сцвярджаць, што ўсе гэтыя прыказкі аб'яднаны адзінай тэмай?
* Ці з'яўляецца кожны са сказаў асобным тэкстам? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
Запішыце адну з гэтых прыказак у сшытак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**111.** Прачытайце дыялог. Хто яго аўтар?

— Згадай, Кастусь, — Алесь пытае, —
Хто першы ў госці завітае?
— Ну хто ж? Вядома — Юрка, дружа.
— Чаму?
— Бо мёд ён любіць дужа...

*(Якуб Колас)*

?! Ці з'яўляецца гэты дыялог тэкстам? Чаму?
Выразна прачытайце дыялог па ролях. Запішыце яго ў сшытак, звяртаючы ўвагу на знакі прыпынку.

**112.** Прачытайце аб'яву. Ці з'яўляецца яна тэкстам?

**Аб'ява**

Заўтра, 25 кастрычніка, у актавай зале школы адбудзецца Свята восені. Пачатак а 15-й гадзіне.

?! Запішыце аб'яву ў сшытак. Прыдумайце і напішыце сваю аб'яву. Напрыклад, запрасіце вучняў 8—10 класаў на суботнік па ўпарадкаванні школьнай тэрыторыі.

**113.** Прачытайце тэкст. Запішыце яго ў сшытак, падзяляючы на склады для пераносу выдзеленыя словы.

**Маляўнічы куток**

У сталіцы Беларусі ёсць **маляўнічы** куток. Там сярод соснаў і бяроз **стаіць** прыгожы будынак. Гэта **музей** выдатнага **песняра** беларускага народа Якуба Коласа.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Якія творы Якуба Коласа мы з вамі чыталі на папярэдніх старонках падручніка? Выразна прачытайце іх яшчэ раз. Назавіце від кожнага з гэтых тэкстаў.

**114.** Прачытайце. Ці з'яўляюцца гэтыя сказы тэкстам? Чаму вы так вырашылі?

***імша́рына***

Багатая, шчодрая восень дарамі. Асенні лес апрануў залацістае ўбранне, падрыхтаваў для ўсіх падарункі. Стракацяць імшарыны сыраежкамі, бабкамі, падасінавікамі, баравікамі. Паспелі лясныя яблыкі, грушы-дзічкі. Зімой, як паляжаць, яны становяцца смачныя, салодкія. Жоўтыя арэхі-лузанчыкі, важкія жалуды сыплюцца, як дождж, толькі калатні. *(Паводле Барыса Сачанкі)*

?! Якая з назваў больш падыходзіць да тэксту: «Восень», «Шчодрая пара», «Восенню ў лесе»? Чаму? Запішыце тэкст разам з назвай у сшытак.

### *Урок 3. Асноўная думка тэксту*

**115.** Прачытайце тэкст. Назавіце яго тэму. Якую назву можна даць гэтаму тэксту?

На маленькім лапіку зямлі ідзе сваё жыццё. Некуды спяшаецца вусаты жук. Уверх па сцяблінцы паўзе божая кароўка. Нястомна працуюць мурашы.

?! Знайдзіце сказ, у якім выказваецца асноўная думка тэксту. Уважліва прачытайце яго і запішыце ў сшытак пад дыктоўку.

*Запомніце!*
**Асноўная думка тэксту** — гэта тое, што аўтар хацеў данесці да нас з дапамогай вуснага або пісьмовага маўлення.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**116.** Прачытайце тэкст. Назавіце яго тэму.

Радзіма! Якое гэта мілагучнае слова! Яно поўнае глыбокага сэнсу.

Кожны з нас уяўляе Радзіму па-свойму. Камусьці адразу бачацца неабдымныя палі. Летам яны каласяцца залацістым жытам, пшаніцай, ячменем. Шуміць проса, пахне грэчка. Хтосьці ўявіць сабе рэчкі, азёры, лясы...

Якая цудоўная наша Радзіма!

?! Вызначыце асноўную думку тэксту.
Запішыце толькі тыя радкі, дзе гаворыцца пра родныя палі. Падкрэсліце словы, што абазначаюць назвы прадметаў, якія мы чытаем з інтанацыяй пералічэння.



**117.** Прачытайце скорагаворкі. Папрактыкуйцеся хутка іх вымаўляць.

Над возерам вецер лятае,
На хвалях лілеі люляе.

*(Міхась Пазнякоў)*



Піскляняты просяць проса,
Скачуць босыя па росах.
Фрося проса ім прыносіць,
Ажно косы ў Фросі ў просе.

*(Эдзі Агняцвет)*

?! З якой мэтай аўтары напісалі гэтыя скорагаворкі? Падумайце: абедзве скорагаворкі ўтвараюць адзіны тэкст або кожная з іх з'яўляецца асобным тэкстам?
Вывучыце адну са скорагаворак. Запішыце яе ў сшытак па памяці.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**118.** Прачытайце загадкі і адгадайце іх з дапамогай малюнкаў.



Між лугоў, лясоў удалеч
Стужка сіняя віецца.
І агонь яе не спаліць,
І ніколі не парвецца.



Мы ўсе яму рады,
Ды як жа іначай?
А хто паглядзіць на яго —
Той заплача.

*(Міхась Пазнякоў)*

?! Чым загадка адрозніваецца ад звычайнага верша? З якой мэтай пішуцца загадкі?
Запішыце загадкі разам з адгадкамі ў сшытак.

**119.** Прачытайце дыялог па ролях.

— Ты чаму, Анютка, ходзіш так ціхутка?
— А таму, што ў ложку брацік спіць, Сярожка.

*(Мікола Хамянкоў)*

?! Назавіце тэму гэтага дыялога. Ці з’яўляецца ён тэкстам? Якая асноўная думка гэтага тэксту?
Ці правільна паводзіць сябе Анютка? Чаму?
Спішыце дыялог. Звярніце ўвагу на знакі прыпынку.

**120.** Прачытайце. Запішыце тэкст у сшытак.

**Вожык**

Дзеці хадзілі па лесе. Пад кустом яны знайшлі вожыка. Ён скруціўся ад страху клубочкам. Нельга вожы-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ка браць рукамі! Але дзеці ўзялі вожыка ў шапку і прынеслі дамоў. А навошта?

?! Назавіце тэму гэтага тэксту. З якой мэтаю ён напісаны? Адкажыце на пытанне, якое задаецца ў канцы тэксту. Ці правільна зрабілі дзеці, калі забралі вожыка дамоў? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

## *Урок 4. Афармленне запісу тэксту*

**121.** Прачытайце тэкст. Спішыце яго. Звярніце ўвагу, як правільна афармляць запіс празаічнага тэксту на пісьме.

***прывіта́нне***

### Ветлівасць

Міша баяўся вітацца пры сустрэчы з дарослымі. Калі ён з кімсьці сустракаўся, то адразу пераходзіў на другі бок вуліцы.

Аднойчы хлопчык адважыўся і прывітаўся з жанчынамі. А яны яго пахвалілі. Цяпер Міша вітаецца з усімі.

?! З якой мэтай быў напісаны гэты тэкст? Назавіце яго асноўную думку. А як вітаецеся вы? Разгледзьце малюнкі. Што вы на іх бачыце? Падумайце і адкажыце, якім чынам вы будзеце вітацца, калі ў клас уваходзіць настаўнік або іншы дарослы. А як гэта зробіце пры сустрэчы з сябрамі?







Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

 

Якія словы вітання вы ведаеце? Павітайцеся са сваім суседам або суседкай па парце. Пажадайце яму (ёй) што-небудзь прыемнае.

*Успомніце!*
Назва тэксту пішацца пасярэдзіне радка. Пасля назвы кропка не ставіцца.
Пачатак тэксту пішацца з чырвонага радка.
Першае слова кожнага сказа ў тэксце пішацца з вялікай літары.
У канцы кожнага сказа ў тэксце ставіцца знак прыпынку: кропка, пытальнік або клічнік.

**122.** Прачытайце тэкст. Што ў ім не так? Карыстаючыся правілам, запішыце тэкст правільна.

цішыня стаіць зімою ў лесе Снег ляжыць на кустах і дрэвах Не чуваць птушыных галасоў Толькі дзяцел моцнай дзюбай стукае па дрэве

?! Яшчэ раз прачытайце правілы афармлення запісу тэксту і праверце, ці правільна вы запісалі яго.

**123.** Прачытайце верш. Спішыце яго. Звярніце ўвагу на афармленне запісу вершаванага тэксту. Падкрэсліце ў ім назвы дрэў.

Люблю я лес, адвечны бор,
Дзе ўзносяць угору хвоі шапкі,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Дзе рассцілаюць елкі лапкі
І востры верх мкнуць у прастор.

І дуб-крапак, і куст малы
Стаяць у мудрым задуменні.
А сосны сочаць і струменяць
Густы, духмяны пах смалы.

*(Паводле Якуба Коласа)*

Чым запіс вершаванага тэксту адрозніваецца ад запісу тэксту празаічнага?

Ці даводзілася вам бываць у лесе? Раскажыце сябрам пра свае ўражанні. Якія дрэвы, акрамя названых у вершы, растуць у беларускіх лясах?

**124.** Прачытайце загадкі пра дрэвы. Адгадайце іх пры дапамозе малюнкаў.

Вечна беланогая,
Ды сукенку ўсё мяняе:
То яна зялёная,
То празрыста-залатая.





Волата гэтага
Кожны з вас знае:
Кожнае лета ён сотні гадоў
Ціха люляе сотні сыноў.

Мной дзяўчынак называюць.
А як толькі зацвітаю,
З гудам рупным і вясёлым
Да мяне лятаюць пчолы.

*(Міхась Пазнякоў)*





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Запішыце адну з загадак разам з адгадкай у сшытак. Ці адрозніваецца запіс загадкі ад запісу верша? Чаму?

**125.** Прачытайце народныя прыметы. Растлумачце, як вы разумееце кожную з іх.

Ярка-чырвонае сонца на заходзе — да яснага надвор’я.

Калі пчолы хутка збіраюцца ў вуллі — будзе дождж.

Калі ў лесе шмат рабіны — восень будзе дажджлівая, калі мала — сухая.

Снег глыбокі — год урадлівы.

?! Запішыце ў сшытак народныя прыметы. Узгадайце, чым адрозніваецца запіс празаічнага тэксту ад вершаванага.

**126.** Прачытайце верш. Звярніце ўвагу на інтанацыю пры чытанні. Чаму на канцы некаторых сказаў стаіць шматкроп’е?

**Калыханка**

Засынай, мая заранка,
Люлі-люлі — засынай...
І збудзіся росным ранкам
Развясененай, як май.
Краскі ўсе даўно паснулі.
Толькі ты не спіш адна.
Засынай, мой коцік, люлі...
Люлі-люлі — засынай.
Хай спяваюць калыханку
Пераліўна салаўі.
Хай пільнуюць сон да ранку
Месяц з ночкаю ўдваіх.

*(Васіль Рагаўцоў)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



?! У чым адрозненне калыханак ад звычайных вершаў? Ці ведаеце вы іншыя калыханкі? Якую калыханку вам спявала ваша матуля, калі вы засыналі? Раскажыце, калі памятаеце. Паслухайце «Калыханку» на словы беларускага паэта Генадзя Бураўкіна «Доўгі дзень, цёплы дзень...». Ці знаёмы вам яе словы і мелодыя? Дзе і калі вы маглі яе пачуць?

**127.** Прачытайце тэкст. Пры спісванні правільна расстаўце знакі прыпынку.

## Гомель

Гомелю ўжо шмат гадоў Цяпер горад хутка расце і прыгажэе Праз Гомель працякае рака Сож У Гомелі многа новых дамоў А ў цэнтры красуецца прыгожы парк У парку заўсёды людна Жыхары Гомеля любяць гэтае ўтульнае месца.

?! Знайдзіце ў тэксце словы, якія пішуцца з вялікай літары, і растлумачце іх правапіс. Падкрэсліце адной лініяй толькі тыя з іх, што з'яўляюцца ўласнымі назвамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 5. Часткі тэксту. Падзел тэксту на часткі*

**128.** Прачытайце тэкст. Як называецца лесвіца, што рухаецца сама?

***метро́***

Метро — гэта чыгунка пад зямлёй. Тут па тунэлях бягуць электрычныя цягнікі.

Як у метро светла і прыгожа! Лесвіца-эскалатар рухаецца сама. Яна, нібы ў казцы, нясе цябе ўверх або ўніз.

***эскала́тар***



?! Прыдумайце загаловак. Запішыце яго.

Колькі частак у тэксце? Чаму вы так вырашылі? Як аддзяляюцца часткі тэксту адна ад адной?

Спішыце тэкст. Кожную з частак пачынайце пісаць з чырвонага радка.

*Успомніце!*

Многія тэксты падзяляюцца на часткі.

Кожная з частак мае сваю невялікую тэму, якая дапамагае раскрыць агульную тэму тэксту і выказаць асноўную думку.

Часткі тэксту звычайна вылучаюцца з дапамогай абзаца. Кожны абзац пачынаюць пісаць з чырвонага радка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**129.** Прачытайце тэкст. Вызначце, колькі ў ім частак. Прыдумайце назву тэксту.

Навальніца насоўвалася хутка. Дзед з Сяргейкам былі ў лесе і схаваліся ад дажджу пад кашлатыя галіны елкі.

Раптам на лясной дарозе Сяргейка ўбачыў цяцерку. Яна вяла ў лясны гушчар жоўтых птушанят.

Упалі першыя кроплі дажджу. Птушаняты кінуліся да маці. Яна схавала іх пад свае крылы. Птушка так і засталася сядзець на дарозе пад дажджом, захінаючы ад непагадзі птушанят. *(Паводле Паўла Ткачова)*

?! Дзе схаваліся дзед з Сяргейкам ад навальніцы?
Каго ўбачыў хлопчык?
Як цяцерка аберагала птушанят ад дажджу?
Прачытайце асобна кожную з частак. Перакажыце тэкст з дапамогай пытанняў.

**130.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць?

Чорны бусел — лясны птах. Галава, шыя, спіна і крылы ў бусла чорныя, бліскучыя. Грудзі і жывот белыя. Дзюба чырвоная. Чорны бусел будуе гняздо на высокіх дрэвах. Ён складае яго з галінак і палак. Гняздо змацоўвае зямлёй і глінай.



**змацо́ўваць**

?! На колькі частак можна падзяліць тэкст? Пра што будзе расказвацца ў кожнай частцы?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Падзяліце тэкст на часткі па наступным плане.

1. Знешні выгляд бусла.
2. Гняздо бусла.

Спішыце тэкст.
Кожную яго частку запісвайце з чырвонага радка.

**131.** Прачытайце тэкст, падзяліце яго на тры часткі. Прыдумайце тэксту назву.

Ніна з мамай былі ў лесе. Дзяўчынка заўважыла пад кустом маленькую параненую вавёрачку. Ніна ўзяла звярка на рукі і прынесла дамоў. Усю зіму вавёрачка жыла ў Ніны. Дзяўчынка лячыла яе, карміла, даглядала. Вясной Ніна з мамай адвезлі звярка ў новы дом — запаведнік, дзе жыла вялікая і дружная сям’я вавёрак.

?! Запішыце тэкст у сшытак, адпаведным чынам выдзяляючы на пісьме кожную яго частку.

### *Урок 6. Складанне плана тэксту*

**132.** Прачытайце тэкст. Колькі ў ім частак?



Астры — восеньскія кветкі. Яны не баяцца дажджоў і невялікіх маразоў.

Ружовыя, чырвоныя, малінавыя, жоўтыя, фіялетавыя — гэтыя цудоўныя кветкі бываюць самых розных колераў. Слова «астра» ў перакладзе азначае — зорка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Прачытайце план тэксту.

1. Астры цвітуць.
2. Астра — гэта «зорка».

Прачытайце тэкст яшчэ раз. Коратка перакажыце яго па плане. Прачытайце назвы колераў. Уважліва паглядзіце вакол: на прадметы ў класе, на адзенне вашых сяброў. Знайдзіце і пакажыце такія ж колеры. Якога яшчэ колеру бываюць астры?

**133.** Прачытайце вершаваны тэкст. Сур'ёзны ён ці жартоўны?

**Абібок**

Мама вяжа рукавічкі,
Я ваксую чаравічкі.
А на кухні дзед з бабуляй
Мыюць міскі і каструлі.

Не сядзіць без справы тата —
Робіць санкі-самакаты.
Толькі коцік, абібок,
Каля грубкі грэе бок.

*(Мікола Хамянкоў)*

**Абібо́к** — гультай, лодар.







Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ





**Гру́бка** — невялікая пакаёвая печ, якая выкарыстоўваецца для абагрэву памяшкання.

Разгледзьце малюнкі. Колькі дзеючых асоб у тэксце? Хто чым займаецца? Знайдзіце адказы на пытанні спачатку на малюнках, а потым — у тэксце.
Чаму ката празвалі абібокам? Што ён робіць?
Падзяліце верш на часткі па наступным плане.

1. Усе працуюць.
2. Коцік — абібок.

Перакажыце верш сваімі словамі з дапамогай малюнкаў і плана.

**134.** Прачытайце тэкст. Дайце ацэнку паводзінам хлопчыкаў.

***напужа́ны***

Сабака злосна гаўкаў. Проста перад ім сядзела маленькае напужанае кацяня. Яно жаласна мяўкала.

Непадалёку стаялі два хлопчыкі і чакалі, што зробіць сабака.

У акно выглянула жанчына і паспешліва выбегла на двор. Яна прагнала сабаку, а хлопчыкам сказала:

— Як вам не сорамна!

Хлопчыкі здзівіліся:

— За што? Мы ж нічога не рабілі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Гэта і дрэнна, што нічога не рабілі.
*(Паводле Валянціны Асеевай; пераклад з рускай мовы)*

?! Колькі частак можна вылучыць у тэксце? Пра што расказваецца ў кожнай з іх? Складзіце план тэксту.
Дайце тэксту назву. Запішыце назву разам з планам у сшытак. Перакажыце тэкст па плане.

**135.** Прачытайце верш. Ці можна назваць яго дыялогам? Чаму?

### Матылёчкі-матылі



— Матылёчкі-матылі,
Дзе лятaлі, дзе былі?
— Мы лятaлі на лугах,
Начавалі на палях.
— Матылёчкі-матылі,
Што вы елі, што пілі?
— Быў на кветачцы мядок,
На траве салодкі сок.

*(Аляксей Пысін)*

?! Запішыце верш у сшытак. Падзяліце тэкст на дзве часткі. Якія назвы можна даць кожнай з частак верша? Запішыце назвы кожнай з частак. Што ў вас атрымалася? Перакажыце тэкст верша па складзеным плане.

**136.** Прачытайце тэкст. Спішыце яго.

### Першы снег

Уначы выпаў першы сняжок. Ён пабяліў палі і стрэхі хат. Пад чыстым абрусам апынулася зямля. Яліны на ўзлеску накрыліся высокімі шапкамі.

Рады дзеці зіме. Любяць яны зімовыя забавы. Мароз іх не палохае. А хутка прыйдзе і Новы год з ёлкай і вясёлым карагодам.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! На колькі частак падзелены тэкст?
Аб чым гаворыцца ў першай частцы? Пра што вы прачыталі ў другой?
Знайдзіце ў тэксце сказы, якія мы можам выкарыстаць як назвы да кожнай з частак.
Запішыце план тэксту ў сшытак.

**137.** Прачытайце верш. Дайце яму назву. Колькі ў ім частак? Пра што гаворыцца ў кожнай з іх? Дайце назву кожнай з частак верша. Запішыце назву і план верша ў сшытак.

На зіму мы апранулі
Дрэўцы маладыя,
Каб іх сцюжы не кранулі
І віхуры злыя.
Зайка больш не дакранецца
Да кары — збаіцца:
Кажушкі на новых дрэўцах —
Лапачкі з ігліцай.

*(Паўлюк Пранузa)*

?! Знайдзіце ў вершы адказ на пытанне: як дзеці паклапаціліся пра маладыя дрэўцы? Зачытайце гэты ўрывак.
Раскажыце пры дапамозе плана, для чаго трэба «апранаць» маладыя дрэўцы на зіму.

**138.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць? Падзяліце тэкст на дзве часткі. Запішыце яго разам з назвай у сшытак, пачынаючы кожную частку з чырвонага радка.

***збудава́нне***

Куды ні глянь — усюды **будоўля.** На прасторах нашай Радзімы ідзе вялікае будаўніцтва. У горадзе і вёсцы абавязкова што-небудзь будуецца: дом, завод, школа, ферма. І нібы ў казцы паўстае збудаванне. Працавітыя рукі будаўнікоў ствараюць гэта багацце. Будаўнік — важная і ганаровая прафесія.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Да выдзеленага слова падбярыце з тэксту аднакаранёвыя і абазначце ў іх агульную частку — корань.

## *Урок 7. Паслядоўнасць сказаў у тэксце*

**139.** Прачытайце сказы з верша Івана Муравейкі, якія перастаўлены месцамі. Ці з'яўляюцца яны тэкстам?

3. Не шуміць калоссе на прасторы,
Толькі сцірты высяцца, як горы.
1. Неўпрыкметку праляцела лета.
2. Апусцеў за вёскаю палетак.

?! Прачытайце сказы ў той паслядоўнасці, якая абазначана лічбамі. Запішыце верш, які атрымаўся, у сшытак.

**140.** Прачытайце сказы. Ці з'яўляюцца яны тэкстам? Чаму?

Шмат людзей і складаных машын дзень пры дні працуюць, каб забяспечыць краіну паперай. Адзін такі камбінат знаходзіцца ў беларускім горадзе Добрушы. Папера вырабляецца з дрэва на папяровых камбінатах.

***камбіна́т***

?! Памяняйце сказы месцамі так, каб атрымаўся тэкст. Прыдумайце да яго назву.

**141.** Разгледзьце малюнак. Што вы на ім бачыце? З каго складаецца павучыная сям'я?



Зачапіўшыся за сук,
Павуціну тчэ ... .
Злева — тоненькі сучок,
Там працуе ... .
Побач з імі — зноў ткачыха —
Маладая ... .



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дружна, спраўна з павуцінак
Незвычайны ткуць будынак.

*(Паводле Святланы Быкавай)*

?! З дапамогай малюнка ўстаўце замест кропак патрэбныя словы так, каб атрымаўся жартоўны верш.
Выпішыце з верша тры ланцужкі роднасных слоў паводле ўзору.

Узор. *Сук — сучок.*

* Абазначце ў роднасных словах агульную частку — корань.

**142.** Разгледзьце малюнкі.









?! Ці ў правільным парадку размешчаны малюнкі? Як, на вашу думку, яны павінны быць размеркаваны?
Раскажыце пры дапамозе малюнкаў, як праводзіць раніцу хлопчык.
Якую назву можна даць тэксту, што ў вас атрымаўся?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**143.** Прачытайце вершаваныя радкі. Што ў іх не так? Чаму ў вершах парушаны сэнс?



Льюцца птушак галасы,
У яркай квецені лясы,
Шмат кузурак, сонца, кветак...
Што за з'ява? Гэта вецер.



Хто аблокі век ганяе
І вандруе па планеце?
А з лістотай хто гуляе?
Здагадаўся? Гэта лета.
*(Святлана Быкава)*

?! З дапамогай малюнкаў прачытайце вершы-загадкі так, як таго патрабуе сэнс.

**144.** Прачытайце часткі тэксту. Колькі частак вы налічылі?

***прыла́джваць***

А кран тым часам яшчэ адну сцяну прынёс.

Вось пад'ёмны кран падняў адразу гатовую белую сцяну. Паставіў яе на дом. Падышлі рабочыя. Застукалі, загрукалі, пачалі прыладжваць новую сцяну.

З майго акна бачна, як насупраць будуюць новы дом.

І адразу дом стаў вышэй на адзін паверх. *(Паводле Эдуарда Шыма)*

?! Ці ў правільнай паслядоўнасці апісваюцца падзеі?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Памяняйце часткі месцамі, каб атрымаўся тэкст. Назавіце яго тэму. Прыдумайце да тэксту назву. Ці супадае назва з тэмай тэксту? Запішыце ў сшытак тэкст, які ў вас атрымаўся.

**145.** Паслухайце вершаваныя загадкі. Дапоўніць іх патрэбным словам вам дапамогуць малюнкі.



Каб вы зналі, як я рад:
Мне купілі ... .
*(Алесь Бачыла)*

Коцік-варкоцік,
Лёг на жывоцік,
Лапкі пад вушка —
Не трэба ... .
*(Ніна Галіноўская)*





І стракоча, і лапоча,
Бо навіны ведаць хоча.
Птушка гэта белабока —
Балбатлівая ... .

?! Запішыце загадкі з адгадкамі.

### *Урок 8. Падагульняльны ўрок па тэме «Тэкст»*

**146.** Прачытайце. На колькі частак падзелены тэкст? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Набліжаецца марозная ноч. Пачынаецца мяцеліца. У такі час страшна і холадна шэрым курапаткам.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Птушкі знаходзяць сабе паратунак. Ножкамі яны шпарка разграбаюць снег, выкопваюць норкі. І ўся чародка хаваецца ў пульхным сняжку.

Добра спіцца курапаткам. Снежная коўдра саграва е і хавае іх ад лясных драпежнікаў.

?! Дайце тэксту назву. Вусна адкажыце на наступныя пытанні.

Які час сутак надыходзіць?
Дзе начуюць курапаткі?
Як курапаткі рыхтуюць сабе начлег?
Што прымушае курапатак хавацца ў снег?

Знайдзіце ў тэксце і запішыце ў сшытак адказ на трэцяе пытанне.
* Запішыце адказы на ўсе астатнія пытанні.

**147.** Прачытайце тэкст. Назавіце яго тэму і асноўную думку.

### Зімовая ноч

Зімовая ноч ахінула маленькую хату лесніка. Вакол цямнеў густы лес. Віталік глядзеў з акна на лясную казку. На неба выплыў востры месячык. Ён асвяціў усё наваколле. Снег адразу заззяў рознымі колерамі. На паляну выйшлі магутныя алені. Вялізныя рогі ўпрыгожвалі іх галовы. З ноздраў вылятала па́ра. Лясныя прыгажуны сталі есці свежае сена.

?! Падзяліце тэкст на часткі па наступным плане.

***навако́лле***

1. Хараство зімовай ночы.
2. Алені на паляне.

Успомніце, як на пісьме аддзяляюцца адна ад адной часткі тэксту. Запішыце тэкст у сшытак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы да слова *лес*. Абазначце ў іх агульную частку — корань.
* Прыдумайце і запішыце аднакаранёвыя словы да слова *зіма.*

**148.** Прачытайце верш. Вызначце яго тэму і асноўную думку. Дайце вершу назву.
На колькі частак можна падзяліць тэкст? Чаму? Успомніце, як можна аддзяліць адну ад адной вершаваныя часткі тэксту.
Запішыце тэкст разам з назвай у сшытак, падзяляючы яго на сэнсавыя часткі.

Ужо **мароз.** Пасохлі травы.
На **дрэвах** дзе-нідзе лісток.
І **вожык**, наш звярок рухавы,
Аблюбаваў для сну куток.
Прачнецца жэўжык, і на ўзлеску
Ці на паляначках лясных
Ён сабярэ букет пралесак
І выйдзе ў першы дзень вясны.



**Жэ́ўжык** — свавольнік, гарэза.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Вусна адкажыце на наступныя пытанні.

Калі засынае вожык?
Калі ён прачынаецца?
Чаму вожык зімой спіць?

Што вы ведаеце пра тое, як праводзяць зіму іншыя звяры? Адкажыце з дапамогай малюнка.
Растлумачце правапіс галосных ***о, э*** ў выдзеленых словах.

**149.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак.
Падзяліце тэкст на сэнсавыя часткі. Аб чым гаворыцца ў першай частцы? Пра што вы прачыталі ў другой частцы?
Запішыце назву і план тэксту ў сшытак.

Міша **ходзіць** у сёмы клас. **Хадзіць** у школу яму недалёка. Школа стаіць **за рэчкай**. Зімой **рака** — добры каток для дзяцей. **Мароз** скоўвае ваду ў рэчцы вельмі моцна. Але сцюжа і **маразы** не палохаюць дзяцей.

?! Выпішыце з тэксту выдзеленыя словы парамі паводле ўзору.

Узор. *Ходзіць* — *хадзіць*, ... .

* Прачытайце тэкст яшчэ раз. Запішыце яго па памяці.
Вызначце ў словах націскныя склады і растлумачце правапіс галосных ***о, э — а***.

**150.** Прачытайце тэкст. Што ў ім не так?

***удалечыні́***

Поле іскрыцца, слепіць белізной вочы Сонца свеціць па-веснавому Удалечыні відаць шэры зімовы лес  Вось і горка Тут многа дзяцей Ох і весела дзецям **ляцець з гары** на лыжах і санках.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Запішыце тэкст правільна, вызначаючы яго сэнсавыя часткі і расстаўляючы знакі прыпынку.
Растлумачце значэнне выдзеленых слоў для пэўнага сказа. Якое яшчэ значэнне можа мець гэты выраз у іншай сітуацыі?

**151.** Прачытайце верш. На колькі сэнсавых частак яго можна падзяліць? Пра што гаворыцца ў першай частцы? Пра што — у другой?

Разгулялася наўкруг
Юная мяцеліца.
Мне пад **н..гі** белы пух
Сцелецца і сцелецца.
Зіхаціць уся зямля
Радасцю святлістаю,
І **т..птаць шк..дую** я
Коўдру **сер..брыстую.**
*(Міхась Пазнякоў)*



Дайце вершу назву. Запішыце тэкст разам з назвай у сшытак.
Устаўце прапушчаныя літары ў выдзеленых словах.

## Праверце сябе

Адкажыце на пытанні.

Што называецца тэкстам?
Якія віды тэкстаў вы можаце назваць?
Як правільна запісаць тэкст у сшытак?
Каго мы называем аўтарам тэксту?
Што такое тэма тэксту? Як назва тэксту звязана з яго тэмай?
Што такое асноўная думка тэксту?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Выберыце правільны варыянт адказу.

1. а) Тэкст — гэта некалькі слоў, звязаных паміж сабой па сэнсе.

б) Тэкст — некалькі сказаў, звязаных паміж сабой па сэнсе.

в) Тэкст — гэта асобныя сказы, не звязаныя сэнсава.

2. а) Аўтар — той, хто прачытаў тэкст.

б) Аўтар — той, хто напісаў тэкст.

в) Аўтар — той, хто спісаў тэкст у сшытак.

3. а) Асноўная думка тэксту — тое, што аўтар хацеў данесці да нас.

б) Асноўная думка тэксту — тое, што і назва тэксту.

в) Асноўная думка тэксту — гэта тэма тэксту.

4. а) З чырвонага радка пішацца кожнае слова ў тэксце.

б) З чырвонага радка пішацца кожны сказ у тэксце.

в) З чырвонага радка пішацца пачатак тэксту.

5. а) З вялікай літары пішацца кожнае слова ў тэксце.

б) З вялікай літары пішацца толькі першае слова ў тэксце.

в) З вялікай літары пішацца першае слова кожнага сказа ў тэксце.

## СКАЗ

### *Урок 1. Агульнае паняцце пра сказ*

**152.** Прачытайце народныя прыметы.

Кошка скруцілася клубком — да марозу.

Калі кроплі расы вісяць раніцай на кончыках лістоў ці травы, будзе дождж.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Варона хавае дзюбу пад крыло — да сцюжы.

Калі падчас марозу вавёрка пакідае гняздо і спускаецца з дрэва — чакай адлігі.

?! Ці з'яўляюцца гэтыя народныя прыметы сказамі? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

*Успомніце!*

**Сказ** — гэта адно або некалькі слоў, якія выражаюць закончаную думку.

*Вечарэе. Дарога прывяла нас у вялікае сяло.*

Усе словы ў сказе звязаны паміж сабою па сэнсе.

**153.** Прачытайце верш. Пра надыход якой пары года гаворыцца ў ім?

Сёння сыпаў свежы снег!  
Саўка стрымгалоў пабег.  
Для дзіцячага кутка  
Стаў **ляпіць снегавіка.**  
*(Уладзімір Мацвеенка)*

?! Колькі сказаў у вершы? Ці выражае кожны з іх закончаную думку? Прачытайце выдзеленыя словы. Растлумачце іх правапіс.

**154.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму. Дайце тэксту назву.

Бабры зімуюць у сваіх заснежаных хатках. Праз падводны выхад яны выплываюць пад лёд. Кормяцца бабры запасамі асінавага галля, якое нарыхтавалі яшчэ восенню. Ядуць яны і салодкія карані гарлачыкаў. Зімою бабры рэдка пакідаюць сваё жыллё. *(Паводле Віталя Вольскага)*

?! Вызначце колькасць сказаў у тэксце. Запішыце першы і апошні сказы ў сшытак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**155.** Прачытайце сказы і пытанні ў дужках. Адкажыце на пытанні і прадоўжыце сказы.

Надышла зіма (як а я?) ... .
Холадна стала (д з е?) ... .
Цяжка знайсці ежу (к а м у?) ... .

С л о в ы  д л я  в ы б а р у: *на двары, у лесе, у полі; халодная, снежная; звяры і птушкі.*

?! Запішыце ў сшытак сказы, якія ў вас атрымаліся.

**156.** Прачытайце вершаваныя загадкі. Дапоўніце сказы патрэбным словам. Запішыце загадкі разам з адгадкамі ў сшытак.

На ялінцы ля палянкі
Па галінках скачуць вёртка,
Нібы рыжыя маланкі,
Працавітыя ... .





За палянкаю, на ўзгорку,
Пад кустом каліны горкай
Не лянуецца — штодня
Рые норку ... .

Як іголльнік, ён калючы,
Не відаць вачэй і ножак.
Ля ламачча важкай кучы
У клубок скруціўся ... .
*(Паводле Святланы Быкавай)*



**Ламáчча** — сухое галлё.

Пагутарыце са сваім суседам (суседкай) па парце. Раскажыце адзін аднаму, што вы ведаеце пра гэтых звяркоў — герояў загадак. Адкажыце на наступныя пытанні.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дзе яны жывуць? Чым харчуюцца? Як зімуюць? Дзікія яны ці свойскія? Чаму вы так вырашылі?

**157.** Прачытайце словы. Памяняйце іх месцамі, каб атрымаліся народныя выказванні. Запішыце іх у сшытак.

Вецер, не, гнуткага, дрэва, зломіць.
Бароніць, усякая, сваё, птушка, гняздо.
Мілая, з, варона, і, боку, роднага.

?! Як у народзе называюць такія выказванні? Растлумачце іх сэнс. Ці з’яўляюцца яны сказамі? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

**158.** Прачытайце народныя прыметы. Ці з’яўляецца кожнае з гэтых выказванняў сказам? Чаму?

Калі арэхаў шмат ды грыбоў мала — зіма будзе **снежная** ды суровая.

Калі гарачым будзе ліпень, то марозным будзе **снежань**.

Калі **снег** увосень выпадае рана, то і вясна будзе ранняй.

?! Запішыце сказы ў сшытак. Пастаўце націск у выдзеленых словах. Растлумачце правапіс націскной галоснай ***е*** ў корані слова. Як можна назваць усе выдзеленыя словы? Ад якога слова яны ўтварыліся? Абазначце ў іх агульную частку — корань.

### *Урок 2. Віды сказаў па мэце выказвання*

**159.** Прачытайце. Закончыце сказы. Праверце сябе па правілах, размешчаных на форзацы 1.

Адно або некалькі слоў, якія выражаюць закончаную думку, называюць … .

Сказ, у якім аб нечым паведамляецца, называецца … . У канцы яго ставіцца … .



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Сказ, у якім аб нечым пытаюцца, называецца … . У канцы яго ставіцца … .

Сказ, у якім выказваецца просьба, загад, пажаданне (або пабуджэнне да дзеяння), называецца … . У канцы яго можа стаяць … або … .

Сказ, у якім выказваецца моцнае пачуццё, называецца … . У канцы яго ставіцца … .

**160.** Прачытайце адзін і той жа сказ, але з рознай інтанацыяй.

У нядзелю мы едзем у цырк.
У нядзелю мы едзем у цырк?
У нядзелю мы едзем у цырк!

?! Якія знакі прыпынку стаяць у канцы кожнага сказа? У якім з іх задаецца пытанне? Запішыце гэты сказ у сшытак.

**161.** Прачытайце вершаваныя загадкі. Адгадайце іх з дапамогай малюнкаў.

Сонца спаць пайшло за горы,
Устаюць на вахту зоры,
Каб не збочыў дзе з дарогі
Уночы брат іх крутарогі.

*(Надзея Сторажава)*





Хто працуе на сяле
Шчыра і заўзята,
Каб было ў нас на стале
Усяго багата?
Каб у радасці цвіла
З году ў год няспынна
І магутнаю была
Родная краіна?

*(Артур Вольскі)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Заўзя́та** — старанна, з захапленнем, з запалам.

?! Вызначце, пры дапамозе якога сказа (апавядальнага, пытальнага або пабуджальнага) утворана першая загадка.
З якіх сказаў складаецца другая загадка?
Прачытайце другую загадку выразна, як таго патрабуюць знакі прыпынку.

**162.** Выразна прачытайце верш.

Чорны, белы хлеб ці здобу
Еш, але не забывай
Быць **удзячным** хлебаробу,
Што **вырошчваў ураджай.**
*(Артур Вольскі)*

?! Колькі сказаў у вершы? Назавіце від сказа (апавядальны, пытальны або пабуджальны).
Назавіце тэму і асноўную думку гэтага верша.
Запішыце верш у сшытак, падзяляючы на склады для пераносу выдзеленыя словы.

**163.** Прачытайце тэкст.

У пачатку студзеня вучні разам з настаўнікам пайшлі на экскурсію. Яны хацелі паназіраць за жыццём зімовага лесу. Там было зацішна і спакойна. Не чуваць было птушыных галасоў, пахаваліся ў зімовыя хаткі і лясныя звяры.

Велічныя хвоі паважна півалі снежнымі шапкамі. Тыя ж дрэвы, што пазбавіліся ад лісцця, гойдалі на сваіх галінках чысцюткія сняжынкі.

Лес ахутаў доўгі зімовы сон.

**экску́рсія**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! З якой інтанацыяй вы чыталі? Як называюцца сказы такога віду? Вусна адкажыце на наступныя пытанні.

1. Куды хадзілі дзеці разам з настаўнікам?
2. За чым яны назіралі?
3. Як выглядаюць дрэвы ў пачатку студзеня?

* З дапамогай пытанняў перакажыце тэкст, захоўваючы апавядальную інтанацыю.

**164.** Прачытайце ўрывак з верша. Захоўвайце патрэбную інтанацыю. Запішыце яго ў сшытак.

**Зямля глядзіць азёрамі-вачыма**
На ясны свет, што стыне ў красе.
Як чыста, бы святло абшары вымыла,
Як ціха — быццам зніклі людзі ўсе.

*(Уладзімір Караткевіч)*

?! Колькі сказаў у гэтым урыўку? Назавіце від кожнага сказа. Як вы разумееце сэнс выдзеленага выразу? Чаму Беларусь часта называюць сінявокай?

**165.** Прачытайце. Назавіце ўсе віды сказаў, з якіх складзены гэты верш.

— Што, сябры, для жыта трэба?
— Усім вядома — трэба глеба.
— А для птушкі?
— Вышыня.
— А для казкі?
— Цішыня.
— Ну, а што для весялосці?
— Каб часцей бывалі госці!

*(Міхаіл Гелер)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Глéба** — верхні пласт зямлі, на якім вырастаюць расліны.

Запішыце ў сшытак першыя два радкі верша.
Ці можна іх назваць дыялогам? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

**166.** Прачытайце тэкст выразна, як таго патрабуюць знакі прыпынку. Ці можам мы адзначыць, што эмацыянальная афарбоўка тэксту ўзмацняецца з кожным наступным сказам?

## Родныя шляхі

Ёсць штосьці незвычайна прыгожае ў прывольных шляхах Беларусі. Шырока і размашыста пралягаюць яны ад вёскі да вёскі. Колькі хараства і чароўнай прывабнасці ў іх далях! Колькі новых малюнкаў абяцаюць яны вачам і сэрцу падарожнага!

А якая ж сіла закладзена ў гэтых прасторах родных шляхоў! Хто перакажа нам іх казкі, разгадае думкі?

*(Паводле Якуба Коласа)*

Назавіце віды сказаў, якія ёсць у тэксце. Ахарактарызуйце інтанацыю кожнага з гэтых сказаў.

**167.** Прачытайце народныя выказванні. Да пачатку сказа з левага слупка падбярыце адпаведны працяг з правага слупка. Запішыце выказванні ў сшытак.

| | |
|---|---|
| Спачатку падумай, | умацуеш здароўе. |
| Рана ўстанеш — | а потым гавары. |
| Зоймешся спортам — | многа зробіш. |

Знайдзіце сярод сказаў апавядальныя і зачытайце іх. Вызначце і прачытайце з адпаведнай інтанацыяй пабуджальны сказ.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**168.** Прачытайце наступныя выказванні. Растлумачце іх сэнс. Назавіце від гэтых сказаў.

Век чалавек жыве — век вучыцца.

Не патрэбна казаць, што рабіў, а патрэбна, што зрабіў.

Гаварыць трэба меней, а думаць болей.

Зрабіце з гэтых апавядальных сказаў пабуджальныя і дапішыце іх паводле ўзору.

Узор. *Век жыві — ... .*

## *Урок 3. Запіс сказа*

**169.** Прачытайце. Ці правільна запісаны сказы? Чаго ў іх не хапае?

**На катку**

Надышлі марозныя дзянькі На школьным стадыёне залілі вялікі каток Цяпер кожны вечар дзеці з задавальненнем бавяць на ім свой час Адны з іх катаюцца спрытна Другія толькі вучацца трымацца на каньках Як жа весела дзецям на катку

Запішыце тэкст у сшытак. Пастаўце неабходныя знакі прыпынку адпаведна інтанацыі.

**170.** Прачытайце тэкст. Што ў ім не так? Падзяліце тэкст на сказы і запішыце ў сшытак, расстаўляючы знакі прыпынку.

***бярве́нне***

ноч зімой доўгая а дзень кароткі у восем гадзін раніцы яшчэ цёмна днём на сонцы у паветры зіхаціць снежны пыл ён падымаецца ветрам ноччу ад моцнага марозу трашчыць бярвенне



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Колькі сказаў атрымалася? Прачытайце тэкст, улічваючы знакі прыпынку.

*Успомніце!*
Першае слова ў сказе пішацца з вялікай літары.
У канцы сказа у залежнасці ад інтанацыі ставіцца кропка, пытальнік або клічнік.

**171.** Прачытайце сказы. Вызначце від кожнага сказа.

Трэба пайсці ў школьную майстэрню. Холадна і галадна птушкам зімой. Але дзе знайсці матэрыялы для кармушак? Патрэбна зрабіць ім кармушкі! Як прыемна зараз назіраць за птушкамі!

***матэрыя́л***

?! На якую тэму ўсе гэтыя сказы?
Ці ў правільнай паслядоўнасці размешчаны сказы?
Паспрабуйце прачытаць сказы па парадку: так, як маглі разгортвацца падзеі. Ці з'яўляецца тое, што вы прачыталі, тэкстам? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

**172.** Разгледзьце малюнкі. Суаднясіце з імі сказы з папярэдняга практыкавання.

***майстэ́рня***







Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ





?! Запішыце сказы ў патрэбнай паслядоўнасці.

З дапамогай тэксту, што атрымаўся, і малюнкаў прыдумайце дыялог паміж дзецьмі ў час, калі яны майструюць кармушкі.

**173.** Прачытайце словы. Памяняйце іх месцамі, каб утварыліся сказы.

**Той, доўга, працаваць, хто, спаць, не, любіць, будзе.**
**Лёгка, як, зрабіць, не, сказаць, так.**
**Хапае, не, часу, гультаю, усё, няўмеку, ды.**

?! Растлумачце сэнс прыказак, што ў вас атрымаліся. Запішыце іх у сшытак.

**174.** Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы.

***ззя́нне***

### Паўночнае ззянне



гэта з’ява добра вядомая жыхарам Поўначы паўночнае ззянне можна назіраць там даволі часта аднак і ў Беларусі некалькі разоў можна было бачыць гэты цуд



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Спішыце тэкст. Правільна афармляйце сказы на пісьме.
Разгледзьце малюнак. Ці даводзілася вам бачыць з'яву, пра якую гаворыцца ў тэксце?
* Прачытайце тэкст яшчэ раз. Запішыце яго па памяці.

**175.** Складзіце сказы.

Зімой, дождж, Беларусі, у, пайсці, можа.
З'явай, землетрасенне, незвычайнай, для, нас, з'яўляецца.
Вулканаў, тэрыторыі, на, Беларусі, няма.

?! Запішыце сказы, што ў вас атрымаліся. Правільна афармляйце іх на пісьме.
Аб чым вы даведаліся з гэтых сказаў?

## *Урок 4. Галоўныя члены сказа. Дзейнік*

**176.** Прачытайце тэкст.

### Сям'я

Гадзіннік адлічвае шэсць гадзін. Бацька смажыць рыбу. Каця нясе хлеб. Паўлік кладзе на стол відэльцы і нож. Мама падае́ гарачую бульбу.

?! Колькі сказаў у гэтым тэксце?
Пра што гаворыцца ў першым сказе? Пра каго гаворыцца ў наступных сказах?
Спішыце сказы. Падкрэсліце адной лініяй словы *бацька, Каця, гадзіннік, Паўлік*. Пастаўце да іх пытанні *хто?* або *што?*

**177.** Прачытайце тэкст. Вызначце, пра каго або пра што гаворыцца ў кожным са сказаў.

***со́нца***

### Ранне

За лесам ружавее **ўсход**. Начныя **цені** спаўзаюць з поля. Успыхваюць першыя **праменьчыкі** сонца. Вясёлым



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

бляскам загараюцца **вокны** хат. Яркае **сонца** падымаецца ўсё вышэй і вышэй.

?! Пастаўце пытанні *хто?* або *што?* да выдзеленых слоў. Спішыце апошні сказ. Выдзеленыя словы падкрэсліце адной лініяй.
Звярніце ўвагу на выраз «сонца падымаецца ўсё вышэй». Як можна сказаць па-іншаму? Запішыце сказ, які ў вас атрымаўся.
Знайдзіце слова, якое абазначае, пра што гаворыцца ў сказе, і падкрэсліце яго.

*Запомніце!*
Слова, якое абазначае, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе, называецца **дзейнікам**.
Дзейнік адказвае на пытанні **хто?** або **што?**

**178.** Прачытайце скорагаворку. Колькі ў ёй сказаў? Падрыхтуйцеся да хуткага чытання.

Кузьма **падкузьміў** Ягора.
Ягор **аб'ягорыў** Рыгора.
Дзямід **абмікіціў** Мікіту.
Мікіта **змікіціў** — пачаў валакіту.
*(Васіль Вітка)*

**Валакі́та** — зацягванне з вырашэннем якой-небудзь справы.

?! Вызначце, пра каго гаворыцца ў кожным з гэтых сказаў. Чым з'яўляюцца такія словы ў сказе? Пастаўце да іх пытанні *хто?* або *што?*
Спішыце. Падкрэсліце дзейнікі адной лініяй.
Як вы разумееце значэнне выдзеленых слоў?

**179.** Прачытайце тэкст. Назавіце яго тэму. Дайце тэксту назву.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Зімовае **сонца** ледзь уздымалася над лесам, хоць было яшчэ толькі паўдня. **Снег** знайшоў сабе прытулак, дзе толькі мог. Месцамі над лясной сцежкай нізка звісалі **галіны** старых сосен. Прыгледзеўшыся, можна было ўбачыць ялінкі, падобныя да казачных снягурачак у белых кажушках і шапачках. *(Паводле Аляксея Кулакоўскага)*

?! Спішыце тэкст. Падкрэсліце выдзеленыя словы адной лініяй і пастаўце да іх пытанні.
Як называюцца такія словы? На якія пытанні яны адказваюць, што абазначаюць?

**180.** Прачытайце верш. Колькі ў ім сказаў?

Мчыцца шпарка, мчыцца бойка
Па сумётах коней тройка.
Паганяе іх сама
Белакрылая зіма...
*(Уладзімір Мазго)*

?! Запішыце верш у сшытак.
У сказах вызначце і падкрэсліце дзейнікі, пастаўце да іх пытанні.
Якую тройку коней мае на ўвазе паэт? Як можна сказаць па-іншаму? Успомніце назвы зімовых месяцаў. Запішыце іх у сшытак.

**181.** Прачытайце тэкст. Колькі ў ім сказаў?

Кожную раніцу **Толік** спяшаецца ў сад. **Хлопчык** насыпае ў місачку крупы і зярняткі. А **снегіры** ўжо сядзяць на яблыні.

**Птушкі** чакаюць Толіка.

?! Пастаўце да выдзеленых слоў пытанні *хто?* або *што?*
Спішыце тэкст, падкрэсліце выдзеленыя словы адной лініяй.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 5. Галоўныя члены сказа. Выказнік*

**182.** Прачытайце сказы.

Ноччу **наляцеў** моцны вецер.
Мароз **закаваў** зямлю і рэкі ў моцныя абцугі.
Зімой птушкі **ляцяць** бліжэй да чалавечага жытла.

?! У кожным з гэтых сказаў вызначце дзейнік. З дапамогай вызначаных слоў адкажыце, што гаворыцца пра вецер, мароз і птушак. На якія пытанні адказваюць выдзеленыя словы?

Спішыце сказы. Падкрэсліце словы-дзейнікі адной лініяй, а выдзеленыя словы — дзвюма.

**183.** Прачытайце сказы. Ці з'яўляюцца яны тэкстам? Чаму?

Старэнькая бабуля **зайшла** ў аўтобус. Алеся ветліва **прапанавала** ёй сваё месца. Бабуля **падзякавала** дзяўчынцы.

?! Колькі сказаў у тэксце? У кожным сказе вызначце дзейнік. Ад дзейніка пастаўце пытанне *што зрабіла?* да выдзеленых слоў.

Узор. *Старэнькая бабуля (што зрабіла?) зайшла ў аўтобус.*

Запішыце сказы ў сшытак. Падкрэсліце дзейнік адной лініяй, а словы, да якіх вы ставілі пытанні, дзвюма лініямі.

*Запомніце!*
Слова, якое абазначае, што ў сказе гаворыцца пра дзейнік, называецца **выказнікам**.
Выказнік адказвае на пытанні **што робіць? што зробіць? што рабіў? што зрабіў? што рабілі?** і падобныя.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**184.** Прачытайце сказы. Ці з’яўляюцца яны тэкстам? Запішыце сказы ў сшытак.

**замігце́ць**

Замігцелі ў небе зоркі. Выглянуў з-за хмар месяц. Падзьмуў марозны вецер. Халодная зімовая ноч апусцілася на зямлю.

?! Пры дапамозе пытанняў *хто?* або *што?* знайдзіце ў сказах дзейнікі. Падкрэсліце іх адной лініяй.
Каб вызначыць выказнік, вусна пастаўце ад дзейніка пытанне. Працуйце паводле ўзору.

Узор. *Зоркі (што зрабілі? )* … .

Падкрэсліце выказнікі ў сказах дзвюма лініямі.

**185.** Складзіце сказы, далучаючы ў пачатку патрэбныя па сэнсе словы.

… **працуе** ў шахце.
… **даглядае** лес.
… **пячэ** хлеб.
… **грае** на скрыпцы.

Словы для выбару: пекар, скрыпач, ляснік, шахцёр.

?! Запішыце сказы ў сшытак.
Падкрэсліце дзейнік адной лініяй.
Пастаўце ад дзейніка пытанне *што робіць?* да выдзеленага слова.
Падкрэсліце выказнік дзвюма лініямі.

Узор: *Пекар (што робіць? ) пячэ*.

*Запомніце!*
**Дзейнік** і **выказнік** — галоўныя члены сказа. Разам яны ўтвараюць сказ.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**186.** Складзіце са слоў сказы, пачынаючы з выдзеленага слова. Запішыце іх у сшытак. Правільна афармляйце сказы на пісьме.

**Сярожаў**, служыць, брат, на граніцы.
фотаздымак, Алёша, свой, прыслаў, **нядаўна.**
**на здымку**, стаіць, з сабакам, пагранічнік.
граніцу, Сярожаў, ахоўвае, **пільна**, брат.
з братам, **Сярожа**, хуткай, чакае, сустрэчы.

**Пі́льна** — старанна, рупліва, дбайна.

?! Вызначце ў сказах галоўныя члены (дзейнік і выказнік) з дапамогай пытанняў. Падкрэсліце дзейнік адной лініяй, а выказнік — дзвюма.

**187.** Прачытайце верш. Колькі ў ім сказаў?

Глядзіць у вокны зімні вечар.
Кладзецца змрок на цесны двор.
Мароз-мастак рукой старэчай
На шыбах піша свой узор.

*(Якуб Колас)*

?! Вызначце ў сказах дзейнік і выказнік.
Запішыце іх парамі.

У з о р. *<u>Вечар</u> (што робіць? ) <u>глядзіць</u>*.

Як вы разумееце выраз «глядзіць у вокны зімні вечар»?

*Запомніце!*
У нашым маўленні ёсць шмат слоў, якія ўжываюцца з розным значэннем (прамым і пераносным). Значэнне слова выяўляецца ў сувязі з іншымі словамі ў сказе.
*<u>Хлопчык</u> **бяжыць** у школу. <u>Рэчка</u> **бяжыць** каля вёскі. <u>Час</u> **бяжыць** вельмі хутка.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**188.** Прачытайце сказы. Запішыце іх у сшытак. З дапамогай пытанняў вызначце ў кожным з гэтых сказаў дзейнік і выказнік. Падкрэсліце іх.

Ідзе дождж. Ідзе гадзіннік. Ідзе чалавек.

?! Растлумачце, якое значэнне мае слова *ідзе* ў кожным з трох сказаў. У якім выпадку слова *ідзе* выкарыстана ў прамым значэнні, а ў якіх — у пераносным?

**189.** Прачытайце верш. Як вы разумееце значэнне выразу «мароз загрукаў па дворы»? Як можна сказаць па-іншаму?

Заснулі белыя палеткі.
Мароз загрукаў па двары.
Зірнеш з акна — нібыта кветкі,
На сініх вербах снегіры.
*(Анатоль Вялюгін)*



**Пале́так** — участак поля, які выкарыстоўваецца пад пасевы.

?! Запішыце ў сшытак першы і другі сказы верша. З дапамогай правілаў вызначце ў сказах галоўныя члены. Падкрэсліце іх.
Разгледзьце малюнак. Што вы можаце расказаць пра гэтых птушак? Ці бачылі вы іх? Дзе і калі? Ці можна ўбачыць іх у нашым краі летам? Чаму?

**190.** Прачытайце прыказкі. Як вы разумееце іх сэнс? Якія тэмы аб'ядноўваюць гэтыя выказванні? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Куды вецер вее, туды голле гнецца.
Куды іголка, туды і нітка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Кожная сасна свайму бору песню спявае.
Кожны кулік сваё балота хваліць.

?! Запішыце ў сшытак трэці і чацвёрты сказы. З дапамогай правілаў вызначце галоўныя члены. Падкрэсліце іх.

## *Урок 6. Даданыя члены сказа*

**191.** Прачытайце сказы парамі. Чым яны адрозніваюцца?

Надышоў вечар. — Надышоў доўгі зімовы вечар.
Свецяць зоркі. — Высока ў небе ярка свецяць зоркі.

?! Спішыце сказы, што запісаны справа.
Падкрэсліце дзейнік адной лініяй, выказнік — дзвюма, астатнія словы — хвалістай лініяй.

> *Запомніце!*
> У сказах, акрамя дзейніка і выказніка, могуць быць і іншыя словы. Гэтыя словы называюцца **даданымі членамі сказа**.
> *Высока ў небе ляцяць птушкі.*

**192.** Прачытайце і адгадайце загадкі з дапамогай малюнкаў.



На акенцы вырас лес,
Зіхатлівы, белы ўвесь!

Белыя зорачкі
Сыплюцца на ўзгорачкі…



?! Запішыце загадкі разам з адгадкамі ў сшытак.
Вызначце ў сказах галоўныя і даданыя члены сказа.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прачытайце толькі галоўныя члены сказа.
Ці можна было б адгадаць загадкі, каб у сказах не было даданых членаў?

**193.** Прачытайце абодва тэксты. Які з іх спадабаўся вам больш? Чаму?

1. Зіма прыйшла. Выпаў сняжок. Паснулі палеткі.

2. Вось і зіма прыйшла. Выпаў чысценькі бялюткі сняжок. Пад снегавым пухавічком паснулі палеткі.

**?!** Запішыце тэкст, які вам больш спадабаўся, у сшытак. Успомніце, як правільна афарміць запіс тэксту.
Падкрэсліце ў сказах галоўныя і даданыя члены (калі яны ёсць).

**194.** Прачытайце сказы. Ці можна аб’яднаць іх адзінай тэмай? Чаму?

Гарыць касцёр. Дровы патрэскваюць. Дзеці грэюцца.

**?!** Разгледзьце малюнак. Што вы на ім бачыце?





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Гледзячы на малюнак, дапоўніце кожны сказ даданымі членамі. Запішыце сказы ў сшытак. Прачытайце. Ці атрымаўся ў вас тэкст?
Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены сказа адпаведнымі лініямі.

**195.** Выразна прачытайце верш. Паніжайце голас і спыняйцеся ў канцы кожнага сказа. Звярніце ўвагу на працяжнік як знак прыпынку.

Бягуць удалеч цягнікі няспынна.
Па сінім моры карабель плыве.
Ёсць на зямлі цудоўная краіна.
Ты — сын яе.

*(Леанід Дайнека)*

?! Спішыце верш. У першым і другім сказах знайдзіце галоўныя і даданыя члены сказа. Падкрэсліце дзейнік адной лініяй, выказнік — дзвюма, даданыя члены сказа — хвалістай лініяй.
Як вы разумееце наступны выраз: «Ты — сын сваёй краіны»?

**196.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Вочы страшаць, а рукі робяць.
Маленькая лянота да вялікай дарасце.
Смеламу перамога ідзе насустрач.

?! Вызначце ў сказах галоўныя і даданыя члены.
Спішыце прыказку, якая вам больш спадабалася. Падкрэсліце ў ёй галоўныя і даданыя члены сказа адпаведнымі лініямі.

**197.** Прачытайце тэкст. Як вы лічыце, якая з'ява адбывалася ўначы? У якіх сказах мы можам знайсці адказ на гэтае пытанне?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Раніца ў лесе

Раніцай вецер сціх. Снег навіс белымі карункамі на дрэвах. На **яловых** лапках блішчаць сняжынкі. **Стройныя** елкі любуюцца сваім зімовым убраннем.

*(Паводле Клаўдзіі Каліны)*

**убра́нне**

?! Спішыце тэкст, падзяляючы выдзеленыя словы на склады для пераносу.

Знайдзіце ў кожным з гэтых сказаў дзейнік, выказнік і даданыя члены сказа. Падкрэсліце іх адпаведнымі лініямі.

### *Урок 7. Дапаўненне сказа даданымі членамі*

**198.** Прачытайце. Ці прыгожы атрымаўся тэкст? Што ў ім не так?

Цяжка пералічыць усе бібліятэкі (наша краіна). Так многа іх.

Бібліятэка адкрывае для нас чароўны свет. Хто прачытаў (новая кніга), той пазнаў яшчэ штосьці новае. Ён будзе ісці далей у свет ведаў. Даведаецца пра (выдатныя людзі), пра цікавыя падзеі.

?! Змяніце словы ў дужках так, каб атрымаўся звязны тэкст. Запішыце яго ў сшытак.

**199.** Прачытайце. Дапоўніце дадзеныя словы і спалучэнні слоў так, каб атрымаліся сказы.

**адлі́га**

... ... пасля адлігі. ... ... цвёрдай скарынкай. ... ... па ёй лёгка і хутка, як па цвёрдай зямлі. А грузны ... ... . Вострыя ... ледзяной скарынкі балюча ... яму ногі.

*(Паводле Анатоля Клышкі)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Словы і спалучэнні слоў для выбару: *ударыў мароз; снег пакрыўся; воўк бяжыць; лось правальваецца; краі, рэжуць.*

?! Ці з'яўляюцца дадзеныя словы сказамі? Ці зразумела, аб чым паведамляецца? Чаму?
Ці можна назваць гэтыя сказы тэкстам? Чаму?
Запішыце тэкст у сшытак. Падкрэсліце ў сказах галоўныя члены.
Як вы разумееце выраз «ударыў мароз»? Як яшчэ гавораць пра вельмі моцны мароз?

*Запомніце!*
Галоўныя члены сказа — дзейнік і выказнік — утвараюць **аснову сказа**.
*Зіма прыйшла.*
Даданыя члены паясняюць дзейнік і выказнік.

**200.** Прачытайце наступныя словы і спалучэнні слоў. Дапоўніце словы і спалучэнні слоў так, каб атрымаліся сказы.

Халодная, у гэтым годзе.
Снегавыя сумёты.

Словы для выбару: *настала, зіма; мяцеліца, намяла́.*

?! Складзіце некалькі варыянтаў першага сказа. Запішыце іх у сшытак.

**201.** Прачытайце сказы. Ці з'яўляюцца яны тэкстам? Чаму?

Ударылі маразы. Залілі каток. Алесь і Ян гуляюць. Аленка катаецца. Дзеці радуюцца.

?! З дапамогай малюнка дапоўніце кожны сказ даданымі членамі так, каб атрымаўся тэкст.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



**202.** Прачытайце тэкст. Запішыце яго ў сшытак. Замест кропак устаўце прапушчаныя словы, якія падыходзяць па сэнсе.

Шэрая курапатка — вельмі карысная ... . Летам яна знішчае шкодных насякомых. Абараняе ад іх злакавыя ..., лясныя ... . Зімою курапаткі харчуюцца насеннем пустазелля. Здзёўбваюць ... шыпшыны. Мёрзлая зеляніна азімых — іх любімы ... .

***здзёўбваць***

**Пустазе́лле** — дзікая расліна, якая засмечвае пасевы культурных раслін.

Словы для выбару: *расліны, ласунак, дрэвы, птушка, ягады.*

Яшчэ раз уважліва перачытайце тэкст, які ў вас атрымаўся.

Вусна перакладзіце на рускую мову першы сказ.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**203.** Прачытайце вершаваныя загадкі. Гледзячы на малюнкі, знайдзіце словы, якія падыходзяць па сэнсе.

**Неўтаймоўны**, спрытны, дужы,
Як маланка, як агеньчык,
**Скача** ён па вокнах, лужах —
Жвавы сонечны … .
*(Святлана Быкава)*





Носік — рыльца-пятачок,
Хвосцік — радасны кручок
І **ружовенькая** спінка.
Дзеці **знаюць** — гэта … .

***неўтаймо́ўны***

Запішыце вершы ў сшытак. Якімі членамі сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы? Падкрэсліце іх адпаведнымі лініямі.

## *Урок 8. Падагульняльны ўрок па тэме «Сказ»*

**204.** Прачытайце тэкст. Колькі ў ім сказаў?

### Неразлучныя сябры

Замерзла невялікае азярцо. Толік выйшаў пакатацца на каньках. Ён разганяўся ўсё хутчэй. Нечакана тонкі лёд трэснуў. Хлопчык праваліўся ў халодную ваду. Прарэзлівыя крыкі пачуў Косцік. Ён кінуўся на дапамогу. Косцік выцягнуў Толіка з вады. З таго часу хлопчыкі сталі неразлучнымі сябрамі.

Адкажыце на пытанні.

***прарэ́злівы***

Чаму Толік праваліўся пад лёд? У чым была яго памылка?

Як ён стаў зваць на дапамогу? Ці правільна ён зрабіў?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Хто дапамог Толіку?
Як вы ацэньваеце ўчынак Косціка?

Вызначце пры дапамозе пытанняў і назавіце ў кожным з гэтых сказаў галоўныя члены.
Растлумачце значэнне выразу «неразлучныя сябры». Як можна па-іншаму назваць такіх сяброў?

**205.** Складзіце са слоў сказы так, каб атрымаўся тэкст. Дайце тэксту назву. Кожны сказ пачынайце пісаць з выдзеленых слоў.

адной, на, **Міхась**, жывуць, і, Петрык, вуліцы.
хлопчыкі, за адной, сядзяць, **у школе**, партай.
і адпачываюць, урокі, **яны**, вучаць, разам.
справах, дапамагае, **ва ўсіх**, сяброўства, хлопчыкам.

?! Успомніце, як правільна запісаць тэкст у сшытак. З якой літары трэба пісаць першае слова ў сказе?
Адкажыце на пытанні.

Ці ёсць у вас найлепшы сябар?
Якія рысы яго характару вам больш за ўсё падабаюцца?
Як ваша сяброўства дапамагае вам у вашых справах?

* Запішыце адказы на пытанні, каб у вас атрымаўся невялікі тэкст пра вашага сябра.

**206.** Прачытайце сказы. Падумайце, у якой паслядоўнасці яны павінны стаяць, каб утварыўся звязны тэкст. Зачытайце тэкст, што ў вас атрымаўся.

**Подзвіг Пятра Купрыянава**

Гэта было ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
Ён загінуў, але выратаваў жыццё сваім сябрам.
Ішоў бой за вышыню, дзе засеў вораг.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Тады беларускі юнак закрыў сабою варожы кулямёт.
Але кулямёт, укрыты ўмацаваннем, працягваў страляць.
Пётр Купрыянаў кінуў тры гранаты.
Фашысцкі кулямёт адкрыў агонь па нашых воінах.

*(Паводле Валянціна Дончыка)*

?! Разгледзьце малюнак і адкажыце на пытанні.

***умацава́нне***

Ці ведаеце вы, у якім беларускім горадзе жыў Пётр Купрыянаў?

У гонар каго ўзведзены помнік?

Што можна сказаць пра сям'ю Купрыянавых?

Ці ёсць у вашай мясцовасці помнікі героям, што вызвалялі нашу краіну ад ворагаў?

* Раскажыце паводле ўзору, як вы ўшаноўваеце памяць аб гэтых людзях.

Узор. *Непадалёку ад нашай школы ёсць помнік. Ён узведзены ў памяць аб ... . Вучні нашага класа разам з настаўнікамі часта наведваюцца туды, каб ... .*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**207.** Выразна прачытайце верш.



Аснежаныя хвоі
У маладым бары…
Бялюткія сувоі
Раскручваюць вятры.

Да горкі самай бліжняй,
Нібыта чарадзей,
Ружавашчокі **лыжнік**
Лыжню сваю вядзе.

За ім вятры няспынна
Спяваюць наўздагон.
Сякуць у твар галіны,
І **снег** цярушыць з крон.

*(Казімір Камейша)*

***наўздаго́н***

**Суво́й** — цэлы кусок палатна, скручаны ў трубку.

?! Вусна падбярыце да выдзеленых слоў роднасныя з тэксту верша. Запішыце словы парамі, абазначце ў іх агульную частку — корань.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Запішыце другі слупок верша ў сшытак. Вызначце і падкрэсліце галоўныя і даданыя члены сказа.
Разгледзьце малюнак. Вусна складзіце 2—3 сказы на тэму малюнка.

**208.** Прачытайце. Падзяліце прачытанае на сказы так, каб атрымаўся тэкст.

## У новым годзе

Радасна сустракаюць **Новы** год дарослыя і дзеці у **новым** годзе будзе шмат добрага будаўнікі ўзвядуць прыгожыя дамы і школы вырастуць сучасныя заводы і фабрыкі на палеткі выйдуць магутныя машыны хлебаробы вырасцяць багаты ўраджай.

?! Успомніце правілы афармлення запісу сказаў.
Падумайце і адкажыце: чаму ў адным выпадку выдзеленае слова пішацца з вялікай літары, а ў другім — з малой?

**209.** Прачытайце. Змяніце словы ў дужках так, каб атрымаўся тэкст.

Дзеці развесілі на (дрэвы) кармушкі. Яны насыпалі зярнят, насенне (трава). Прыляцела за (пачастунак) сініца. Прымасціліся ў (кармушка) і вераб'і. А (снегіры) няма. Яны любяць ягады (рабіна, каліна).

?! Раскажыце, якія птушкі прылятаюць у вашу мясцовасць. Як вы клапоціцеся пра іх?

**210.** Прачытайце верш. Запішыце яго ў сшытак.

## Сініцы

Замерзлі рэчкі і крыніцы.
Пад палазамі снег рыпіць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Зляцеліся да нас сініцы,
Каб да вясны ў садзе жыць.
*(Паўлюк Пранузa)*

?! У другім сказе вызначце і падкрэсліце галоўныя і даданыя члены. Вывучыце верш. Запішыце яго па памяці.

## Праверце сябе

Адкажыце на пытанні.

Што мы называем сказам? Якія правілы афармлення запісу сказа вы ведаеце?

Якія знакі прыпынку могуць стаяць у канцы сказа?

Якія віды сказаў вы ведаеце?

Назавіце галоўныя члены сказа.

Якую ролю ў сказе выконваюць даданыя члены?

Выберыце правільны варыянт адказу.

**1.** а) Словы ў сказе не звязаны паміж сабой.

б) Словы ў сказе звязаны паміж сабой.

**2.** а) Сказы па мэце выказвання бываюць апавядальныя і пытальныя.

б) Сказы па мэце выказвання бываюць апавядальныя і пабуджальныя.

в) Сказы па мэце выказвання бываюць апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя.

**3.** а) У сказе першае слова пішацца з вялікай літары.

б) У сказе ўсе словы пішуцца з вялікай літары.

в) У сказе ўсе словы пішуцца з малой літары.

**4.** а) Дзейнік і выказнік — гэта даданыя члены сказа.

б) Дзейнік і выказнік — гэта галоўныя члены сказа.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**5.** а) Дзейнік адказвае на пытанні *што робіць? што зробіць? што рабіў? што зрабіў? што рабілі?*

б) Дзейнік адказвае на пытанні *хто?* або *што?*

**6.** а) Выказнік адказвае на пытанні *што робіць? што зробіць? што рабіў? што зрабіў? што рабілі?*

б) Выказнік адказвае на пытанні *хто?* або *што?*

**7.** а) Сказ утвараюць дададзеныя члены сказа.

б) Сказ утвараюць галоўныя члены сказа.

## СЛОВА

### *Урок 1. Слова і яго лексічнае значэнне. Слоўнікі беларускай мовы*

**211.** Прачытайце і адгадайце загадку.



Адна я ў лесе з белаю карой.
Багата сокам веснавой парой.
*(Кастусь Жук)*

?! Якія словы ў тэксце падказалі вам адгадку? Якое значэнне мае слова *бяроза*? Прачытайце, як гэта слова тлумачыцца ў слоўніку. Якім слоўнікам вы будзеце карыстацца?

**212.** Прачытайце. Закончыце сказы патрэбнымі словамі.

Сказ утвараецца са ... . Кожнае слова нешта абазначае, мае сваё ... .

Кніга, якая складаецца са слоў, размешчаных у пэўным парадку, называецца ... .

Аб тым, якое значэнне мае слова, можна прачытаць у ... слоўніку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**213.** Прачытайце. Паспрабуйце здагадацца, пра што ці пра каго ідзе гаворка ў апісанні.

Жылая сялянская пабудова, зрубленая з бярвення, — ... .
Счэпленыя паміж сабой вагоны, якія цягне па рэйках паравоз, — ... .
Дзіцячая цацка ў выглядзе фігуркі чалавека — ... .
Свойская жывёла, якая ловіць мышэй, — ... .
Сталовы прыбор для зачэрпвання рэдкай або рассыпістай ежы — ... .

Словы для выбару: кот, цягнік, хата, лыжка, лялька.

?! Падумайце і адкажыце, дзе вы маглі бачыць апісаныя прадметы. Якія з іх вы бачыце кожны дзень, а якія — даволі рэдка?

**214.** Прачытайце словы. Паспрабуйце самастойна растлумачыць іх значэнне.

1. Сшытак, падручнік, стул, кветка, яблыня, агарод.
2. Небяспека, егер, навальніца, столь.

?! Ці лёгка вам было растлумачыць значэнні слоў, якія ўтвараюць першы радок? Чаму?
Ці змаглі вы самастойна растлумачыць словы з другога радка? Чаму?

*Запомніце!*
У беларускай мове ёсць словы, якія мы ўжываем даволі часта, яны абазначаюць добра вядомыя з'явы, прадметы, дзеянні і падобнае, таму мы можам лёгка растлумачыць іх значэнні. Пра значэнні слоў, якія выкарыстоўваюцца ў маўленні рэдка ці абазначаюць малавядомыя нам з'явы, прадметы, дзеянні і падобнае, можна даведацца з **«Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы»**.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**215.** Прачытайце, як тлумачацца значэнні слоў з практыкавання 214 у «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы».

**Небяспе́ка** — стан, становішча, якое пагражае каму-небудзь, можа прычыніць няшчасце, зло, шкоду.
**Е́гер** — чалавек, які вядзе нагляд за дзікімі жывёламі, ахоўвае іх ад знішчэння.
**Навальні́ца** — атмасферная з’ява: непагадзь з маланкай, громам, дажджом або градам і моцным ветрам.
**Столь** — верхняе ўнутранае пакрыццё памяшкання, процілеглае падлозе.

**216.** Папрацуйце з «Тлумачальным слоўнікам». Знайдзіце ў слоўніку значэнні дадзеных слоў.

Кніга, аловак, ручка, партфель.

?! Складзіце сказ такім чынам, каб у ім былі выкарыстаны ўсе гэтыя словы.

*Запомніце!*
Усе словы ў слоўніках размешчаны ў **алфавітным парадку**. Гэта робіцца для таго, каб лягчэй было адшукаць патрэбнае слова.

**217.** Прачытайце. Спішыце сказы ў тым парадку, які адпавядае прыведзеным значэнням слова *дарога*.

З лесу дарога раптам выбегла ў поле. *(Алесь Якімовіч)*
Навучанне — гэта дарога да ведаў.
Дождж сышоў на захад, і мы сабраліся ў дарогу.
1. Падарожжа, паход.
2. Паласа зямлі для хадзьбы.
3. Сродак для дасягнення якой-небудзь мэты.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**218.** Прачытайце  словы. На якіх яны мовах?

Последний — апошні, почва — глеба, спрятаться — схавацца, цепь — ланцуг, мел — крэйда, утро — раніца.

?! З якой мовы на якую зроблены пераклад?
Запішыце толькі беларускія словы.

**219.** Прачытайце словы. На якой мове яны дадзены?

Подсолнух, радуга, зонт, растение.

⇄ Перакладзіце гэтыя словы на беларускую мову.

?! Ці лёгка вам будзе гэта зрабіць? Чым трэба карыстацца пры перакладзе слоў з рускай мовы на беларускую?

*Запомніце!*
Ёсць слоўнікі **перакладныя**. У іх словы перакладаюцца з адной мовы на другую.
У **«Руска-беларускім слоўніку»** словы перакладаюцца з рускай мовы на беларускую: *цветок — кветка*.
У **«Беларуска-рускім слоўніку»** словы перакладаюцца з беларускай мовы на рускую: *падручнік — учебник*.

**220.** Прачытайце словы. На якой яны мове?

Шпакоўня, завіруха, відэлец, радзіма.

⇄ Перакладзіце словы на рускую мову.

?! Ці лёгка вам будзе гэта зрабіць? Ці будзеце вы карыстацца слоўнікам? Калі так, то якім?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**221.** Прачытайце два тэксты.

### Вожык

Вожык сцяжынкай патупаў да возера. Звярок скаціўся да вады клубком. Ён убачыў сябе ў люстраной вадзе і вельмі здзівіўся.

На якой мове гэты тэкст?

Вусна перакладзіце яго на рускую мову.

### В школьной библиотеке

Ученики любят посещать школьную библиотеку. Здесь много интересных книг и журналов. Можно найти сказки, рассказы, стихи.

Перакладзіце гэты тэкст на беларускую мову.

Які з тэкстаў вам было лягчэй перакласці? Чаму?

**222.** Прачытайце словы. Запішыце іх у сшытак. Замест кропак устаўце прапушчаныя літары.

К..пуста, тракт..р, в..вёрка, т..лерка, к..нькі, к..мбайн.

Ці можна праверыць, як правільна пісаць словы? Што трэба для гэтага зрабіць?
Запомніце, як пішуцца гэтыя словы.

*Запомніце!*
Ёсць слоўнікі, па якіх можна праверыць, як правільна пісаць словы. Такія слоўнікі называюцца **арфаграфічнымі**.

**223.** Выпішыце з вучэбнага дапаможніка пяць слоў разам з тлумачэннем іх значэнняў. Запомніце, што азначаюць гэтыя словы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 2. Словы, блізкія па значэнні*

**224.** Прачытайце пары слоў. Знайдзіце сярод іх тыя, што абазначаюць адно і тое ж паняцце.

1. Чысты, светлы.
2. Сумны, маркотны.
3. Вясёлы, радасны.
4. Моцны, дужы.
5. Цёплы, сонечны.
6. Смелы, адважны.

?! Ці падобныя па значэнні словы кожнай пары? Запішыце толькі пары блізкіх па значэнні слоў.

**225.** Прачытайце сказы.

1. Усе мае думкі з табою, Айчына. *(Еўдакія Лось)*

2. І васількі, як Бацькаўшчыны вочы, цвілі прыветнай, сціплаю красой. *(Віктар Ярац)*

?! Якія яшчэ блізкія па значэнні словы можна падабраць да слоў *Бацькаўшчына, Айчына*? Запішыце іх у радок праз коску.

**226.** Прачытайце верш. Колькі ў ім сказаў?

Лётаюць, сыплюцца
Зоркі-сняжынкі,
Белыя, лёгкія,
Быццам пушынкі.
Роўна так сцелюцца
У вёсцы, у полі,
Круцяцца, кружацца
Ціха, паволі.

*(Янка Журба)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Выпішыце з верша сказ, у якім ёсць блізкія па значэнні словы. Назавіце гэтыя словы.

**227.** Прачытайце словы.
Падбярыце да кожнага з гэтых слоў блізкае па значэнні.

Ісці, хопіць, вугал, дарога.

Словы для выбару: *досыць, крочыць, шлях, куток.*

?! Запішыце словы парамі паводле ўзору.

Узор. *Ісці — крочыць, ... .*

**228.** Прачытайце. У кожным сказе падбярыце да выдзеленага слова яшчэ адно, блізкае па значэнні.

Маляўнічыя, **прыгожыя** краявіды зачароўвалі Ягорку. Светлая хмарка **ціха** і спакойна плыла ў небе. Васіль не толькі **заўзяты** рыбак, а нават заядлы.

?! Запішыце сказы разам з блізкімі па значэнні словамі.

**229.** Прачытайце сказ.

На вуліцы **злосна вые мяцеліца**.

?! Да выдзеленых слоў падбярыце блізкія па значэнні.
Запішыце розныя варыянты гэтага сказа.

**230.** Прачытайце словы.
Падбярыце да кожнага слова блізкае па значэнні.

Адзенне, гарачы, шмат, таварыш, дом, мяцеліца, лес, работа.

Словы для выбару: *сябар, хата, спякотны, вопратка, завіруха, праца, бор, многа.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Запішыце словы парамі.

## *Урок 3. Словы, процілеглыя па значэнні*

**231.** Прачытайце пары слоў.

1. Дзень — ноч.
2. Весела — сумна.
3. Справа — злева.
4. Зіма — лета.
5. Белы — чорны.

?! Блізкія ці процілеглыя словы па значэнні ў кожнай пары?

**232.** Прачытайце.

| | |
|---|---|
| высокі | моцны, нізкі, вялікі |
| дзень | месяц, ноч, вечар |
| лета | восень, зіма, вясна |
| праўда | мана, вера, надзея |
| вясёлы | радасны, сумны, уважлівы |

?! Да кожнага слова з левага слупка падбярыце адно процілеглае па значэнні з правага слупка. Запішыце словы парамі паводле ўзору.

Узор. *Высокі — нізкі.*

**233.** Да выдзеленых слоў падбярыце словы з процілеглым значэннем і дапоўніце імі сказы.
Ці атрымаліся ў вас прыказкі?

**Новых** сяброў набывай, але і ... не забывай.
**Ранняя** птушачка зерне клюе, а ... вочкі працірае.
Рыхтуй сані **летам**, а калёсы ... .



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Блізка** відаць, ды ... ісці.
**Старое** дрэва трашчыць, а ... гнецца.

?! Запішыце прыказкі ў сшытак. Замест кропак устаўце тыя словы, што вы падабралі.

**234.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце дзеянне, процілеглае таму, што вы бачыце на малюнку.









?! Прыдумайце да кожнага малюнка сказы і запішыце іх паводле ўзору.

*Узор. Каця плача, а Ліза ... .*
*Вася бяжыць, а Дзяніс ... .*
*Рая ўваходзіць у аўтобус, а Дзіма ... .*
*Алесь устае, а дзядуля ... .*

**235.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх з дапамогай малюнкаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Знаходзіцца дома ў сонечны дзень,
А вось у дажджлівы гуляць ён ідзе.
*(Міхась Пазнякоў)*





Лечыць летам і зімой
Дрэвы дзюбаю сваёй.

Растуць сястрычкі дробныя,
Да сонейка падобныя.



?! Запішыце толькі тыя загадкі, у якіх ёсць словы з процілеглым значэннем. Знайдзіце гэтыя словы ў тэксце і падкрэсліце хвалістай лініяй.

**236.** Прачытайце незакончаныя сказы. Дапоўніце іх словамі з процілеглым выдзеленым словам значэннем.

Зімой дні **кароткія**, а летам ... .
Лімон **кіслы**, а банан ... .
Дзясятка — **добрая** адзнака, а адзінка — ... .

?! Запішыце сказы, якія атрымаліся.

**237.** Прачытайце тэкст.

***супраціўля́цца***

Мне здаецца, што ўсе дрэвы жывыя. Яны адчуваюць цяпло і холад, умеюць радавацца і сумаваць. Вы ўслухайцеся ў іхні шум. Які ён розны летам і зімой, раніцай і вечарам! Адно не ўмеюць яны супраціўляцца чужой сіле. Не ўмеюць заступіцца за сябе. Гэта іхнія бяда і шчасце, бяссілле і сіла. *(Паводле Анатоля Кудраўца)*

?! Знайдзіце словы, процілеглыя па значэнні, і выпішыце іх парамі.
* Падумайце і растлумачце, якую думку аўтар хацеў выказаць з дапамогай гэтага тэксту.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**238.** Прачытайце. Дапоўніце прыказкі патрэбнымі словамі.

Жыві сваім розумам, а не ... .
Добраму ўсюды добра, а кепскаму — ... .
Лепш горкая праўда, чым ... мана.

Словы для выбару: *кепска, салодкая, чужым.*

?! Запішыце прыказкі ў сшытак.

## Праверце сябе

Адкажыце на пытанні.

Якія слоўнікі беларускай мовы вы можаце назваць? Для чаго патрэбен кожны з іх?

Прывядзіце прыклады слоў з падобным значэннем.

Прыдумайце 2—3 пары слоў з процілеглым значэннем.

Выберыце правільны варыянт адказу.

**1.** а) Словы ў слоўніках размешчаны ў адвольным парадку.
б) Словы ў слоўніках размешчаны ў алфавітным парадку.

**2.** а) Па тлумачальным слоўніку правяраецца напісанне слоў.
б) Па тлумачальным слоўніку правяраецца значэнне слоў.

**3.** а) Па арфаграфічным слоўніку правяраецца напісанне слоў.
б) Па арфаграфічным слоўніку правяраецца значэнне слоў.

**4.** а) Вясёлы, сумны — словы, блізкія па значэнні.
б) Вясёлы, сумны — словы, процілеглыя па значэнні.

**5.** а) Ісці, крочыць, рухацца — словы, блізкія па значэнні.
б) Ісці, крочыць, рухацца — словы, процілеглыя па значэнні.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ

## У КРАІНУ ВЕДАЎ

### Неператётны вырай




Сышліся хмары — восені паслы,
А за акном не ціхне дождж-назола...
На поўдзень скіраваліся буслы,
А нас з табой ужо чакае школа.

Лістоту золкі вецер падхапіў
І закружыў яе ў апошнім танцы:
Пад невясёлы восеньскі матыў
Чапляецца за каўняры і ранцы.

Ах, восень! Ты стараешся дарма,
Прыкрыўшыся залочанай парфірай,
Бо што нам дождж ды блізкая зіма —
У нас тут свой неператётны вырай!



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Аж да званка не змоўкне гамана
У кожным класе вераснёўскім ранкам...
Як быццам і не восень, а вясна,
І школа — велізарная буслянка.

*(Артур Вольскі)*

**Пасо́л** — той, хто пасланы куды-небудзь з пэўным даручэннем.

**Назо́ла** — той (тая), хто вельмі назаляе, дакучае.

**Зо́лкі** — сыры, пранізлівы, халодны (пра надвор'е, дождж, вецер).

**Парфі́ра** — доўгая шырокая пурпуровая адзежына ў выглядзе плашча або накідкі.

**Гамана́** — бязладны шум мноства галасоў; гучная размова.

?! Пра якую пару года апавядаецца ў вершы?

Прыметы якога месяца восені адлюстроўвае ў вершы аўтар? Дакажыце словамі з верша.

Пра які «неператлётны вырай» піша паэт?

* Чаму аўтар верша параўноўвае школу з велізарнай буслянкай? Паразважайце.

**Кнігі чытаеш — свет адкрываеш.**

### Першы ўрок

Ты вырасцеш, сынку,
і пройдзе твой шлях
Па родных мясцінах,
па дальніх краях.
А што ты адкажаш, як хто запытае:
«Якога ты роду,
з якога ты краю?»



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Хай будзе кароткім і простым адказ:
Я роўны,
браты і сябры,
сярод вас.
І шчыра скажу, бо сакрэту не маю:
«Я — годнага роду,
я — з вольнага краю!»
*(Паводле Ганны Івановай)*

?! Якія пытанні паўстануць перад хлопчыкам, калі ён вырасце?
Прачытайце адказ хлопчыка. Што ён перш за ўсё цэніць у жыцці, чым ганарыцца?
Падрыхтуйцеся да выразнага чытання верша.
* А як бы вы адказалі на тыя ж пытанні? Што для вас з'яўляецца самым каштоўным у жыцці?

**Вучыцца ніколі не позна.**

### Купалаў дом

Ёсць у Мінску вельмі-вельмі прыгожы куточак — парк імя Янкі Купалы. Невялікі, утульны, ён знаходзіцца ў цэнтры горада на беразе спакойнай Свіслачы. Гэта ўлюбёнае месца адпачынку мінчан. На цэнтральнай алеі парку на гранітным пастаменце ўзвышаецца велічны помнік паэту. Ля яго падножжа крынічка і папараць-кветка — сімвалы неўміручасці і чысціні. Здаецца, Купала толькі што выйшаў з дому, яшчэ адысціся не паспеў і стаіць — спакойны і задуменны. На плечы накінута лёгкае паліто, у правай руцэ сукаваты кіёк — верны спадарожнік далёкіх і блізкіх вандровак.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Амаль побач з помнікам, сярод старых разгалістых дрэў, размясціўся двухпавярховы будынак. Гэта Літаратурны музей Янкі Купалы, ці, як яго яшчэ называюць, Купалаў дом. Праўда, не той, у якім жыў паэт, а новы, пабудаваны спецыяльна пад музей.

У Літаратурным музеі Янкі Купалы сабрана і клапатліва захоўваецца шмат матэрыялаў: фотаздымкі, партрэты, рукапісы, кнігі паэта, ілюстрацыі да яго твораў. Яны знаёмяць наведвальнікаў музея з жыццём і багатай творчай спадчынай нашага славутага класіка.

*(Паводле Тамары Тарасавай)*

**Пастаме́нт** — аснова, фундамент помніка.

?! У якім горадзе Беларусі знаходзіцца парк імя Янкі Купалы? Якая рака працякае побач з паркам?

Дзе размешчаны Літаратурны музей Янкі Купалы? Як па-іншаму называюць гэты музей? Прачытайце ў тэксце.

Ці чыталі вы творы Янкі Купалы? Знайдзіце ў бібліятэцы верш «Лістапад» і падрыхтуйцеся выразна яго чытаць.

* Што вы можаце расказаць пра нашага славутага класіка? Што вам вядома пра яго жыццё?

## Дзецям

Я вельмі шкадую аб тым, што не мела
У дзяцінстве «Мурзілкі», «Вясёлкі», «Барвінка».
Цяпер я зайздрошчу вясёлым і смелым —
Усім дарагім хлапчукам і дзяўчынкам.

У добрым здароўі гадуйцеся, дзеці,
У сэрца ўбірайце ўсе фарбы вясёлкі!
Хачу, каб вы ўсё разумелі на свеце,
А ў працы былі, як руплівыя пчолкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Хай дзеці майго беларускага краю
Сябруюць з усімі народамі шчыра!
Для вас я жыву, спадзяюся, шукаю,
Хачу, каб раслі вы для шчасця і міру!

*(Эдзі Агняцвет)*

**Спадзява́цца** — *рус.* надеяться.

Аб чым шкадуе аўтар верша?
Што Эдзі Агняцвет жадае беларускім школьнікам? Знайдзіце гэта пажаданне ў вершы і зачытайце яго.
Чаму так гавораць: «Працаваць, як пчала»?
Якія сучасныя беларускія часопісы для дзяцей вы ведаеце? Ці любіце вы іх чытаць?
















**Кніжка чалавеку — што ліпа пчолцы.**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Змалку веды здабывай!**

Мой таварыш! Час імчыцца!
Ад яго не адставай:
Змалку ты любі вучыцца,
Змалку веды здабывай!

Кім захочаш быць — тым будзеш,
І, не знаючы тугі,
Будзеш ты карысны людзям
І Радзіме дарагі.

*(Васіль Жуковіч)*




**Туга́** — смутак, маркота, журба.

Да каго звяртаецца ў сваім вершы аўтар?
Да чаго заклікае паэт? Зачытайце.
Вызначце асноўную думку гэтага верша.
Вывучыце верш на памяць.

**У каго веды — у таго і сіла.**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Пытанні і заданні па тэме

**1.** З якіх вершаў узяты гэтыя радкі? Хто іх аўтар?

а) На поўдзень скіраваліся буслы,
А нас з табой ужо чакае школа.

б) У добрым здароўі гадуйцеся, дзеці,
У сэрца ўбірайце ўсе фарбы вясёлкі!

в) А што ты адкажаш, як хто запытае:
«Якога ты роду, з якога ты краю?»

**2.** У якім творы гэтага раздзела даецца наказ аўтара ўсім дзецям Беларусі?

**3.** Дапоўніце, калі ласка, прыказкі.

Кнігі чытаеш — ... .
Кніга чалавеку — што ... .
У каго веды — у таго і ... .

**4.** Разгледзьце малюнак і адгадайце загадкі.

Крылаў не мае,
Ды хутка лятае.
Выпусціш —
Рад ці не рад,
А не зловіш назад.



Хто са мною пасябруе,
Той ужо не засумуе.
Языка хоць і не маю,
А пра ўсё апавядаю.

*(Міхась Пазнякоў)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# МАЯ РОДНАЯ БЕЛАРУСЬ



***

Зямля мая азёрная —
Рабіна за акном,
Крынічка ціхамоўная,
Гасцінны ветлы дом.
Іду жытнёвай сцежкаю —
Мне звоняць жаўрукі,
Блакітнаю ўсмешкаю
Вітаюць васількі.
Ты працаю славутая,
Карміцелька-зямля.
Цярплівая, пакутная,
Ты назаўжды мая.

*(Ніна Галіноўская)*

?! Як апісвае родную зямлю паэт? Якія малюнкі ўзнікаюць перад вамі, калі чытаеце гэты верш?
Растлумачце выраз «карміцелька-зямля».



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Чаму Беларусь цярплівая і пакутная? Што вы ведаеце пра апошнюю вайну? Як пацярпела Беларусь падчас яе?

Вывучыце верш на памяць.

Разгледзьце малюнак. Пакладзіце на яго тонкі ліст паперы і абвядзіце абрысы Беларусі.

Ці ведаеце вы, з якімі краінамі мае агульную мяжу Беларусь? Хто нашы суседзі? Адкажыце з дапамогай малюнка на с. 138.

Выразна прачытайце на форзацы 2 вершы Васіля Віткі «Беларусь» і Анатоля Касцецкага «Бацькаўшчына». Вывучыце на памяць адзін з вершаў.

## Нашы продкі

Паехалі вучоныя на раскопкі. Асцярожненька здымаюць слой за слоем, нават прасейваюць зямлю, каб нічога не прапусціць. І вось першая знаходка — наканечнік дзіды. З гэтай дзідай у даўнія часы паляўнічы высочваў дзікага звера, каб было чым пракарміць сям'ю.

А вунь яшчэ адна патрэбная людзям прылада — сярпок. Стары ён, іржой паедзены, бо даўным-даўно жыта не жаў, без працы занудзіўся. А калісьці ён на славу паслужыў нашым продкам, якія аралі і сеялі на невялікіх лапіках зямлі, адваяваных ад лесу.

А там што блiснула — кругленькае, каляровае? Пацерка, прыгожая жаночая пацерка! Разам з іншымі красавалася яна некалі на шыі дзяўчыны. Тая дзяўчына на Купальскае свята песні спявала, шукала чароўную папараць-кветку...

Шмат пра што могуць расказаць старажытныя рэчы. Па іх археолагі «чытаюць», як па мудрых кнігах...

*(Сяргей Тарасаў)*

**Дзі́да** — старажытная колючая зброя ў выглядзе доўгага дрэўка з вострым металічным наканечнікам; піка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Занудзíцца** — засумаваць, замаркоціцца.

**Археóлаг** — вучоны, які займаецца раскопкамі і даследаваннем старадаўніх рэчаў, што засталіся ад нашых продкаў.

**Пáцерка** — *рус.* бусина.

?! Для чаго вучоныя паехалі на раскопкі? Што шукаюць яны пад слаямі зямлі?

Якую рэч знайшлі першай? Як яе выкарыстоўвалі нашы продкі? Зачытайце.

Чым быў карысны калісьці сярпок? Як выглядае ён цяпер? Чаму?

Прачытайце пытанне, якое знаходзіцца ў трэцяй частцы тэксту, і адкажыце на яго словамі з тэксту.

* Як вы лічыце, пра што могуць «расказаць» нам старажытныя рэчы?

**Дарагая Беларусь**

Слаўлю я свой край любімы —
Незгасальную зару.
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь!
Залацістыя прасторы,
Незлічона ясных зор,
Рэкі ціхія, азёры,
Галасісты шумны бор!
Ты нас ласкай атуліла,
І я ў шчасці гавару:
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь!
Не магло мне і прысніцца,
Як ты, родная, узрасла.
Паглядзі, твая сталіца,
Быццам казка, расцвіла.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Наша радасць, наша сіла,
Дзе для ўдзякі слоў збяру?
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь!

*(Пятрусь Броўка)*

?! З чым аўтар параўноўвае нашу Беларусь?
Зачытайце радкі, дзе паэт захапляецца хараством прыроды беларускага краю.
Знайдзіце і прачытайце радкі, прысвечаныя сталіцы Беларусі.
Як выглядае наша сталіца з вышыні птушынага палёту? Адкажыце з дапамогай малюнка.
Якія словы з'яўляюцца асноўнай думкай верша? Што хацеў данесці Пятрусь Броўка да нас у сваім творы?

**Мая Беларусь**

Настаўіўшы белыя ветразі крылаў, плануюць буслы. Іх вельмі шмат. Гнёзды паўсюль.

І таму, мне здаецца, зямлю нашу, Беларусь, можна назваць зямлёю пад белымі крыламі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Чаму «Беларусь»? Ёсць некалькі варыянтаў паходжання гэтай назвы. Першы: белае адзенне даўніх вясковых людзей, іхнія белыя валасы, белы колер скуры. Другі аніяк не супярэчыць першаму. Калі на нашы старажытныя славянскія землі прыйшлі татара-манголы — здолелі адбіцца ад іх толькі мы. Мы — адбіліся. І менавіта таму мы «белая», «чыстая ад нашэсця» Русь.

Якая яна, наша зямля? Гэта залатыя палі збажыны з сінімі вочкамі васількоў. Гэта светлыя ад бяроз гаі, што аглухлі ад птушынага звону. Гэта пушчы, падобныя на храмы, пушчы, дзе горда нясуць свае кароны алені. Гэта бясконцыя рэкі, у якіх плешчуцца бабры і рыба на заходзе сонца. Гэта амаль адзінаццаць тысяч азёр, чыстых, як усмешка дзіцяці.

Гэта гераічная зямля. Безліч разоў з пачатку дзён грукаталі па ёй калясніцы вайны. Беларусь заўсёды мужна і да канца бараніла сваю праўду і свабоду.

Ёсць і горкая памяць у маёй зямлі. Дык і як іначай: кожны чацвёрты жыхар Беларусі загінуў у апошнюю вайну. Наша краіна першай прыняла ўдар ворага і гераічна змагалася з ім... У лясах амаль чатырыста тысяч партызан цаною жыцця баранілі ад ворагаў Радзіму дзеля таго, каб зберагчы волю, веру, Бацькаўшчыну.

Прасякніцеся любоўю да роднай Беларусі, дзеці. Велічная і гордая, яна таго вартая. *(Паводле Уладзіміра Караткевіча)*

**Супярэ́чыць** — спрачацца, не згаджацца з кім-небудзь.

**Збажына́** — агульная назва хлебных злакаў: жыта, пшаніцы, аўса, ячменю.

**Ве́тразь** — *рус.* парус.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Якой уяўляе аўтар нашу Радзіму? Як ён яе называе? Зачытайце.
Як пісьменнік тлумачыць паходжанне назвы нашай краіны? Знайдзіце ў тэксце.
Як адносіцца аўтар да сваёй Радзімы?
* Якая горкая памяць ёсць у нашай зямлі?
Да чаго заклікае нас аўтар?

**Навуку вывучай, а дзедава слова не забывай!**

### Беларусь

То ялінкі, то сасонкі
Падпіраюць небакрай...
Прыгажэйшае старонкі
Не знайсці, як ні шукай.

<...>

Пахне збожжа свежым хлебам,
Сыпле золата жніво,
Жаўрукі звіняць пад небам —
Славяць свету хараство.

На бярозе — белы бусел,
Пад бярозаю — ручай.
А завецца Беларуссю
Непаўторны родны край.

*(Паводле Артура Вольскага)*

?! Ці можна сказаць, што гэты верш і верш «Дарагая Беларусь» звязаны адной тэмай, адзінай мэтаю?
Якія пачуцці выказвае аўтар у гэтым вершы? Ці можна сказаць, што ён любіць сваю радзіму, што яна для яго — найлепшая ў свеце?
Чаму Беларусь — непаўторны край? Паразважайце.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Радзіма любімая — маці родная.

### Беларусь — мая Радзіма

Якая прыгожая назва ў нашай краіны — Беларусь!

А яшчэ мы завём яе Радзіма. А яшчэ — Бацькаўшчына.

Радзіма, бо тут нарадзіліся, бо яна нам самая родная з усіх краін на цэлым свеце.

Бацькаўшчына — бо яна дасталася нам ад бацькоў. А ім ад іхніх бацькоў — нашых дзядоў. А далей — ад прадзедаў, ад прапрадзедаў...

Над шырокімі палямі, над векавечнымі пушчамі, над зялёнымі лугамі, над блакітнымі стужкамі рэк і ручулак, над люстрамі незлічоных азёр лунаюць у высокім небе белакрылыя буслы. Таму паэт назваў нашу краіну зямлёй пад белымі крыламі.

А колькі багаццяў схавана ў зямлі гэтай! Калійныя солі, якімі ўзбагачаюць глебу, каб яна не бяднела і давала добрыя ўраджаі. Іх здабываюць беларускія шахцёры пад Салігорскам. Вучоныя-геолагі знайшлі ў нетрах зямлі золата і кажуць, што ёсць нават алмазы. Трэба толькі як след пашукаць...

Жыта ў полі, яблыні ў садах, свойская жывёла на падворках, звяры ў лясах, рыба ў водах... Ды хіба пералічыш усё?

Але самы вялікі скарб Беларусі — гэта людзі, беларусы.

Побач з беларусамі жывуць у нашых гарадах і вёсках палякі, літоўцы, рускія, украінцы, татары — выхадцы з іншых краін. Усе разам яны складаюць беларускі народ. Усе мы — грамадзяне незалежнай Рэспублікі Беларусь. Так завецца наша дзяржава. Усе мы павінны памнажаць сваёй



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

працай яе багацці, бараніць ад нягод і напасцяў, як баранілі яе нашы продкі. *(Паводле Артура Вольскага)*

**Луна́ць** — плаўна лятаць, рухацца ў паветры.
**Не́тры** — глыбіні зямлі, месцы пад зямной паверхняй, а таксама тое, што там змяшчаецца.

?! Чаму мы называем Беларусь сваёй Радзімаю?
Хто з беларускіх пісьменнікаў назваў нашу Беларусь «зямлёй пад белымі крыламі»?
Як яшчэ называюць нашу Радзіму? Чаму? Знайдзіце і прачытайце ў тэксце.
Прадстаўнікі якіх народаў жывуць у Беларусі, акрамя беларусаў?
Што павінен рабіць кожны з нас, каб наша Радзіма была багатай і моцнай?

**Няма лепшай вадзіцы, як з роднай крыніцы.**

### Белавежа

Самая славутая ў Беларусі пушча — вы ведаеце, якая? Белавежская. Яна на захадзе нашай рэспублікі, на мяжы з Польшчай. А самая галоўная краса пушчы, вы ведаеце таксама, — белавежскі зубр. Гэта — цар звяроў, якія насяляюць пушчу. Ён — самы вялікі і дужы. Можа паваліць рагамі дрэва, разбурыць сцяну з бярвенняў, можа нават на лясной дарозе спыніць матацыкл ці машыну. Але ён рэдка гэта робіць. Зубр — рахманы і спакойны звер, калі яго не чапаюць.

А вось — алень. У яго на галаве — рогі, як разгалістыя галіны з вострымі сукамі. Хто скажа, што гэта не магутная зброя, якою можна абараніцца і адагнаць ад сваёй сямейкі любога ворага?

А гэтыя прыгожыя асілкі, каб умелі гаварыць, што б яны сказалі нам?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Мы таксама гаспадары пушчы. У рагах і ў нагах у нас нязменная сіла, а завёмся мы — ласі.

— А мы — дзікі, — сказалі б нам, каб умелі гаварыць, вось гэтыя смешныя паласатыя парасяткі. Так, яны з пароды свіней, толькі дзікія, таму і завуць іх — дзікі. Зірніце, вось іх бацька — страшны і грозны, з доўгім лычом. У яго абапал пашчы два вострыя, як нажы, іклы. Ён вартуе сваю сямейку — чацвёра маленькіх паласацікаў. Калі яны падрастуць, палосы знікнуць. Дзеці стануць, як іх бацькі — укрыюцца бурым шчаціннем і адгадуюць сабе таксама вострыя іклы.

Пушчу ахоўваюць людзі. Тут звяры ведаюць, што чалавек — іх сябар і заступнік.

*(Паводле Уладзіміра Караткевіча)*

**Іко́л** — *рус.* клык.

Што вы ведаеце пра Белавежскую пушчу: дзе яна знаходзіцца, чым адметная?
Пра якіх звяроў Белавежскай пушчы расказвае пісьменнік?
Знайдзіце ў тэксце апісанні зубра, аленя, лася, дзіка. Прачытайце.
Якія яшчэ звяры жывуць у пушчы? Што вы пра іх ведаеце?
Як называецца прафесія чалавека, які наглядае за звярамі ў пушчы?
Каго з названых жывёл вы бачылі? Якія пачуцці яны выклікаюць?

Ці былі вы ў Белавежскай пушчы або ў іншым запаведніку? Падзяліцеся сваімі ўражаннямі.



**Зубр**

Зубр вялікі і сур'ёзны —
Гэта бачыць можа кожны.
Ён жыве ў Беларусі,
І зусім не па прымусу:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Тут здаўна яго радзіма.
Цар звяроў — ён наша дзіва —
Ходзіць важкаю хадою,
І, здаецца, ён такою
Вечнаю заняты думай,
Каб спакойна жыць, без тлуму
У гушчары лясоў дрымучых,
Дыхаць водарам гаючым,
Сніць пад спеў сівых вятроў
Шмат лясных прыгожых сноў.
*(Паводле Лідзіі Андрэевай)*

**Во́дар** — *рус*. аромат.
**Гаю́чы** — *рус*. целебный.

Разгледзьце малюнак. Які зубр выглядае на малюнку?
Як яшчэ называюць зубра? Чаму? Прачытайце ў вершы.
Дзе жывуць зубры на тэрыторыі Беларусі? Чаму яны занесены ў Чырвоную кнігу?

Ці бачылі вы зубра ў прыродзе ці ў заапарку? Апішыце яго.
Якія яшчэ жывёлы занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі?

***

Я па краі вандрую,
Не хаваю любоў,
Падзівіўся на Друю,
Навагрудак і Шклоў.



Бачыў ціхі Валожын,
Любаваўся Кармой...
Непаўторна прыгожы
Край чаромхавы мой.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вашу мілую ласку
І хлеб-соль, гарады,
Як матуліну казку,
Буду помніць заўжды.

*(Павел Сушко)*

**Вандрава́ць** — *рус.* путешествовать, странствовать.

Пра які край гаворыцца ў вершы?
Якія гарады бачыў паэт? Яны буйны́я ці невялікія?
Чым яны яму спадабаліся? Якія гарады Беларусі вы ведаеце?
Разгледзьце малюнак на с. 149. Апішыце, як выглядае горад Глыбокае.
Дзе вы жывяце — у горадзе ці ў вёсцы?
* Як вы разумееце наступныя словы аўтара?

Вашу мілую ласку
І хлеб-соль, гарады,
Як матуліну казку,
Буду помніць заўжды.

Вывучыце верш на памяць.

## Пытанні і заданні па тэме

1. Чаму нашу краіну называюць Беларусь?
2. Чым багатая наша краіна?
3. Як трэба адносіцца да Радзімы, да сваёй мовы, народа? У якіх творах вы пра гэта чыталі?
4. Успомніце і прачытайце вершы, з якіх узяты наступныя радкі.

а) А завецца Беларуссю
Непаўторны родны край.
б) Цар звяроў — ён наша дзіва —
ходзіць важкаю хадою.

5. Якія народныя выказванні пра Радзіму вы ведаеце?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ГОД ЗА ГОДАМ КАРАГОДАМ

## *Багатая восень дарамі*

### Восень

Яшчэ тыдзень назад на лузе калыхаліся высокія зялёныя травы. Над кветкамі з вясёлымі песнямі лёталі работніцы-пчолкі. Цяпер там пуста. Адны толькі стагі параскіданы па грудочках.

Вырасла маладая атава. Буслы пазляталі з гнёздаў і ходзяць па лузе.

Апусцелі палі. Не вядзе гутаркі ціхі вецер з каласамі збожжа. Не трапечуцца ў небе над полем жаваранкі з песнямі. Прайшла вясёлая пара — лета. Восень усюды накладае свой след, сваю руку. Лес стаіць маўклівы. Птушкі перасталі спяваць. Пажоўклае лісце патроху асыпаецца на дол. Сонца не свеціць так ярка, як, бывала, улетку. Кожны дзень яно ніжэй і ніжэй ходзіць па небе. Туманы засцілаюць ад вачэй свет. Сеецца дробны дожджык.

*(Паводле Якуба Коласа)*

**Грудо́чак** (ад слова «груд») — невялікая горка, узгорак.
**Ата́ва** — маладая трава, якая вырасла на месцы скошанай у той жа год.

Пра якія прыметы восені апавядае Якуб Колас? У якім месяцы адбываюцца такія з’явы прыроды?
Параўнайце апісаныя аўтарам прыметы восені з тымі, што вы назіраеце зараз.

### Ападаюць з бяроз лісты

Ападаюць з бяроз лісты,
Ім яшчэ паспрачацца з ветрам.
Што з таго, што мінула лета



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

І ў праменях гараць кусты?..
Ападаюць з бяроз лісты.



Ападаюць з бяроз лісты,
Ім наўздзіў ападання лёгкасць.
А лісты не прывыклі вохкаць
Ад спякоты і ад слаты —
Ападаюць з бяроз лісты.

Ападаюць з бяроз лісты,
Мы любуемся іх падзеннем…
Дзесь і ў вёсцы маёй Бадзені,
Нібы кропелькі яснаты,
Ападаюць з бяроз лісты.

*(Мікола Шабовіч)*

**Наўздзі́ў** — на дзіва; надзвычайна.

?! Якую пару года апісвае паэт? Які месяц?
Як называецца з'ява прыроды, калі з дрэў ападае лісце?
Як аўтар ласкава называе бярозавыя лісты? Знайдзіце ў вершы.

Ці назіралі вы, як ападаюць з бяроз лісты? Чаму мы любуемся іх падзеннем? Раскажыце пра свае назіранні і ўражанні.

### Восень шыла сарафан

Задумала Восень сабе абнову пашыць. І перш за ўсё выбрала залацістыя колеры: яны ёй больш да твару. Ціха хадзіла палямі, пералескамі і падбірала сабе на сарафан то трохі чырвані, то залацінак, што свяціліся ў лістоце дрэў. І асіны, і грушы ажно чырванелі ў прамянях ціхага сонца. А клёны і бярозы залаціліся сваімі кронамі на ўзлессі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

«Добра было б пацеркі падабраць», — падумала Восень і ўбачыла рабіну. Гронкі яе наліліся чырванню, цяжка звісалі долу. Чым не пацеркі?

А потым Восень яшчэ збірала дробненькія кветачкі верасу, сціплых бяссмертнікаў.

А ў кужэльную касу сваю ўпляла трапяткія белыя павуцінкі...

— Цяпер, здаецца, усё, — сказала Восень і паглядзела ў круглае люстэрка — шырокае азярцо.

*(Паводле Міхася Даніленкі)*

**Кужэ́льны** — ільняны.

**Па́церкі** — *рус.* бусы.

?! Што задумала зрабіць Восень?
Якія колеры падабрала яна для сябе?
Знайдзіце выразы, пры дапамозе якіх аўтар малюе партрэт Восені.

**Песня верасня**

Звонкі лісток адарваўся ад клёна
І пакаціўся, пабег па зямлі.
А на палянцы жоўта-зялёнай
Быццам адкручваюць струны чмялі.

Верас ліловы, як на цымбалах,
Тонка іграе ўвесь дзень дацямна.
Палкія гукі рабіна сабрала —
Вось ад чаго чырванее яна!

Любіць Міхась вераснёвыя дзівы.
Ходзяць па лесе вятры-трубачы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Толькі грыбы засядаюць маўкліва —
Песням патрэбны свае слухачы.

*( Эдзі Агняцвет )*

**Ліло́вы** — светла-фіялетавы; колеру бэзу ці фіялкі.

?! Разгледзьце малюнак. Якія прыметы восені вы на ім убачылі?
Пра якія прыметы восені вы даведаліся з верша?
Што вас найбольш зацікавіла ў вершы?
* Як вы зразумелі наступны выраз: «быццам адкручваюць струны чмялі»?
Ці чулі вы, як «іграе на цымбалах» верас? Ці бачылі, як коціцца па зямлі апалае лісце?

## Лясныя дарункі

Лес сустракае дрымотнай цішынёй. Маўчаць дрэвы, маўчаць птушкі. Толькі дзесьці далёка стукае дзяцел.

Узыходжу на травяністую дарогу, што ідзе праз хвойны ўзлесак-маладняк. Узыходжу, і дух займае: уся да-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

рога ўкрыта грыбамі. Масляки! Сядзяць яны групкамі, шапачкі цёмна-карычневыя, спаднізу зацягнутыя бялюткай плёнкай. Ножкі тоўстыя, амаль як у баравікоў. Згінаюся і рэжу, рэжу...

Пагоркі сярод хвойніку і бярозавага лесу зіхацяць ад белізны бяроз, жоўтага лісця. Ступаю некалькі крокаў і адскокваю назад, нібы апёкся. Лісічкі! Ну і хітрухі, гэта ж трэба так схавацца! То пад ігліцаю, то пад мохам, то пад лісточкамі...

На збуцвелай драўніне расселіся апенькі. Сядзяць так шчыльна, што не зрэзаць. Групкамі і ўроссып разбягаюцца яны па пнях, лезуць угару, паглядваюць адтуль уніз.

Шмат у лесе дзічак — груш, яблынь. Ідзеш-ідзеш, і раптам — дзіва! Ляжаць пад дрэвам яблыкі. Невялікія, з каштан, а то і яшчэ меншыя. Падымеш адзін, другі, укусіш: такія кіслыя, ажно язык шчыпле, а то горкія, то салодкія з гаркатою. А ёсць і такія, што можна есці ды хваліць: сакаўныя, смачныя.

Дзікія яблыні як яблыні, а вось грушы — густыя, тапырацьгаліны, як вожык іголкі. Раскусіш каторую на пробу, а язык адразу як хто звяжа, паднябенне сцягвае, нібы смалою.

Вяртаюся дахаты. Кірунак знаходжу па мурашніках. Іх мурашкі заўсёды насыпаюць з паўднёвага боку дрэў. І па моху, які расце на камлях з паўночнага боку.

*(Павел Місько)*

**Збуцве́лы** — сапрэлы, струхлелы, спарахнелы.
**Каме́ль** — ніжняя патоўшчаная частка дрэва.

?! Якімі дарункамі багаты восеньскі лес?
Знайдзіце ў тэксце і прачытайце, як выглядаюць масляки.
Дзе хаваюцца ад грыбнікоў лісічкі? Зачытайце.
Як і дзе растуць апенькі? Чым яны адрозніваюцца ад іншых грыбоў?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Якія дзікія пладовыя дрэвы растуць у лесе? Прачытайце, як аўтар апісвае лясныя яблыкі і грушы.
Па якіх прыметах можна вызначыць правільны кірунак у лесе?

Задайце адзін аднаму пытанні пра збор грыбоў. Адкажыце на іх.

## Грыбы-лесавікі

Грыбы — цікаўныя лясныя жыхары.

Неяк выйшлі мы з Вадзікам на сонечную верасовую паляну. Прыселі на імшаную купіну, каб перадыхнуць, агледзеліся і заўсміхаліся.

Проста перад намі пазіраў у неба, узабраўшыся на высокі пень, грыб-трутавік. Ва ўсёй паставе — напружанасць і цікаўнасць: што там робіцца на небе?

А там кучараваяцца белыя воблакі, а між імі разліваюцца азёрцы блакіту. Над воблакамі кружыцца каршун, імкне кудысьці серабрысты рэактыўны самалёт.

А вунь да стажка мурашніка падышоў баравік: важны, бурагаловы, з тоўстай ножкай. Стаў і, узяўшы рукі ў бокі, дзівіцца на мурашак, з іх мітуслівай работы.

Далей — болей.

Вунь ля самага камля бярозкі прыціснуўся шэрабокі абабак. Відаць, ён намагаецца залезці на дрэва, з вышыні яго агледзець увесь лес. А можа, проста хоча пагушкацца на галінах і пагрэцца на сонцы.

За гэтым абабкам замірае, сагнуўшыся і злёгку прыкрыўшыся мохам, махавік. Ён слухае зямлю: ці хутка вылезуць на свет ягоныя браты і сёстры?

Збоку махавіка — зеленаватая сцежка. Па ёй чародамі бягуць да лясной ручаіны шустрыя лісічкі і сыраежкі. Ім дужа цікава паглядзець на сябе. І прыхарашыцца, і папіць халоднай вадзіцы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Грыбы — жыхары яшчэ і асцярожныя. Калі я адвёў вочы, крыху пагаманіў з Вадзікам, яны раптам недзе пахаваліся. Не стала ні гарэзлівых лісічак і сыраежак, ні трутавіка і абабка.

Нерухома стаялі на сваіх месцах толькі махавік і баравік. Мы ўзялі іх сабе ў спадарожнікі і падаліся на іншыя палянкі. Чым здзівяць тыя палянкі нас з Вадзікам?

*(Міхась Вышынскі)*

**Паста́ва** — становішча фігуры, уласцівае каму-небудзь.
**Гарэ́злівыя** — вясёлыя, жвавыя, непаседлівыя.

Якімі чалавечымі рысамі надзяліў аўтар грыбы? Зачытайце.
Чым здзівіла грыбнікоў верасовая паляна?
* Успомніце і раскажыце, якімі чалавечымі рысамі надзяляюцца лясныя жыхары ў казках.

Што новага вы даведаліся пра грыбы? Раскажыце адзін аднаму.

### Зімовы дуб

Ідзе лесам Лістапад, лісце сыплецца, як град, сякуць дажджы касыя, шумяць вятрыскі злыя... Дрэвы нізка кланяюцца Лістападу, сцелюць да ног яго пажоўклае лісце. Адляцелі ў вырай птушкі, звяры пахаваліся ў зацішак, апусцелі палі.

Задаволены Лістапад: усе скарыліся яму. Усміхнуўся, паслаў на зямлю бледны сонечны прамень, глянуў з-за шэрых хмар лапінкай блакіту.

Але што гэта? Вунь на ўзлессі раскінуў веццэ магутны Дуб, увесь у мядзяным лістоце.

— Чаму ты не скарыўся мне? — грозна спытаў Лістапад.

— Я зімовы. Таму да вясны буду ў мядзяным убранні.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Угневаўся Лістапад:

— Гэй, вятры бу́йныя! — паклікаў ён сваіх памочнікаў. — Сарвіце з Дуба яго мядзяны ўбор!

Завылі вятры, зашумелі галіны Дуба.

— Гэй, дажджы халодныя! — гукнуў Лістапад. — Пазбівайце з Дуба лісце!

Секанулі дажджы, забарабанілі па буйны́м лісці, але Дуб не зварухнуўся.

— Гэй, браце Снежань! — загукаў Лістапад. — Прышлі мне марозу пякучага, завей сыпучых... Няхай замарозяць, засыплюць снегам непакорнага!

Прымчалі маразы, пруляцелі завеі, марозілі, снегам секлі, але не скарыўся Дуб.

Спахмурнеў Лістапад і адступіўся ад цара лесу...

Усю зіму стаіць Дуб у сваім мядзяным адзенні. Толькі вясною ненадоўга скідае яго, каб пераапрануцца ў новае, зялёнае ўбранне. За гэта і называюць яго Зімовым Дубам. *(Клаўдзія Каліна)*

**Скары́цца** — пакарыцца, падпарадкавацца чыёй-небудзь сіле, уладзе.

?! Якую пару года мае на ўвазе аўтар? Як вы пра гэта даведаліся?
Прачытайце, як ідзе па зямлі Лістапад.
Чаму ён моцна раззлаваўся?
Што вырашыў зрабіць Лістапад з Дубам? Каго паклікаў Лістапад на дапамогу?
Ці скарыўся Дуб Лістападу?
Чаму Дуб называюць Зімовым?
Які з герояў вам больш спадабаўся: Дуб ці Лістапад? Чаму?

## Першы іней

Былі пагодныя дні. З сонцам ад ранку да вечара, з сінім небам. Днём яшчэ было цёпла, а пад вечар, калі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

чырвонае сонца сцякала за лес, апусцелая, няласкавая зямля стыла на холадзе. Пад поўнач бяліў яе іней. У ледзяныя звонкія раніцы і трава каля платоў, і палі, і стрэхі — усё было па-зімоваму белае. Калі ўздымалася сонца, светлае, прамяністае, ад інею заставаліся толькі цемнаватыя плямы вільгаці. Неўзабаве знікалі і яны. Іней трымаўся яшчэ ў цяні дрэў і хат, трымаўся ўпарта, пакуль сонечная цеплыня не дабіралася і сюды.

Неба гэтымі днямі сінела чыстае і глыбокае. Яно не было цяпер такое, як раней: часта атульвала яго белаватая, нібы малочная, смуга. Тады яно здавалася бляклым, быццам выгаралым за ліпеньскую і жнівеньскую спёку.

Сонца таксама было іншае. Аддаўшы амаль увесь свой пал лету, яно грэла мала, але на дзіва лагодна і пяшчотна. У гэтым лагодным сонечным святле гарэлі полымем ліпы і бярозы каля хат, дрэвы ў недалёкім лесе. Як сівізна, гарэла ўсюды павуціна. Яна вісела ў паветры, абчэплівала павялы і пасохлы бульбоўнік, калы і жэрдкі вакол агародаў, пажоўклыя кусты.

Усё агортваў спакойны, стары, як свет, смутак развітання з цяплом і набліжэння халадоў. *(Паводле Івана Мележа)*

**Ату́льваць** — агортваць, ахінаць з усіх бакоў.

**Сму́так** — *рус.* печаль.

Якая пара года апісана аўтарам? Звярніце ўвагу на змены, што адбываюцца ў прыродзе.

Знайдзіце ў тэксце апісанне гэтай пары года па наступных тэмах: «Пагодныя, яшчэ цёплыя дні і халодныя ночы», «Колер неба і пяшчотнасць сонца», «Фарбы дрэў і белая павуціна».



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Пытанні і заданні па тэме

**1.** Якой паўстала перад вамі восень у апісанні беларускіх паэтаў і пісьменнікаў? Ці любяць яны гэтую пару? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

**2.** Чым багатая восень? У якіх творах раздзела вы пра гэта чыталі?

**3.** А вы любіце восень? У чым вы бачыце яе прыгажосць?

**4.** Успомніце і прачытайце вершы, з якіх узяты наступныя радкі:

а) Звонкі лісток адарваўся ад клёна
І пакаціўся, пабег па зямлі.

б) Ападаюць з бяроз лісты,
Мы любуемся іх падзеннем...

**5.** Якія з твораў раздзела спадабаўся вам больш за іншыя? Чаму?

**6.** Якія яшчэ вершы пра восень вы ведаеце?

**7.** Вывучыце на памяць і раскажыце любы верш пра восень.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## СЛАЎСЯ ДОБРЫМІ СПРАВАМІ

### Ветлівасць

Восеньскім поўднем выбраўся я ў грыбы. Прывабіў мяне светлы бярозавы гаёк кіламетраў за пяць ад вёскі.

Пакуль дайшоў да грыбнога месца, ажно запарыўся. Зняў з галавы капялюш і пачаў грыбы шукаць.

Убачу паміж апалага лісця баравічок ці падасінавік, капялюш надзену на галаву, каб вызваліць руку, і зрэжу грыб. Укіну ў кошык і зноў капялюш здыму, каб валасы абсыхалі.

А ў гэты час якраз адзін хлопчык з нашай вёскі грыбы збіраў. Хадзіў па лесе, хадзіў, а грыбы нешта не траплялі-





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ся. Бачыць ён, што я кожны грыб з адкрытай галавою сустракаю, і сам шапку зняў. Толькі ён гэта зрабіў, як наперадзе ўбачыў вялізны крамяны баравік. Хлопчык хуценька надзеў шапку і ўзяў прыгажуна. Паклаў яго ў вядзерца і зараз жа зноў шапку сцягнуў з галавы. Ступіў некалькі крокаў і ўбачыў два чырвонагаловыя падасінавікі. І вось, як на дзіва, грыбы хлопчыку пачалі трапляцца адзін за адным. Толькі паспявай ім паклоны адбіваць. Сустрэў ён мяне ў лесе і пытае:

— Чаму гэта грыбы толькі тады трапляюцца, калі шапку здымаеш?

Я падумаў крыху і кажу:

— Хто ж гэта, скажы, ветлівасці не любіць? Ветліваму кожны рад. А лес, як бачыш, нават свае дарункі ветліваму дае. *(Рыгор Ігнаценка)*

**Крамя́ны** — пругкі, цвёрды, сакавіты.

?! Ад чыйго імя напісана апавяданне?

Чаму ветлівых паважаюць не толькі людзі, але і лес? Як пра гэта сказана ў тэксце?

Разгледзьце малюнкі і падбярыце да іх словы з тэксту.

* Зачытайце радкі, якія вы лічыце галоўнымі ў творы.

## Крывая таполя

Андрэйка не ведаў, чым заняцца. Нарэшце прыдумаў: узлез на маладую бярозку за сялом, пачаў ламаць вецце і кідаць на зямлю.

Непадалёку праходзіў дзед Міхась. Убачыў, што робіць хлопчык, і закрычаў:

— Навошта дрэва глуміш?

— Венікаў вам навяжу, — ані не збаяўшыся, адказаў Андрэйка. — У лазню будзеце хадзіць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Ану, злазь з дрэва! — загадаў дзед Міхась. — Пайшлі са мной!..

Неўзабаве яны ішлі вуліцай, абапал якой стаялі таполі. Добра тут летам у гарачы поўдзень. Усюды сонца, а на вуліцы — халадок, бо рэдка дзе прабіваюцца праз лісце сонечныя промні. Толькі ў адным месцы расла крывая тапаля. Каля яе і спыніўся дзед Міхась.

— Бачыш? — спытаў ён у Андрэйкі.

— Ага, тапаля...

— А якая яна?

— Крываватая, — адказаў Андрэйка, не разумеючы, чаго дабіваецца дзед Міхась.

— Так, калека, крывая і недарослая. Яна ж равесніца ўсім гэтым таполям.

— Адкуль вы ведаеце? — здзівіўся Андрэйка.

— Я сам іх некалі пасадзіў. Усе да адной. І гэту таполю таксама. Было ў яе дзве галіны. Дык я адну зрэзаў...

— Навошта?

— На рагатку. Дагэтуль не магу сабе дараваць. Бачыш, тапаля вырасла не такая, як усе. І меншая, і крывая... Як дакор мне на ўсё жыццё... Хіба з бярозкай такое не можа здарыцца?

— Ды я... не думаў, каб скалечыць...

Андрэйка апусціў галаву і моўчкі пайшоў па вуліцы.

*(Іван Сіняўскі)*

**Глумі́ць** — псаваць, здзекавацца.

?! Чаму дзед Міхась павёў Андрэйку да крывой таполі?
Што ён расказаў хлопчыку?
Як вы думаеце, ці зразумеў хлопчык навуку дзеда?
Падрыхтуйце сціслы пераказ твора.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Як вы разумееце сэнс наступнага народнага выказвання?

Дрэнныя тыя рукі, што не ведаюць ніякай навукі.

## Пра Янку і гулянку

Рана-рана — на світанку —
Маці доўга будзіць Янку:
— Уставай хутчэй, сынок,
Не спазніся на ўрок.
На стале стаіць сняданак,
Пазірае ў вокны ранак.
Маці будзіць, маці кліча,
Сын спрасонку штось мармыча,
Смачна, доўга пазяхае,
Твар пад коўдраю хавае.
Прытварыўся — захварэў,
Прытаіўся — анямеў.
Ён жа ўчора па абедзе
Прападаў з сябрамі недзе,
Да змяркання прагалёкаў
І не браўся за ўрокі.

*(Мікола Хведаровіч)*



**Галёкаць** — гучна крычаць, звычайна пераклікаючыся ў лесе.

?! Чаму Янка не хацеў ісці ў школу? Як пра гэта сказана ў вершы?
Ці старанны Янка вучань? Чаму?
Як вы разумееце наступныя прыказкі?

Навука не мучыць, а толькі вучыць.
Навуку за плячыма не носяць.
Хто без навукі, той як бязрукі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Сяброўства

Сяброўства не церпіць несумленных, баязлівых людзей. Не церпіць сяброўства зазнаек, якія паважаюць толькі сябе. Не церпіць таму, што сяброўства — вялікі абавязак, які ўскладзены на чалавека.

Я ведаю, што табе не падабаецца, калі сябар, які даў слова, не стрымаў яго; паабяцаў нешта зрабіць — і не зрабіў нічога. Таму імкніся сам быць сумленным, умей трымаць сваё слова.

Не падабаецца табе і тое, што ў выпадку небяспекі сябар, на дапамогу якога ты разлічваў, збег, кінуў цябе аднаго. Таму будзь сам смелы, каб апраўдаць званне сябра.

Толькі той мае права на сяброўства, хто імкнецца заўсёды рабіць добрае для таварыша. *(Янка Маўр)*

**Несумле́нны** — той, хто страціў сумленнасць, хто робіць непрыстойныя ўчынкі.

?! Якім павінен быць сапраўдны сябар? Паразважайце.
Ці ёсць у вас сапраўдны сябар? Ці даўно вы сябруеце?
Якія рысы характару вашага сябра вам найбольш падабаюцца? Якія, наадварот, вас непакояць?
Што б вы хацелі пажадаць свайму сябру?
Як вы разумееце выраз «апраўдаць званне сябра»?
Прачытайце прыказкі пра сяброўства. Растлумачце іх сэнс.

Новых сяброў набывай, а старых не забывай.
Чалавек без сяброў — што дрэва без каранёў.
Сяброўства за грошы не купіш.

## Задачкі

Сумна сядзець Алесю пад акном і чакаць, пакуль Змітрок вывучыць урокі і выйдзе на вуліцу. Сумна, а дзе дзе-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

нешся? Адзін жа не пагуляеш! Вось і сядзіць Алесь, чакае, гармату дубцом на пяску малюе. Салдата намаляваць не паспеў. На вуліцы паказалася дзяўчынка ў блакітнай сукенцы, з белым бантам на галаве. Дзіна. Глядзіць на Алеся, усміхаецца.

— Ты чаго развесялілася?

— Мне ж не трэба, як табе, чужую хату падпіраць.

Алесь злосна хвошча дубцом па плоце. Раз! Другі!

— Ох, як баліць! — насмешліва кажа Дзіна. Потым робіцца сур'ёзнай. — Я ўжо ўрокі вывучыла, у краму па малако іду. А ты, мусіць, яшчэ і партфеля не расшпіліў?

— Пачакае твой партфель...

— Не мой, а твой. Партфель сцерпіць, а Наталля Восіпаўна — наўрад. Як міленькаму заўтра дрэнную адзнаку ўлепіць! Вось пабачыш...

Над галавою чуецца стук у шыбу. Змітрок!

— Гатоў? — паварочваецца Алесь. — Парабіў урокі?

— Ідзі да мяне ў хату, — паклікаў Змітрок.

Бразгае клямка. Алесь выцірае чаравікі аб старую цырату, засланую каля парога.

— Я чуў вашу размову. Слухай, ты хоць на чарнавік рашы задачкі, — сказаў Змітрок, калі сябар зайшоў у пакой.

— Абыдуся і так. Не прафесарам — вайскоўцам буду.

— Я таксама на прафесара не вучуся. Толькі без матэматыкі ў арміі не абыдзешся.

— У арміі галоўнае — смелым быць. Як лётчыкі.

— Цяперашнія самалёты ведаеш якія? Яны цябе за дваццаць кіламетраў не падпусцяць. Р-раз ракетай — і ў крапіву зваліўся! Цяпер лётчыку патрэбен разлік, матэматыка.

— А ты адкуль гэта ведаеш?

— Дзядзька, як прыязджаў, расказваў.

Змітракоў дзядзька — ваенны лётчык, капітан. Летам ён гасцяваў у вёсцы і падарыў пляменніку пагоны



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

з серабрыстымі птушачкамі. На зайздрасць усім вясковым хлапчукам. Змітрок прышпільвае пагоны, калі ідзе гуляць на вуліцу.

Алесь больш не спрачаецца. Раз дзядзька сказаў, значыць, праўда.

— Цяпер у арміі ўсё на разліках, — паважна заначае Змітрок. Таксама, відаць, словамі дзядзькі. — Нават вылічальныя машыны ёсць, каб хутчэй падлічваць.

— Нам бы ў клас такую, — уздыхае Алесь. — На кантрольную.

— Нам яна не патрэбна. А ім без машыны не абысціся. Каб лепш вучэбным боем кіраваць. Толькі да тае машыны без матэматыкі і не падыходзь.

Алесь уздыхнуў:

— А задачкі на заўтра цяжкія?

— Не браўся яшчэ, не ведаю...

— Давай разам рашаць, га?

— Бяжы дадому па сшытак.

Халоднае восеньскае сонца схавалася за лес, калі хлопчыкі выйшлі гуляць на вуліцу. *(Даір Слаўковіч)*

**Кля́мка** — выгнутая паўкругам металічная дужка, якая служыць ручкай у дзвярах.

**Цыра́та** — тканіна, пакрытая з аднаго боку ці з абодвух асаблівым саставам, які робіць яе непрамакальнай.

?! З-за чаго Алесю было сумна?

Чаму Алесь не хацеў рашаць задачкі? Прачытайце, як ён сам пра гэта гаворыць.

Якую размову пачуў Змітрок? Прачытайце па ролях дыялог Алеся і Дзіны.

У чым Змітрок пераконваў Алеся? Прачытайце іх размову па ролях.

* Паразважайце: чаму трэба старанна вучыцца?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## За разумнай галавою і рукам лёгка.

### Сяргей

Клічуць хлопчыкі:
— Сяргей!
Ты гуляць выходзь
Хутчэй!
Кніжку
Потым дачытаеш
І задачку дарашаеш.
— Не, сябры,
І вам не раю.
Перш я кніжку дачытаю,
А затым
Рашу задачу.
А пасля галоўных спраў
Час настане для забаў.

*(Міхась Пазнякоў)*

?! Разгледзьце малюнкі. Ці правільная іх паслядоўнасць? Як яны павінны быць размешчаны, каб адпавядаць зместу верша?







Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

 

Ці добрую справу робяць хлопчыкі, калі клічуць сябра на вуліцу? Чаму?
Што адказвае ім Сяргей? Зачытайце тэкст.
А як бы вы зрабілі ў падобнай сітуацыі?
* Як вы адносіцеся да сваіх вучнёўскіх абавязкаў?

**Прыгожая птушка пер'ем, а чалавек — вучэннем.**

## Татава аўтаручка

Сеў тата пісаць, а ручка не піша... Ён і так спрабаваў, і гэтак — не піша, і ўсё!

Гукнуў тады Максімку:

— Сынок, ты маёй ручкі не чапаў?

— Не, тата, не чапаў...

— Такая харошая ручка была! Прыйдуць мама і бабуля, трэба будзе ў іх спытаць, мо яны бралі ды незнарок сапсавалі... А ты ідзі, гуляй.

Хлопчык паволі пайшоў у свой пакой і гэтак жа паволі зачыніў за сабой дзверы. Тата схіліўся над сталом, ды неўзабаве Максімка зноў прыйшоў і дакрануўся да татавага пляча:

— А калі мама тваёй ручкі не брала?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Тата ўважліва паглядзеў на сына і, нібы аб нечым здагадаўшыся, сказаў:

— Мабыць, бабуля скінула яе са стала.

— А калі і бабуля не вінавата? — не адступаў Максімка.

— То тады і не ведаю, на каго думаць, — развёў тата рукамі. — Ты ідзі гуляй, сынок, а мне працаваць трэба.

Але хлопчык не адыходзіў. Ён пастаяў, памаўчаў, затым зноў спытаў:

— І ты будзеш на іх сварыцца?

— На каго?

— На маму і бабулю.

Тата ледзь прыкметна ўсміхнуўся:

— Пэўна, буду. Такую добрую ручку сапсавалі.

— Шкада маму і бабулю...

Максімка ўздыхнуў і моўчкі пайшоў у другі пакой.

Цікаў на стале гадзіннік, адлічваючы секунды і мінуты: цік-так, цік-так... Пад гэта ціканне тату добра працавалася. Ён так захапіўся работай, што не заўважыў, як зноў падышоў сын.

— Не сварыся, тата, — паціху прамовіў ён. — Не сварыся на маму і бабулю... Насварыся лепш на мяне...

*(Паводле Міколы Гіля)*

**Незнаро́к** — выпадкова, ненаўмысна.
**Неўзаба́ве** — хутка, у хуткім часе.

?! Што здарылася з татавай аўтаручкай?
Як вы лічыце, чаму Максімка не адразу вырашыў ва ўсім прызнацца бацьку? Ці правільна зрабіў хлопчык? Чаму?

Чаму Максімка зноў прыйшоў да таты? Зачытайце размову бацькі і сына па ролях.

* Ці былі ў вашым жыцці падобныя выпадкі? Раскажыце.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Сустрэча

Усе дзецi са школы пайшлi дарогай, а Саўка — нацянькi. Што яму! Праз новыя боцiкi вады не набярэш, а балота ён па жардзiнках пройдзе, не звалiцца.

«Прыйду дамоў, — радаваўся хлопчык, — i адразу скажу тату, каб узяў мяне з сабой на паляванне». Дзясятка па матэматыцы! Ды якая! Па кантрольнай.

Жардзiнкi аказалiся слiзкiмi ад лёду, i Саўка быў ужо не рад, што пайшоў гэтай дарогай. Асцярожна ступаючы i балансуючы рукамi, ён павольна прасоўваўся ўперад.

Раптам ля самага канца балацiны насустрач Саўку выскачыў суседскi сабака Тузiк.

— Чаго цябе панесла сюды? Дарогi не ведаеш, цi што? — узлаваўся хлопчык. — Ага! Нiяк назад не павернешся. Вось цяпер i лезь у гразь. Бачыў, што я iду, — пачакаць трэба было.

Тузiк вiнавата паглядзеў хлопчыку ў вочы.

— Ну, давай назад! — загадаў Саўка.

Сабака матнуў галавой i ўздрыгнуў усiм целам.

— Ведаю, як табе не хочацца лезцi ў гразь, але нiчога не зробiш, — ужо больш лагодна сказаў хлопчык. — Мне нiяк нельга вяртацца. Тады я тату дома не застану, ды i з кладкi зляцець можна... Я ледзьве сюды дабраўся.

Тузiк, нахiлiўшы галаву, уважлiва слухаў, быццам разумеў кожнае слова.

— Ну, чаго вушы развесiў? — павысiў голас Саўка. — Давай! А то вазьму зараз i скiну!

Хлопчык выставiў наперад рукi. Тузiк прысеў на заднiя лапы i жаласна заскуголiў.

Саўка задумаўся на хвiлiну, уздыхнуў i рашуча ступiў у гразь... Тузiк завiляў хвастом i пабег далей па жардзiнках.



Правообладатель Выдавецкi цэнтр БДУ

— Глядзі ж не зваліся! — крыкнуў яму наўздагон Саўка.

Ледзяная брудная вада адразу прасачылася ў новыя боцікі, і, каб хутчэй выбрацца на сухое месца, хлопчык пашлёпаў па гразі, ужо не выбіраючы дарогі.

Дома Саўка сказаў бацьку:

— Шкада мне яго стала. Сам падумай: я магу пераабуцца, на печы сагрэцца, а Тузік усю ноч будзе трэсціся ў халоднай будцы. Яшчэ захварэе. *(Паводле Івана Вярылы)*

**Нацянькі́** — наўпрост, прама, самай кароткай дарогай.
**Балансава́ць** — захоўваць пры няўстойлівым становішчы раўнавагу пры дапамозе рухаў цела.

?! Чаму Саўка не пайшоў разам з дзецьмі дарогай? Зачытайце.
Пра што хлопчык хацеў хутчэй расказаць тату? Знайдзіце ў тэксце.
Каго сустрэў на балоце Саўка? Ці рады ён быў гэтай сустрэчы? Раскажыце, што адбылося далей.
Чаму хлопчык саступіў кладку Тузіку? Прачытайце, што Саўка сам пра гэта гаворыць.
Што вас кранула ў гэтым апавяданні? А як бы вы зрабілі на месцы Саўкі?

* Як вы ставіцеся да свойскіх жывёл? Ці ўмееце клапаціцца пра іх? Раскажыце.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ГОД ЗА ГОДАМ КАРАГОДАМ

## *Прыйшла зіма-чараўніца*

### Круглы год



Мудры месяц вераснёвы
Ведаў прыбаўляе новых.
А кастрычнік хмурыць вочы:
Чэзне дзень, даўжэюць ночы.
Лістапад зямлю ўкрывае,
Калыханку ёй спявае.



Служаць белай каралеве
Тры чысцюлі-кавалеры:
Снежань снегам укрывае,
Студзень на ста дудках грае,
А вось меншы — той лютуе:
Ад вясны зіму ратуе.



Сакавік вясну вітае,
Кубкі сокам напаўняе.
Красавік пасля шчыруе,
Да сяўбы палі рыхтуе.
Дружна сад наш расцвітае —
Май вясёлы баль спраўляе.



Чэрвень лета пачынае —
Сцежкі кветкамі ўсцілае.
Жнівень лета завяршае —
Зерне ў полі паспявае.
А між імі — ліпень-месяц
Водарам мядовым цешыць.

*(Лідзія Андрэева)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Чэ́знуць** — *перан.* станавіцца менш яркім, цямнець, гаснуць.

Як вы лічыце, чаму гэты каляндар пачынаецца з верасня?
Назавіце асеннія месяцы. Чаму верасень называюць мудрым, а кастрычнік — хмурым?
Як аўтар у сваім вершы называе зіму? Якія тры чысцюлі-кавалеры ёсць у яе? Чаму яны «чысцюлі»?
Які з вясенніх месяцаў вітае вясну? Чаму?
Назавіце летні месяц, што завяршае сяўбу. А які месяц «цешыць водарам мядовым»?
Назавіце поры года ў патрэбным парадку. Прачытайце верш так, каб атрымаўся «сапраўдны» каляндар.

**Усё зіма заснежыла**

Белымі сняжынкамі
Уся дарожка ўсеяна.
Была ў полі рэчанька,
Ды не стала. Дзе яна?
Была ў полі елачка,
Пышная, зялёная,
А яе мяцеліца
Замяла шалёная.
Азярцо празрыстае
За сялом свяцілася,
Посцілка бялюткая
На яго звалілася.
Тут зіма заснежыла
Брамы і штыкеты,
Кожны куст і дрэва
У белае адзеты.
Ранкам нашу сцежку,
Што да школы сцелецца,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Мы ізноў пратопчам.
Не мяці, мяцеліца!..
*(Станіслаў Шушкевіч)*

?! Якія словы выкарыстоўвае паэт, каб апісаць надыход зімы? Што стала з рэчанькай, елачкай, азярцом, дарожкай?
Параўнайце апісанне прыроды ў пачатку зімы ў вершы з тым, што адбываецца зараз за акном. Ці адпавядаюць словы верша сённяшняму надвор'ю?
Вывучыце на памяць верш ці яго частку.

Ці радуецеся вы надыходу зімы? Чаму? Раскажыце, што вам зімой падабаецца, а што — не.

## Дзед-госць

Ходзіць дзед белабароды
Полем, лесам, пералескам,
Засцілае рэчкі лёдам,
Брыльянцістым снежным бляскам.
Сыпле іней на бярозы,
Туліць дрэвы лёгкім пухам,
Крые руні, травы, лозы
Белай воўнаю — кажухам.
Дзеда ўсюды носяць ногі,
І к нам прыйдзе на хвілінку
Адпачыць крыху з дарогі,
Важна сеўшы на ялінку.
А ялінка!.. Чаго толькі
На яе няма галінках!
Свецяць зоркі і вясёлкі
У бліскучых павуцінках.
Тут лісічка, зайчык, мышкі,
Рыбкі, буслік даўгавязы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



А як ззяюць на ёй шышкі,
Нібы ў іх гарaць алмазы!
Каля ёлкі карагоды,
Песні, гутарка жывая,
А той дзед белабароды
Толькі ў вусны смех пускае.
Дык рассунем кола шырай,
Патанцуем на памосце,
Песняй звонкай, песняй шчырай
Прывітаем дзеда-госця.

*(Якуб Колас)*

**Рунь** — усходы, пасевы азімых збожжавых культур.

Які настрой гэтага верша?
Пра якога дзеда-госця расказвае паэт?
Якое свята чакаецца з удзелам Дзеда Мароза? Ці любіце вы гэтае свята?
Раскажыце, як вы яго святкуеце. Якіх падарункаў чакаеце? А што вы падрыхтавалі для сваіх сяброў і родных?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Пытанні і заданні па тэме

**1.** Якія творы з гэтага раздзела вам найбольш спадабаліся? Да каго з герояў гэтых твораў вы б хацелі быць падобнымі, а да каго — не?

**2.** З якіх апавяданняў узяты наступныя ўрыўкі? Хто іх аўтары?

а) Хлопчык выставіў наперад рукі. Тузік прысеў на заднія лапы і жаласна заскуголіў.

Саўка задумаўся на хвіліну, уздыхнуў і рашуча ступіў у гразь... Тузік завіляў хвастом і пабег далей па жардзінках.

б) Змітракоў дзядзька — ваенны лётчык, капітан. Летам ён гасцяваў у вёсцы і падарыў пляменніку пагоны з серабрыстымі птушачкамі. На зайздрасць усім вясковым хлапчукам. Змітрок прышпільвае пагоны, калі ідзе гуляць на вуліцу.

в) Андрэйка не ведаў, чым заняцца. Нарэшце прыдумаў: узлез на маладую бярозку за сялом, пачаў ламаць вецце і кідаць на зямлю.

**3.** Як вы лічыце, якім павінен быць сапраўдны сябар? У якіх творах раздзела вы пра гэта прачыталі?

**4.** Ці ёсць у вас сапраўдныя сябры? Раскажыце пра іх.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# АРФАГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

**А**

адлі́га
арыентава́цца

**Б**

бярве́нне
бярло́г

**Г**

гняздзі́цца

**Д**

далягля́д
до́жджык

**З**

замігце́ць
збо́жжа
збудава́нне
зві́лісты
змацо́ўваць
здзіўля́ць
здзёўбваць
ззя́нне

**І**

імша́рына

**К**

камбіна́т
касмана́ўт

**М**

майстэ́рня
матэрыя́л
метро́

**Н**

навако́лле
найсмачне́йшы
наўздаго́н
напужа́ны
неўтаймо́ўны

**П**

павуці́нне
прарэ́злівы
прывіта́нне
прыла́джваць

**С**

скорагаво́рка
со́нца
супраціўля́цца

**У**

убра́нне
удалечыні́
умацава́нне
ураджа́й
уту́льна

**Ц**

цвіце́нне

**Ч**

чалаве́к

**Э**

экску́рсія
эскала́тар

**Я**

я́блык



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. *Агняцвет, Э. С.* Роднае слова: кн. для чытання ў 4-м кл. шк. з беларус. мовай навучання / Э. С. Агняцвет, Я. М. Івашуціч. — Мінск: Нар. асвета, 1995.
2. *Агняцвет, Э. С.* Хай часцей смяюцца дзеці: вершы, паэмы, пераклады / Э. С. Агняцвет. — Мінск: Юнацтва, 1997.
3. Акрайчык: чытанка для дзяцей мал. шк. узросту / уклад.: Г. Каржанеўская, М. Яфімава. — Мінск: Нар. асвета, 1995.
4. *Анцух, М. У.* Работа над памылкамі на ўроках беларускай мовы: пач. шк.: дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання / М. У. Анцух. — Мазыр: Белы Вецер, 2011.
5. Беларуская літаратура: пазакл. чытанне: 2—4-я кл./ уклад. Л. І. Строк. — Мінск: ЮниПрессМаркет, 2013.
6. Беларуская мова: падруч. для 3-га кл. шк. з беларус. мовай навучання / В. А. Бекіш, Л. М. Грыгор’ева (уклад.). — 5-е выд. — Мінск: Нар. асвета, 1996.
7. Веснавое шкельца: зб. вершаў для дзяцей/ склад. І. Карнаухава. — Мінск: Каўчэг, 2015.
8. *Вітка, В.* Роднае слова: чытанка для 2-га кл. шк. з беларус. мовай навучання / В. Вітка, М. Ф. Шаўлоўская. — Мінск: Нар. асвета, 1995.
9. *Вольскі, А. В.* Літаратурнае чытанне: падруч. для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навуч.: у 2 ч. Ч. 1 / А. В. Вольскі, І. А. Гімпель. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2012.
10. Вяснянка: вершы, апавяданні, казкі беларус. пісьменнікаў / І. А. Ліпскі (уклад.) [і інш.]. — Мінск: Юнацтва, 1983.
11. Дыктанты і кантрольнае спісванне па беларускай мове для пачатковых класаў / уклад. І. А. Гімпель. — Мінск: Беларус. Дом друку, 2004.
12. *Змушко, А. М.* Беларуская мова: вучэб. дапам. для 6-га кл. спец. агульнаадукац. дапам. шк. з рус. мовай навучання / А. М. Змушко. — Мінск: Нар. асвета, 2002. — 136 с.: іл.
13. *Клышка, А. К.* Літаратурнае чытанне: падруч. для 4-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання / А. К. Клышка. — 2-е выд., выпр. і дап. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2012.




Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

14. *Клышка, А.* Чабарок: чытанка для 4-га кл. шк. з рус. мовай навучання / А. Клышка. — 3-е выд., перапрац. — Мінск: Нар. асвета, 1993.
15. *Красней В. П.* Беларуская мова: падруч. для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання: у 2 ч. Ч. 1 / В. П. Красней. — 2-е выд. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2012.
16. *Ляшук, В. М.* Сшытак па беларускай мове: для 3-га кл. шк. з беларус. мовай навучання / В. М. Ляшук. — Мінск: Нар. асвета, 1998.
17. *Марціновіч, Л. С.* Сцяжынка / Л. С. Марціновіч, Т. У. Юрэвіч, Л. У. Іўлева. — Мінск: Нар. асвета, 1994.
18. *Пазнякоў, М.* Тры чарадзеі: вершы, скорагаворкі, загадкі / М. Пазнякоў. — Мінск: Юнацтва, 1991.
19. Пуцявінамі «Бусліка» — 2007/ склад. Т. М. Лапіцкая. — Мінск: Беларус. асац. «Конкурс», 2007.
20. Родная крыніца: кн. для вучняў / склад.: В. М. Захарэвіч, І. П. Крэнь. — Мінск: Нар. асвета, 1986.
21. *Сторажава, Н. А.* Мова твая і мая: вучу дзяцей па-беларуску / Н. А. Сторажава. — Мінск: Выд. А. Ванін, 1993.
22. *Шуба, П. П.* Беларуская мова: уступ. моўны курс: падруч. для 2-га кл. шк. з рус. мовай навучання / П. П. Шуба, Р. С. Жываткевіч, М. Г. Яленскі. — Мінск: Нар. асвета, 1995.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## ЗМЕСТ

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА** ........ 3
**Паўтарэнне** ........ 3
Мовы-сёстры ........ 3
Зычныя ***дж***, ***дз***, спалучэнне зычных ***шч*** ........ 7
Зычныя ***д***, ***т***, ***р***, ***ч***, ***ж***, ***дж***, ***ш*** і галосныя пасля іх ........ 12
Правапіс ***о***, ***э*** — ***а***, ***е***, ***ё*** — ***я*** ........ 15
Змякчальны мяккі знак ........ 19
Раздзяляльны мяккі знак і апостраф ........ 23
Корань слова. Роднасныя словы ........ 26
Падзел слоў на склады. Перанос слоў ........ 30
**Маўленне** ........ 33
Маўленне і яго роля ў нашым жыцці ........ 33
Міміка і жэсты ........ 36
Вуснае маўленне ........ 40
Правілы вуснага маўлення ........ 43
Пісьмовае маўленне і яго асаблівасці ........ 46
Правілы пісьмовага маўлення ........ 51
Дыялог і маналог ........ 53
Маўленчы этыкет ........ 58
**Тэкст** ........ 63
Тэкст як моўная адзінка. Тэма тэксту ........ 63
Віды тэкстаў ........ 66
Асноўная думка тэксту ........ 69
Афармленне запісу тэксту ........ 72
Часткі тэксту. Падзел тэксту на часткі ........ 77
Складанне плана тэксту ........ 79



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Паслядоўнасць сказаў у тэксце .......... 84
Падагульняльны ўрок па тэме «Тэкст» .......... 87
**Сказ** .......... 92
Агульнае паняцце пра сказ .......... 92
Віды сказаў па мэце выказвання .......... 95
Запіс сказа .......... 100
Галоўныя члены сказа. Дзейнік .......... 103
Галоўныя члены сказа. Выказнік .......... 106
Даданыя члены сказа .......... 110
Дапаўненне сказа даданымі членамі .......... 113
Падагульняльны ўрок па тэме «Сказ» .......... 116
**Слова** .......... 122
Слова і яго лексічнае значэнне. Слоўнікі беларускай мовы .......... 122
Словы, блізкія па значэнні .......... 127
Словы, процілеглыя па значэнні .......... 129

**ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ** .......... 133
**У краіну ведаў** .......... 133
**Мая родная Беларусь** .......... 140
**Год за годам карагодам** .......... 151
Багатая восень дарамі .......... 151
**Слаўся добрымі справамі** .......... 161
**Год за годам карагодам** .......... 173
Прыйшла зіма-чараўніца .......... 173
Арфаграфічны слоўнік .......... 178
Спіс выкарыстаных крыніц .......... 179



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча навучэнца | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Змушко, А. М.**
З-69 Беларуская мова. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 7-га кл. 1-га аддз-ня дапам. шк. з рус. мовай навучання : у 2 ч. Ч. 1/ А. М. Змушко, С. У. Тарноўская. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2016. — 182 с. : іл.
ISBN 978-985-553-369-7.

**УДК 811.161.3(075.3)**
**ББК 81.411.3я72**

Вучэбнае выданне

**Змушко** Антаніна Міхайлаўна
**Тарноўская** Святлана Уладзіміраўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**
**ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ**

**Вучэбны дапаможнік для 7 класа**
**першага аддзялення дапаможнай школы**
**з рускай мовай навучання**

**У дзвюх частках**
**Частка 1**

Рэдактар *І. В. Летуновіч*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Мастак *А. Г. Бушкін*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *М. С. Чычынай*
Карэктары *Т. М. Булатава, А. Ф. Каравай, Н. Б. Кучмель*

Падпісана ў друк 13.10.2016. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 13,45+0,29 форз. Ул.-выд. арк. 8,60+0,40 форз.
Тыраж 1578 экз. Заказ 525.

У афармленні вокладкі выкарыстана фатаграфія А. Б. Грышына.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014, № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ